# Анталогія маладога верша

Мінск
2001

# АЗОРАНЫЯ ВЯСНОЙ

На Іслачы пахла вясной. Хоць у лесе яшчэ і было досыць снегу, само паветра — духмяны сасновы водар, птушкі, што шчабяталі ранкам, хуткаплынная рэчачка паміж крутых берагоў — усё было напоўнена непаўторным пачуццём абнаўлення, маладой крамянай сілы. Гэтаму адчуванню вясны й маладосці памагалі, безумоўна, і юныя літаратары — удзельнікі чарговага семінару, які ладзіў наш Саюз пісьменнікаў.

Паэзія заўсёды маладая. Але ў юных — яна нібы тое віно, што яшчэ бродзіць, нібы завязь прыземнай лістоты, гатовай выбухнуць спелымі суніцамі, нібы вясёлы рогат, які становіцца паўнаводнай ракой...

Таму так прыемна і адказна адкрываць новыя імёны, дапамагчы маладым птушанятам «паставіць голас», паказаць ім высокі прасторны абсяг, куды яны павінны ляцець. І не толькі раз у год, на семінары. а штотыдзень — на трэцім паверсе пісьменніцкага дома, дзе іх сустракае «добры дзядзька» — Алесь Герасімавіч Масарэнка, які, здаецца, ад шматгадовай, амаль штодзённай працы з маладымі не толькі не старэе сам, але і творчая Муза яго становіцца ўсё маладзей і духам, і паэтычным пачуццём.

Менавіта па панядзелках гучаць на пасяджэннях творчай суполкі «Літаратар» вершы й проза, парады старэйшых і бурныя спрэчкі вакол кожнага твора. Менавіта тут, у сценах Творчага Храму загартоўваюцца галасы й характары, а лепшыя з лепшых ужо сталі сябрамі Саюза беларускіх пісьменнікаў. Апошнія ў гэтым годзе — Вячаслаў Корбут, Ірына Хадарэнка, Ірына Дарафейчук, Наталля Капа і яшчэ каля дзесятка маладых творцаў,

Сярод прадстаўленых у гэтай кнізе ў асноўным студэнты — Мікола Адам, Вольга Базылёва, Ганна Галавіна, Людміла Верас, Вольга Гапеева, Святлана Кухарэвіч, Вольга Калегік, Аляксандр Тарэлкін, Марыля Лагодзіч, Андрэй Любы, Марыя Можар, Святлана Хамутоўская, Кацярына Ярашэвіч. Яны рыхтуюцца стаць спецыялістамі ў абраных галінах чалавечай дзейнасці. Алеся Серада, Алена Пшыгоцкая, Вікторыя Куфціна — яшчэ школьніцы. Мікола Канановіч, Надзея Старавойтава, Ілона Сцяцко, Ганна Ціханава, Янка Лайкоў, Віктар Слінко працуюць. Ды паэзія з імі заўсёды — як дыханне, як найпершая патрэба, як унутраная работа душы. Гэта і робіць іх лешпыя творы неабходнымі не

толькі ім самім, а і цікавымі для іншых, хто слухае іх радкі на паэтычных вечарынах, чытае ў газетах і часопісах.

У ліку аўтараў кнігі — студэнт Полацкага дзяржаўнага універсітэта Андрэй Аляксандраў, адзін са стваральнікаў студэнцкага літаб'яднання «Брама». Вершы Андрэя і яго сяброў друкаваліся ў беларускай перыёдыцы, атрымалі станоўчыя водгукі чытачоў і літаратурнай крытыкі.

Што хочацца пажадаць юным талентам, творы якіх змешчаны на старонках гэтага выдання? Найперш — застацца ў літаратуры, выдаць свае ўласныя кнігі. Па-другое — найдаўжэй захаваць малады запал, юначы досціп, няўрымслівую прагу слова. Хто ведае, можа, якраз сённяшняя падборка вершаў для маладога аўтара стане стартавай пляцоўкай у вялікі й высокі свет паэзіі, можа, імёны тых, хто прадстаўлены ў гэтай кнізе, прынясуць славу і гонар айчыннаму прыгожаму пісьменству, як прынеслі нашыя слынныя Янка Купала і Якуб Колас, Максім Багдановіч і Змітрок Бядуля, Міхась Стральцоў і Уладзімір Караткевіч... Ва ўсякім разе, я з радасцю і надзеяй прамаўляю традыцыйнае: «У добры шлях!»

**Навум Гальпяровіч.**

**Аляксандр**
# АДАМ



*Нарадзіўся ў 1981 г. у Казахстане.. У 1991 г. пераехаў з бацькамі ў Беларусь.*

*Жыве ў Мінску.*

* * *

Я стаю ў чарзе па адзін удых паветра.
У дваццаць першым стагоддзі
я спытаў: «Хто апошні?»
Я за сотні гадоў прайшоў толькі два метры,
бо ў іншых ёсць ільготы. У мяне іх няма.

* * *

Ты згубіла мяне, як насіла ў кішэні.
Мяне мацалі рукі й твае, і шчэ чыесьці.
Можа, нечые дасталі, як цябе распраналі,
і закінулі ў туфель, і няма цяпер выйсця.
Ды пакуль ён пусты, але што засталося —
не пайсці мне ўгару, бо абцас твой высокі,
ды падлога слізкая, і сэрца галосіць.
Заставацца з табою так: а мо не раздушыш?

* * *

Хочаш, я падарую табе
кавалачак
сваёй геніяльнасці?
Ты будзеш рыфмай,
а я...

* * *

На заходзе сонца тваёй душы
я апошнім промнем закрыю вырай.
Захінуся вугалком твайго сэрца
і засну пад яго павольны рытм.

Я памыюся ў саўне з тваёй крыві
не шампунню — тлушчам,
што застаўся з мінулага года
ад амлета і зэльца.

Я ружоваю кветкай у тваім агародзе
нарасту па ўсім полі, ты мяне не пакосіш.
Я ізноў нарасту, і тваю геніяльнасць
заглушу пад сабой, як калісь ты хацела.

Я спякотай і ветрам разаб'ю тваю глебу,
яна сцісне твой розум і высушыць памяць.

Мо тады ты ўбачыш, як ляжу я на краі
твайго слабага сэрца, разам з ім паміраю.

Я дажджом і маланкай разнясу тваю хату.
І падмуркі ўсе рухнуць, як калісь мае палі.
Але ты не загінеш, я цябе падтрымаю,
на сваім цябе сэрцы вугалочкам накрыю.

* * *

Твая душа цягнецца па падлозе.
Нехта невыпадкова наступіў на яе.
І ты болей не прыбіральшчыца куткоў
у нечыяй памяці.
Я падхапіў яе і аддаў у камеру захоўвання
свайго мозга,
а ў вушах гучалі словы душы тваёй:
«Знайдзі мяне, цела!»

* * *

Ты кожны дзень па мне хадзіла
сваімі босымі нагамі.
Ты кожны дзень на мне ляжала,
спіну падсунуўшы да сонца.
Сябе ты мною засыпала,
калі пясочкам быў я пляжным,
а ты гэтага не ведала...
Ты кожны дзень на мне ляжала,
а на табе яшчэ хто-небудзь.

* * *

Зрабі крок у цішыню:
пахіснешся — не падай,
бо няма тут прасторы,
толькі нітка над безданню.

Калі хочаш — ідзі.
А не хочаш — ляці.
А не можаш....
Навошта сюды ты йшла?
Уратунку няма, а спакуса — з табою.
У цябе няма крылаў?
У цябе ёсць душа!
Падымайся ўверх, і ў хвіліну падзення
раскінь рукі ўбакі, затрымайся над безданню...

* * *

Тваё цяпло, як сонечная смага,
мяне сагрэе ў сплеснелай хаціне.
Ізноў згубіўся ў глыбіні тваёй слязіны,
на край шчакі я, як на дно марское, лягу.

Ты пазычаеш жыцці ў незнаёмых,
а я стаміўся за цябе для іх нараджацца.
Ізноў гарэць, ізноў тануць і набліжацца
да поўных слёзамі вачніц тваіх краёвых.

Я ўжо не твой, бо ты занадта памірала.
І кожны раз хвілінку жыцця майго
ты ў свой сусвет забраць па глупству забывала,
а я ўсё рос і рос, і вырас да свайго.

## Мікола
## АДАМ



*Нарадзіўся ў 1978 г. у в. Мікалаеўшчына на Стаўбцоўшчыне. Жыў у Казахстане.*

*Вучыцца ў Беларускім універсітэце культуры (аддзяленне кінадраматургіі).*

### БАЛАДА КАХАНАЙ

Ты — адзіная, ты — жаданая,
бэзам горада ўзгадаваная,

неспакойная ды... карцінная,
але — мілая, але — мілая.

Сядзеш прыцемкам на калені мне
і, здаецца, што мы гарбату п’ем;
і, здаецца, што за акном — агонь,
але нас з табой не запаліць ён.

Прасцірадлам ноч абаўе наш шал
і пачуццяў грэх прыме прасціна,
быццам бы віно — у чайной паэт,
і абрынецца свет, як бы ад камет.

А назаўтра дзень нас паб’е дажджом,
і парэжа, як зладзюга — нажом;
ачмурэнне сну згоніць кулаком
і ніводзін не загоіць шоў.

На зямлі сырой голыя з табой,
як праклён усёй слабасці людской,
будзем, як Адам з Евай, паміраць,
бо забралі рай, наш укралі рай.

Пекла чорнае паглыне, як золь,
і на раны хтось сыпане нам соль...
Шчасцем велічным усміхнемся мы
і на зайздрасць, і на зло усім.

Тады выплюне пекла, як вулкан,
лавай весняй нас, як рукаў — рака.
Прасцірадлам ноч абаўе наш шал
і пачуцуцяў грэх прыме прасціна.

А кватэрны гном прыгатуе чай
і за нас з табой залье свой адчай,
як цяпельца зла — ледзяной вадой
казачны герой, фэнтэзійны вой.

Ты — адзіная, ты — жаданая,
бэзам горада ўзгадаваная,
неспакойная ды... карцінная,
але мілая, але мілая.

* * *

Свет згорнуты, нібы таканіна,
у цэлафанавы рулон.
Ляжыць ля ног не паладзіна,
не перад царскім халуём.
Бы на павержанага воя,
на свет ступіла ты нагой:
жанчына?..
вобраз?..
паранойя?.. —
непараўнальная Любоў.

* * *

Сёння зноў абяцаюць дажджы.
І я, быццам Ісус на крыжы,
патанаю ў мокрым агні,
дзелячы дні на ноч, ноч — на дні.
Я хацеў бы з табой на крыжы
цалавацца ў спякотным агні
і нікому цябе не аддаць:
ні паветру, ні сонцу, ні маці.

Хтосьці скажа, што я не ў сабе,
а дождж з ходу прыстрэліць мяне,
каб пакуты мае на крыжы
не адолелі моцы душы.
Я хацеў бы цябе, як цыган,
выкрасці й схаваць у туман,
пасадзіць, як царыцу, на трон
у краіне пад назвай Любоў;

з крыжа скочыць падгалым ваўком,
да цябе ў дабравольны палон,
як сабака, прыбегчы й ля ног,
ля тваіх, ды застацца з табой.
Хай ідуць зацяжныя дажджы;
буду я, як Ісус, на крыжы...
Ты вяртаеш жыццё і вясну...
Прашапчы... І з крыжа я сыду.

* * *

Актрыса па жыцці.
Ды толькі не актрыса
на тэатральнай сцэне,
а лепей — у кіно.
Я з вамі пра каханне
фільмец здымаў калісьці
пачуццямі. Вы ж сапсавалі
ўсё сваёй ігрой.

Наіўны, я разлічваў
на рамантычны прысмак
у торце эпізодаў,
у дублях цыгарэт...
Смак нашых стрэч, на жаль,
нагадваў горкі прысак,
калі вы зразумелі,
што я — адно паэт.

Пагас вулкан вачэй.
Накрылі акуляры
іх чорнаю труной
пад туш святочных дзён.
Слабыя пацалункі
ўзялі на буксір мары,
ды іх таксама цягне
з апошніх сіл любоў.

* * *

У маім празаічным жыцці
Ты — адступленне лірычнае.

* * *

Спякотны дзень...
Ды холад у грудзях,
нібы знаходжуся ў катавальні.
Мой кат зусім
не празаічны страх
Мой кат — каханне!

* * *

Табе ўжо болей я не веру,
не трэба казачнай маны.
Ідзі, перад табою — дзверы.
І даравання не малі.

Не Бог і не суддзя я, ведай,
каб боль віны тваёй аддаць,
як жабраку — кавалак хлеба.
Ілгаць змагла — змажы стрываць.

І не прасі кахання — позна.
Вясна схавалася ў дажджы,
вятрамі дзьме ўжо дух марозны,
а ў маім сэрцы ўжо — не ты...

## Андрэй
## АЛЯКСАНДРАЎ



*Нарадзіўся ў 1978 г. у Ніжнім Тагіле (Расія). Скончыў у 1995-м сярэднюю школу № 1 г. Паставы з залатым медалём. Сёння — студэнт Полацкага дзяржаўнага універсітэта (гісторыка-філалагічны факультэт).*

* * *

Жыве чалавек
у сваёй пастцы-кватэры,
шчаслівы:
не лепш дый не горш, чым сусед.

Жыве
без Надзеі, Любові й Веры...
Жыве...
Што з таго, што палае Сусвет?

Жыццё яго мэта —
застацца ў натоўпе,
дзе цёпла і ўтульна
рабам пустаты,
дзе думкі й мары
навекі замоўклі...
І гэтак прасцей:
куды ўсе — туды й ты.

Жыве чалавек.
засмактаны па горла
будзённасцю шэрай.
марнуе свой век.
Жыве чалавек...
Але сэрца — памерла!
Жыве чалавек?
Жыве? Чалавек?

## НА КРЫВІ

Халодны павеў ураганнага ветру
прыводзіць цябе ў нечаканы экстаз.
Апошнія крокі... Апошнія метры...
І знікне ў нябыт пустата збітых фраз.

Ты помніш любові апошняй дыханне —
ты быў уладар і нябёс, і жыцця...
Разбітае шкло нерэальных жаданняў
разрэзала вены твайго пачуцця.

А смерць адмярае жыцця твайго стужку,
і мроіцца шэрасць апошніх гадзін.
Твой пульс ціха б'ецца параненай птушкай...
Ты раптам адчуў, што застаўся адзін.

## ЗАБЫТЫ ДОЖДЖ

Усімі забыты дождж
стукае мне ў акно
памяццю яркіх сноў.
Як адзінокі звер —
вецер. Ягоны стогн
студзіць у сэрцы кроў.

Дзверы не зачыню
(Ужо каторую ноч!) —
буду цябе чакаць,
буду я слухаць дождж
і на карце нябёс
зорку тваю шукаць.

Мне яе не знайсці:
сцяты ўвесь небасхіл
хмарамі ўшыр і ўздоўж.
Буду я зноў адзін
і да сябе ўпушчу
ўсімі забыты дождж...

* * *

Затрымайся яшчэ на хвіліну,
каб даслухаць сімфонію сноў,
каб наведаць са мною краіну,
дзе жывуць мае вершы без слоў.

Мы з табою наш храм пабудуем
пад халоднымі крыламі зор
і каханнем сваім замацуем
яго сцен непаўторны ўзор.

І не згасіць злы вецер пустынны
нашых сэрцаў агонь малады...
Затрымайся яшчэ на хвіліну,
каб застацца са мной назаўжды.

* * *

Горада халоднае святло —
электрычны злы самападман...
Дыхае ім кожнае акно,
і яно ліецца цераз шкло
ў цемру, быццам кроў з жыццёвых ран.

Неабдымным подыхам сваім
чорная сляпая цішыня
сон ператварае ў горкі дым —
тым,
хто будзе вечна маладым
і не дачакаецца ўжо дня.

Страх у сэрца заганяе сталь —
страх, што адзінота прынясе,
невядомасць свой спраўляе баль...
Досвітку маўклівага крышталь
паратункам прыйдзе па расе.

* * *

Рэшткі разбітага часу
спяць у цябе на далонях.
Сэрца тваё — зніч нязгасны,
вочы — кахання прадонне.

Я цябе клічу ў адвечнасць.
у далячынь небакраю —
толькі вазьмі з сабой свечку
зоркі, што дорыць нам ранне.

Мне працягні свае рукі,
і ты пабачыш, бы мрою,
песні далёкія гукі,
што закаханыя ў волю.

Ціха жыццёвая казка
б'ецца-пульсуе у скронях...
Рэшткі разбітага часу
спяць у цябе на далонях.

## ПАКІНЦЕ МНЕ ПРАВА...

Халодныя зоры гарачай рукой
я кратаю — кропелькі сонца.
Пакіньце мне права застацца сабой,
і зоры сагрэць мне дазвольце.

Узняўшы свой ветразь над шумнай ракой,
забуду спакой і забавы.
Пакіньце мне права застацца сабой —
маё неад'емнае права.

У бойцы крывавай з атрутнай маной
за рукі мяне не трымайце —
пакіньце мне права застацца сабой,
астатняе ўсё забірайце!

Стрываць дапаможа мне скруху і боль
блакіт крылаў роднага неба.
Пакіньце мне права застацца сабой —
і больш мне нічога не трэба!

## Вольга
## БАЗЫЛЁВА



*Нарадзілася ў 1982 г. у Мінску.*

*Вучыцца на факультэце журналістыкі БДУ па спецыяльнасці літаратурная работа.*

*Падрыхтавала да друку зборнік вершаў.*

* * *

Апусціўшы рукі
пальцамі ў зямлю,
выцісну карэнне —
хай імчыцца скрозь.

Толькі б не парушыць
тонкіх венаў круг,
па якіх — асенні
схаладнелы дождж.

Апусціўшы рукі,
мацаю цяпло
затхласці лістотнай,
шэрасці вады.

У пальчаткі з пуху
апранаю зноў
пальцы. Пух — халодны
лістападны дым.

* * *

Мы ўсе сляпыя,
кожны па-свойму
руйнуем храмы,
а рэшткі захоўваем
і ганарліва паказваем госцю.
Руіны чырвоныя — рэшткі сонца.
Руінам сняцца вежкі
й купалы.
Ва ўспамінах выцягваюць
шыі падснежнікі,
і гэтак жа, да неба ад зямлі,
узнімаліся храмы вечнасці
некалі —
найжаданейшы іх успамін,
якому не захварэць наяву.

Мы
ўсе
сляпыя,
ды вечна шукаем
святла...

* * *

Мы
да звычайнага
людзі розныя.
Захварэла
неба на восень і
безліч мурзатых
аблокаў кіруе
ў дажджовае
нікуды.
Як сказаць табе
толькі галоўнае,
Не пазбегнуўшы
невымоўнасці?
Падзялю я
ноты з табой
для жалейкі вады.
Ты зайграеш
песню забытую;
і настойліва
будзе распытваць
восень мяне
пра несканчоны
красавік.
Вылью ўсё
да пракіслай шчырасці...
Ёй такія дажджы
й не сніліся:
проста
да звычайнага
розныя мы.

* * *

А я расла
на беразе завей.
Там заінелы гасцяваў
тралейбус
на кожным з
засмечаных прыпынкаў,
на паўхвіліны просячы цяпла.
Там замест шыбаў
з вокнаў слеплі
крыгі,
на неба пазіраючы,
а я...
А я расла
для недасяжнай
веры —
для неба без
хмурынак і
журбы,
што па-над дахам
берага завеяў
дакладна
адлюстроўвала цябе.
А я расла
бяздонна сарамлівай
і абвяргала
кожную магчымасць
зірнуць у вочы
мілыя твае.
Патрэбнаю
была мне адзінота
(Запэўніць сябе
ў тым было
няцяжка!),
ды раптам
б'ецца на сто
вострых кропляў

вялікае, праўдзівае
люстэрка.
І сэрца...
Сэрца ведае і верыць,
што недзе
там, над дахам,
бачны хаты.

* * *

Адпусціце промні
да сонца,
не хавайце
ў слоіках, шклянках.
Не хавайце
ў кастрылях на кухнях!
Светлай гэтай
кудзелі сонца
вы хацелі
надаць значэнне
харчу, смажанага
выдатна.
Вы забылі,
што промні з неба?
Вы забылі, што
неба вышай
за зямныя
каструлі й патэльні
і за нізкія
думкі людзей?

* * *

Яна не прыйдзе
ўжо да цябе.
Ты не пагодзішся
з гэтаю думкаю

і самапаранішся
вострым вершам,
і ачуняеш, чакаючы
цуду.
Ты ўжо не пабачыш
Яе.
Прабач, за цябе
я ніколі не буду
глытаць прагорклыя
словы пакуты,
не буду
крычаць у сне.
Боль пастукаў
не да мяне,
але
адчуваю сябе вінаватай,
нават
сваёй адчуваю страту.
Прабач, мне ніколі не будзе
балець, як Табе.

* * *

Ты глядзіш на мяне
з чорна-белага
здымка.
Ты так пільна
глядзіш,
ды не бачыш, на жаль.
Я адмоўлюся
ад ненароджанай
звычкі —
расфарбоўваць
твой свет
і кантраст адмаўляць.
Чорна-белы шматок
бездакорнай паперы —
гэта ўсё,

што пакінуў ты
пра сябе.
Невідушчы пагляд...
Прагнеш бачыць
і... верыць
небу ночы,
пакрэсленаму на снег.

* * *

За туманамі
не бачна нічога,
толькі абрыс:
дрэвы галінамі
ўніз,
неба апалага
ліст...
І не мая дарога —
гэта адзінае,
што напэўна
ў абрысе туманным,
няпэўным...

За туманамі
чутно маўчанне,
але
нехта не слухае,
нехта не чуе,
глухне
маўчанне,
глухне...
У шуме.
За туманамі чакае
знямога.
Трэба ісці, а не маю
дарогі.

* * *

Горад, якога няма.
Наш адшуканы
горад.
Капелюшы на дамах.
Пыльныя, сыпкія
зоркі.

Як і куды
ні ідзеш,
будзеш заўсёды
вяртацца.
Звычка пустых трамваяў —
шлях прапаноўваць
табе.

Горад, што
не існаваў,
нам збудаваны
горад,
ціха запаліць
поўню
ў небе твайго
акна.

* * *

Забудзься
на бурштын
і на бяссонечнасць.
Няхай зацаравала
восень.
Сённяшніх
аголеных кляновых
правадоў
счарнелае,
учэпістае голле

калоціцца
пад песенькі
вятроў.
Пад песенькі,
падобныя на стогны.
Апала ўсё:
ад спрахлага ліста —
да шэрага
патрэсканага
неба.
З далоняў дождж
сцякае —
не данесці
да раздарожжа
сцюжаў і цяпла.

* * *

Учора ўвечары
паветра было запырскана
птушкамі,
якія шукалі вялікі
нябесны парасон,
а знаходзілі
хмары.
Уначы саслізнула
з нябёсаў маланка,
пабудзіла пажылы
бурклівы гром.
Неба гушкала
нованароджаны дождж,
а той усё
не хацеў засынаць,
прэч збягаў
і — ішоў,
ішоў,
ішоў...

А пад ранак
усё здажджэла наскрозь.

* * *

Гэта была восень.
Вады даліла ў калодзеж.
Лістотай далонек кляновых
прыбрала на досвітку
парк.

Восень была гаспадыняй
маёй дажджлівай самоты.
Не, каб прайшла міма,
павольна, ды ўсё ж
надышла.

Я думала, ці не позна
знайсціся пад лістападам,
а восень то сонцам,
то слёзна
прасіла ў мяне
цяпла.

Дык вось чаго не хапае
ў свеце маім
абыякавым!
А я, што ні дзень, замярзаю
пад восень.
Сагрэцца
як?!.

## Васіль
## БАРЫСЮК



*Нарадзіўся ў 1976 г. у в. Малыя Корчыцы на Кобрыншчыне. Скончыў філфак Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта.*

*Друкаваўся ў газеце «Раніца» і часопісе «Маладосць». Аўтар паэтычнага зборніка «Вежа» («Першацвет» , 1997, № 6).*

### УСЁ РОЎНА

Дзесьці вайна...
Недзе спакой...

А сонцу ўсё роўна, каму свяціць:
ні чалавек, ні балота
не вяртаюць яму цяпла.

* * *

Я чакаю з'яўленне феі
з таямнічых карункаў ліхтарных.
Глуха з голаду цень шалее...
Я чакаю кагосьці марна.

На асфальце анёл сумуе,
наракае на боты й шыны...
Я ў закуткі дамоў шыбую
ад няроўных фатонных ліній.

Пакідаю святло надзеі
і неонавых кветак усмешкі,
але веру ў рэальнасць феі —
трэба ж верыць усё-ткі ў нешта.

А язычніца Ноч ахвотна
ўжо алтар мне рыхтуе ахвярны.
Я іду да яго самотна
і кагосьці чакаю марна.

* * *

Люблю тваю самоту
і весялосць люблю,
і хатнюю суботу,
і родную зямлю.

Люблю завейны снежань
і лета цеплыню,
таемнасць жытніх сцежак
і добрую гульню.

Люблю сям'ю і вёску,
і першую раллю...
Але ж у свеце боскім
найбольш сябе люблю.

* * *

Выбіраўся я ў свет за падковай
па няблізкіх, нянаскіх шляхах,
і здаваўся мне боль выпадковым:
я знайду патаемныя сховы,
заблішчыць маё шчасце ў руках!

Дзён мінула ці мала, ці многа —
я вяртаўся дадому ні з чым...
За плычыма пыліцца дарога,
маці моўчкі стаіць ля парога,
а на сонцы — падкова блішчыць.

* * *

Жанчына з сумнымі вачыма
сягоння застаецца зноў адна.
Халодны горад — за плячыма,
і шклянка чорнага віна.

Замоўк шматслоўны тэлевізар
і пыляцца старонкі тоўстых кніг.
Буркуе голуб над карнізам,
нібыта ўсё ў жыцці яе спасціг.

Пустая шклянка. Мокры вечар.
Пужаюць вулкі думнай цішынёй.
У сненні моліць лёс аб лепшым —
і верасень цалуе плечы ёй.

* * *

Строгаю вяззю галін
я цябе намалюю...
І жураўліны клін
выпушчу ў цемру начную,

дзе Месяц — твой ідэал,
а я — твой язычніцкі ідал.
Непрадказальны фінал
па-за прасторай Эўкліда.

**Таццяна**
## БЕЛЬСКАЯ



*Нарадзілася ў 1975 г. у в. Вялікая Ліпа, што ў Нясвіжскім раёне. Скончыла ў Мінску ПТВ № 11.*

*Сябар творчай суполкі «Літаратар» з верасня 2000 г.*

### ВЫЙШЛІ ПАГУЛЯЦЬ

Ужо колькі гадоў
раслі хвойкі
за недабудаванымі дамамі.
Штогод на іх вырастаў

паясок новых галінак.
Гэта важна, бо год —
вялікі час,
значны жыцця ўрывак.
Лёгка па новых галінках
палічыць,
які ўзрост маладых хвоек,
што сталі любімымі
для варон і соек.
Прыгожыя хвойкі,
адно занадта калючыя:
што ні дрэўца — вожык
лёг на свой мяккі ложак...
Вожыкі кусючыя!
Пайшоў снег
і — як на грэх —
захутаў вожыкаў у беліва
коўдры-кудзелі...
Сонца свеціць.
Дзеці снегавіка лепяць.
Гляджу на дзяцей і хвойкі —
любуюся імі,
як вожыкамі малымі.

## СІНЯЯ ЗОРКА

Ужо развіднела,
але сонца яшчэ за лесам хавалася.
І так нарэшце сталася,
што раніца атрымалася
сцюдзёна-росная...
Але не трывожыла лес
непагадзь млосная —
на гострых вільчаках бухматых ялін
свяціліся брыльянты. І, як адзін,
уплеценыя ў зялёныя ялін валасы, —
звісалі празрыстымі кроплямі расы.

Не злічыць колькі елак у лесе
і на ўзлессі.
Тым больш — не злічыць,
колькі голак на елках.
О, колькі дробных
брыльянтавых пацерак
на гэтых старністых дзеўках!
Залаты прамень
кроплю пранізаў —
хараство сіняй зоркі паказаў.
Успыхнула яна сіне-зялёным
агнём прыгожым...
Як шмат неспазнанага
ў гэтым свеце Божым!

## Анатоль
## БРУСЕВІЧ



*Нарадзіўся ў 1977 г. у Гродна. Скончыў філфак Гродзенскагага дзяржаўнага універсітэта.*

*Друкаваўся ў часопісах «Першацвет» і «Маладосць». Выдаў зборнік вершаў «Дуэль».*

### НЕБА

Я люблю гэта неба — прыгожае, мяккае, шэрае,
дзе імкненне заўсёды становіцца светлаю вераю.

Там — мой дом між сузор'ямі Шчасця, Кахання і Вечнасці.
Я не быў там даўно, аж да гэтага ціхага вечара.

Там чакае мяне мой адбітак з люстэрка разбітага.
Я іду, а за мною — сляды мае, словы ды літары...

* * *

Пасяджу, папалю, і не важна, што будзе пасля —
ці самота, ці радасць, ці проста надзея на нешта.
Гэты вечар, каб жыць, а не крочыць у чорную вечнасць.
Гэта ноч не канец — толькі дня каляровы працяг.

Запалю сваю зорку над хмарамі страчаных дзён.
Яна будзе гарэць для людзей, але не для народа.
Хай асвеціць мой шлях да святла праз жыццё і нягоды.
Хай не скоціцца ў пыл, як душа мая ў роспачны дзёрн.

* * *

Першы раз за пошнюю вечнасць
мне хацелася плакаць.
Я стаміўся не верыць і верыць
тваім словам і знакам.

Да наіўнасці цёплыя вершы
я не кінуў на плаху.
Першы раз за апошнюю вечнасць
мне хацелася плакаць.

## ДЗЕНЬ

Цэлы дзень за плячыма —
нібы цяжкая ноша.
Як цудоўна, што ноччу
я змагу яго скінуць.
Але прыйдзецца заўтра
ўсе мінулыя справы
паўтарыць па парадку —
ад канца да пачатку.

## МАЙМУ АНЁЛУ

Калі нават прынясеш мне боль,
дрэнна пра цябе не буду думаць.
Ты — мой сумны вартаўнік-анёл,
ну, а я... Я — частка твайго суму.
Дзіўна, але крылы за спіной
больш не хочуць волі і свабоды.
І таму хачу не быць з табой,
а ў табе застацца назаўсёды.

## АКРАВЕРШ

**Л**аскавы позірк, сонечная ўсмешка...
**А**дкрыю вочы — вечар за акном.
**З**абіты час нагадвае мне дом —
**У**богі і закінуты за вечнасць.
**К**ароткае, халоднае «Бывай!»
**А**двесіць змрок, як сінюю фіранку.
**Г**арачы вечар скончыцца да ранку,
**А**ле пакуль ён з намі, — выбачай.
**Л**аскавы позірк... Бачу, але ўсё ж
**І**зноў цалую вусны, а не вочы.
**Н**яўжо цябе няма і гэтай ноччу?
**А** за акном — святая прыгажосць...

## СЫМБАЛЬ БЯССМЕРЦЯ

Чорны крыжык — мой сымбаль бяссмерця —
я табе падарыў, але ты,
перш чым браць, мне сказала, што веру
я не мушу нікому дарыць.

Так, не мушу. Мой крыж — гэта вера.
Але ж ты — гэта я, дык павер —
гэта ключ у нябачныя дзверы,
за якімі не знойдзе нас смерць.

* * *

Люблю, калі іграе ліра:
не гукі — слёзы на шчацэ.
Пражыты час — нібы эпіграф
да непражытага яшчэ.

Прабач, што сёння не з табою.
Хачу застацца я адзін —
са мною смутак у пакоі
і цыгарэтны сіні дым.

* * *

Цемра рукою нябачнай
ціха патушыць святло.
Божа, які я няўдзячны
лёсу і слову «было».

Ноч. Я люблю гэты горад —
чорны, бязлюдны, глухі.
Згублены некім учора
стоенай роспачы гімн.

* * *

Я знішчыў ворагаў сваіх —
ім даравў злачынствы іх.
Бо сам такі ж, але мой Бог
не змог стварыць мяне рабом.
Ён падарыў мне гэты свет
і так сказаў: «Ты — чалавек!
Ты навучыўся прабачаць —
Я зноў жыву ў тваіх вачах!»

## Таццяна
## БУДОВІЧ



*Нарадзілася ў 1977 г. у Мінску. Скончыла Інстытут сучасных ведаў. Працуе ў Закрытым акцыянерным таварыстве.*

*Завочна вучыцца на гістфаку БДУ.*

### НАРМАЛЁК

**1**

Свой пэндзлік чароўны
вазьміце, мастак.

Той свет намалюйце,
дзе зараз вясна.
Дзе квецень каштанаў
прылашчыць свяжак.
Адчуе каштан:
на зямлі рай — не зман.
Жыве там
з мянушкаю дзіўнай звярок.
Назвалі яго
ці не вы — Нармалёк?
...А свет той так блізка —
праз дзверы ў сцяне.
Праз дзверы ў сцяне,
што я ўбачыла ў сне.

## 2

Прывітанне, Нармалёк!
Слаўны выдаўся дзянёк.
Ці то жартам, ці ўсур'ёз
знічкі падаюць з бяроз.
І здаецца, мабыць, мне,
што ў расталым тумане
ўсё ж чагосьці не стае.
Мары грэшныя мае
мяне клічуць у вясну,
нібыта яе вярну...

Ах, якая неба сінь
па-за золатам галін!
Слаўны выдаўся дзянёк.
Прывітанне, Нармалёк!

* * *

Прарастаюць скрозь лужыны ліхтары.
І сплятаюць адзін з адным карані.

Дажджу парасткі — на акне зверху ўніз.
Дождж сцяблінамі прарасце скрозь карніз.

Як шкада, што не зможаш ты ўслед ісці
там, дзе ў лужынах ліхтары зацвілі.

Дык нашто цябе зноў і зноў клічу я
скрозь сцябліны йсці дажджоў доўгія?

* * *

Я пад белым халодным небам,
белым-белым халодным снегам
прачынаюся, каб убачыць.
Прачынаюся, каб адзначыць:
у цябе сёння сілы болей.
Сілы хопіць табе, каб здолець
палюбіць гэты холад неба.
Белы снег на халоднай глебе.

* * *

Той свет за белымі дзвярыма:
дзівосны дом у зеляніне
і кветках патанае сініх.
...Той свет за белымі дзвярыма,
дзе мы з табою — два манахі.
Баронім жыхароў ад страху
быць адзінокімі...
Я дзверы
ў той свет малюю на паперы.
І кветкі сінія з травою.
І двух манахаў — нас з табою.

* * *

Над фіялетавым лубінам
аблокі белыя на сінім
са спадарожным ветрам міма.

Няправільны малюнак ліній
у небе самалёт пакінуў
над фіялетавым лубінам.

І вольны вецер над зямлёю
і над табой, і нада мною
адносіць ліній тых спляценне
бліжэй да сонечных праменняў.

* * *

...А галін сувой угары,
абдымаючы ліхтары,
хоча засціць усё сабой:
неба з поўняю залатой.

І, здаецца, што дагары,
а не зверху ўніз снег ідзе.
Растае ў неба чарнаце,
абмінаючы ліхтары.

* * *

Як і раней, нас пахаваюць,
падумаўшы, што мы памерлі.
Зямлёю змерзлай закідаюць,
каб да адлігі мы не мерзлі.
А нам з табой таго і трэба.
Для нас з табой — не гэта неба.
Пад ім не спыняцца арэлі,
што з ніцяў срэбнай павуціны
пляце для нас павук вялізны.

Усё — нібыта мы памерлі.
Усё — нібыта мы не разам.
І Бог прадвызначыў паразу
тваёй дружыне. І не злезе

крывавы снег з зямлі. На снезе
крывавым, быццам бы не зброя
тваіх непераможных ваяў.

* * *

Ты маеш час прыйсці —
травою прарасці
між пліт
і размаўляць са мной.
Тут ціша і спакой.
Граніт
плюшч апавіў з тугой
і неба над зямлёй
блакіт.
Прыйдзі, каханы мой,
паразмаўляй са мной.

* * *

Ты не прачнешся, калі
ў снезе сагрэецца поле.
А на халоднай зямлі
снегу ўсё болей і болей.
Ты не прачнешся ніколі.
Снег саграе твае сны.
Сны
пра гуканне вясны.

* * *

Каля агню
матыль начны
прымроіць сны
пра дабрыню.

Хутчэй прабіць
сцяну са шкла —

і да святла,
і апаліць
начны адчай,
ці разам з ім —
халодным, злым —
загінуць... Хай.

Святло ў акне.
І ўсё адно —
каму яно
гарыць... Не мне.

* * *

Там, дзе вецер па дахах ходзіць,
холад снегу ўначы трывожыць,
часам можна пачуць не словы —
грукат зброі начной аховы.
Грукат зброі ў цагляных нішах
пад аблокамі, што калыша
вецер. Тут можна чуць не словы —
грукат зброі начной аховы...

* * *

Адсюль,
дзе вада паўсюль,
туды,
дзе няма вады, —
змагацца са смагай ты
ідзеш. Я хачу з табой,
знясілены мой герой.
Не сілу табе аддаць,
не рэшту тваёй узяць, —
засведчыць сабе ізноў...
Засведчыць мільён разоў:
ёсць нехта жывы, як ты.

Ёсць нехта, але не ты, —
рэальней за нас з табой,
знясілены мой герой.

## АПОШНЯЯ ВОСЕНЬ

Восень даўно ўжо. Цяжкія воблакі
цягнуць з зямлі жыццядайныя сокі.

Краты галін адгароджваюць свет —
той, дзе губляецца сноў маіх след.

Тут — адзінота, хвароба і золь.
Цісне да ложка бязлітасны боль.

Ах, як шкада, што вяртання няма
ў дні, калі быў каралём я. Дарма

не развітаўся з жыццём я тады:
у росквіце славы й сіл, маладым.

Шмат меў багацця, яшчэ больш сяброў,
толькі цяпер знікла ўсё без слядоў.

Цяжка апошнія дні дажываць.
Цела ад смерці пад коўдрай хаваць.

Ведае нізкае неба: я *жыў*.
Дождж адбівае па шыбах матыў:

супрацiўляцца без сэнсу і сілы —
быць утаптаным у пашчу магілы.

## Ірына
## БУРДЗЕЙКА



*Нарадзілася ў 1981 г. у в. Сноў. Вучыцца ў БДПУ імя Максіма Танка.*

*Друкавалася ў «Першацвеце» і «Маладосці».*

* * *

Імгненне вечнасці
непарушна
гадзіннік-вартаўнік
сцеражэ час

цені схаваліся ў куток
ад прачыненых дзвярэй
позірк пустаты
неспазнанай

хтосьці ў мяне за спіной

працягні асцярожна руку
не спалохай незнаёмыя сілуэты
хутка скончыцца ноч

* * *

Каб любіць
патрэбны кармушкі
перад вокнамі
кожную раніцу
выдумваць снег
птушак
цёплыя рукавіцы
каб любіць
гарачая гарбата з цукрам
і вершы
і акно
за табою зачыняць потым
калі
надакучыць выдумваць снег
птушкі не прыляцяць:
не холадна!
...А ты кідай, кідай
хлебныя крошкі.
Каб любіць...

* * *

Шукаеш цень
каб потым

адкрыць святло
а вочы
прывыкаюць
да змроку
і ядавіта бліскучае сонца
так балюча
калючымі промнямі...

з цяжкімі апёкамі
расчараваны
назад —
у цемру...

* * *

На скрыжаванні дарог
    крыжы
    і мы
пад парасонам сусвету
горыч рэчаіснасці
выпі да дна
калі не ўспомніш
што значна лепш на смак
салодкая спакуса
схавацца ад сябе самога
    два келіхі:
    у якім
    атрута?

* * *

Геніяльна проста
перадапошняе
непрадбачанае
з каменнем у руках
стаяць
на чужым полі

па пояс у траве
па горла ў снезе
з галавой у зямлі
страціць кірунак
і мары
пазнаваць сябе
толькі па пары года
моцна трымацца
карэннем зблытаным
у зямлю чорную
ўрасці глыбока
і імкнуцца ўвысь
з ветрам вольным

## Людміла
## ВЕРАС



*Нарадзілася ў 1980 г. у в. Вялікія Чучавічы на Лунінеччыне.*

*Вучыцца ў БДУ на філфаку.*

* * *

Патаньчым, пакуль ільюцца
праменні нямой пяшчоты.
Аддзячу табе за шчасце
пасля хаўтур адзіноты.

І ты — мой спадар,
я ж — блазан, з кляймом
пад цялячай скурай.
Ратуеш мяне і ганьбіш.
Дурманіць напеў пануры.
Парві прыгажосці шаты,
скамяч рамантызм і ўзнёсласць,
пажадлівым морам цноты
гані самотныя вёслы.

* * *

Стомлена жоўтым ветрам...
Неба аб тым маўчыць.
Страчаны словы летам,
лета магло б не быць.
Зломлена колам жахаў...
Рукі лятуць угару.
Іх не пушчу прасіцца —
уранку расой памру.
Спалена дзікім сонцам...
Колькі трываць яшчэ?
Падаю ніц. Даруеш?!.

Шэранню ноч цячэ.

* * *

Жоўтымі промнямі сэрцаў пялёсткавых
сыплюцца кветкі на твар твой.
Летам уяўным да першага пострыгу
быў не чужы ты, а ўвесь мой.
Сонцам малінавым шэрага вогнішча
ззяла мая ноч.
Ценем маўклівым цёплага ветру
побач са мной крочы.

## МАЛЮНАК

На чыстым аркушы паперы
было многа-многа снегу
і — адзіны слядок.
Гэта я малявала жыццё.

## РАНІЦА

Горад пралупіў свае заспаныя
аўтамашынныя вочы пасля таго,
як абмыўся каналізацыйным дажджом,
выцерся зашмальцаваным да дзірак туманам,
затым лена пазяхнуў чорным зевам
і праглынуў мяне на сняданне.

* * *

Хварэю абыякавасцю —
скрыжаваліся лёсы.
Не трэба мяне выпрабоўваць
на вартасць:
я не вытрываю.
Я змазоліла рукі аб уласнае жыццё,
а яно — недабудаванае.
Я ж не прашу ў цябе
дапамогі,
каб зруйнаваць
мой кволы будыначак.

## Ганна
## ГАЛАВІНА



*Нарадзілася ў 1981 г. у Мінску.*

*Студэнтка другога курса МДЛУ. Друкавалася ў часопісе «Першацвет».*

* * *

Дах зямлі працякае.
На далоні чужых падваконняў
мне калені цалуе бяздонне
з учарашнім запоем у зрэнках.

Крокі будзяць самотнае дрэва
і ў парку жывую істоту.
Недзе ёсць словы «заўтра» і «потым»...
Ну і што? Я — зіхотная кропля,
дзе хаваецца водсвет ад вокнаў,
за якімі ты слухаеш дождж.

* * *

За маёю форткай птушкі
вучацца, як пець не трэба.
Заціскае вушы неба
ад упартых, п'яных пальцаў.
Нават цішыня глухая
ад самой сябе ўцякае...
Толькі мне ці важна гэта,
калі я іграю танга.

* * *

Чуеш шолах вясковых дажджоў,
шэпт празрыстых і горкіх вятроў?
Твар зямлі ён заліў і далоні,
валасы, плечы, грудзі ды скроні.
Слаўся, цёплых залеў цішыня
і напружаны шал дзікіх сноў —
нараджэння і смерці гульня!
Песці, дожджык, яе. Болей, болей!
Спевам птушак ускрыкне зямля.

* * *

Танцую, дажджу твар падставіўшы.
У горадзе мокрым і шэрым —
адзін ёсць шчаслівы без меры...
Даруйце, спадарства-таварышы,
але чалавек гэты — я.

А хто ж — той вар’ят бяздомны,
асуджаны ўпасці. І з кроўю
на твары, разбітым адмоўем,
падняцца, пайсці ў ранак сонны?..
І гэта — таксама я.

* * *

Горкі смак халадоў... Зіма.
Ноч ці ранак — ужо ўсё роўна.
Калі нават заўважыш поўню —
гэта будзе самотны ліхтар.
Цішыню паўпустых гарадоў
у святле нежывым ён хавае.
Забываю цябе. Забываю
пах вясны на далонях маіх.
І зрываюся. Толькі зноў:
«Асцярожна — напружанне, рэйкі...» —
угаворвае рысу бяспекі
голас змяты не пераступаць.
Мая стрыманасць — кошт ёй два грошы! —
не цяпер, але ўсё ж такі зможа
на шматкі разляцецца яна,
як старое адзенне. Але —
хто маўчаннем сябе не ламае?..
Свае вершы люстэрку чытаю
і звыкаюся да цішыні.

## Воля
## ГАПЕЕВА



*Нарадзілася ў 1982 г. у Мінску. Вучыцца ў МДЛУ.*

*Друкавалася ў часопісах «Першацвет», «Бярозка», «Крыніца». Падрыхтавала зборнік вершаў «Рэканструкцыя неба».*

* * *

Я злаўлю прыгажосць
распранутых дрэў.
Адшукаю нікім не губляную
раніцу.

І нават убачу думкі людзей...
Толькі так і не зразумею:
чаму я не птушка?

* * *

Ад слупа — да слупа
па стальных правадах
з хуткасцю
трыста мегапацалункаў
у хвіліну
цячэ
нешта,
нешта маё —
вялізнае, з пахам язьміну.
Стану пытальнікам
пасярод поля,
сярод чорных кропак
крумкачовае зграі.
І на сухажыллях
цела майго
што-небудзь з Шапэна сыграю.
Да д'ябла ўсялякія там
каханні...
Я ванітую
ад іх пяшчоты.
Я лепей буду на паляванні
страляць сабе ў голаў
ад адзіноты.

* * *

Запляцеш мне коскі, коскі
з водарам лекаў.
І я пайду зданню, зданню
праз тваё цела.

І я аддам словы, словы
нямым вуснам,
калі запляцеш мне коскі, коскі
з водарам смерці.

* * *

Я збіраюся на вайну
кожную раніцу.
Чышчу боты, рыхтую зброю.
Потым — мы будзем кахаць, потым.
А зараз — мне некалі.
Я збіраюся на вайну —
чышчу боты, рыхтую зброю.
Хочаш — цалуй мае вочы,
пакуль не баляць яны
ад калючага дроту.
Жабкай станецца хто-небудзь іншы,
а мне некалі — я збіраюся на вайну:
чышчу боты, рыхтую зброю...
Заўтра птушкі скінуць па крыльцу —
гэта звычайны прагноз надвор'я.
Ну што ты паціскаеш плячыма?
Я — немагчыма.

* * *

У жоўтай траве
цвыркун папяровы
чакае,
пакуль яму намалююць
непаслухмяныя вочкі.

* * *

Спелыя зморшчынкі лужын
пакрыёма схаваем

ад матыля-аднадзёнкі,
каб не бачыў,
якое жыццё можа быць
доўгім.

* * *

Недзе на цёплым жываце
існуе мільённа радзімка.
Цікава: аб чым яна марыць?

* * *

Калі робіцца страшна-страшна —
заплюшчваю вочы таму,
хто стаіць побач.
Раніцу глытай асцярожна,
пакуль дождж
не прапаліў ёй скуру.
А лепей —
схавайся пад коўдру таго,
хто ляжыць побач,
і глытай, глытай асцярожна,
каб не параніцца
алюмініевай раніцай.

## Інга
## ГАРАВАЯ



*Нарадзілася ў 1979 г. у в. Вуглы на Лагойшчыне. Бацькі жывуць у в. Швабы. І. Гаравая вучыцца ў Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце.*

*Друкавалася ў часопісах «Першацвет», «Маладосць», «Полымя».*

* * *

Як сумна шарэе дарога —
і вабіць, і вабіць ісці.
Пайду я далей ад парога,
каб дзесьці самоту знайсці.

О, я не баюся самоты!..
О, я не бываю адна,
бо дзе б ні хадзіла, заўсёды
са мною — ці Бог, ці вясна,
ці восень,
ці вечар зімовы,
калі запаляюць агні,
ці поўня, ці месячык новы,
ці ўсё, што — куды ні зірні —
мяне напаўняе спакоем
і болем нясказаных слоў...
Ах, досыць, зраблюся сабою —
матуля хвалюецца зноў.

* * *

Неба ў зорках. На небе ўладараць яны.
Дзесьці ў цемры касцёр дагарае.
Там застыў, запанурыўся конь вараны.
Ён — на волі... Ды волі не мае.

Ногі спуталі людзі вяроўкай яму,
мары зблыталі ветры начныя.
Узляцеў бы да зорак!.. Ды помніць хамут
спрацаваная конская шыя.

А пад ранне, калі цішыня зазвініць
ды зайграе нямыя рулады,
ён забудзецца ў стоме і раптам — прысніць
белых коней у небе крылатых.

## У ЗМІТРАЎСКУЮ СУБОТУ

Слупы стаяць, як далакопы.
Сяло — як могілкі ў імжы.
Крывыя дахі. Сена копы.
Антэн сагнутыя крыжы.

Вясковае жыццё ў дрымоце.
У вёсцы лістапад ізноў.
Ізноў няўтульнасць у прыродзе,
у шэрым прыцемку вякоў.

Ізноў туманны надвячорак
збірае нас каля куцці.
І гэтулькі людскога гора
ў сабачым жаласным выцці.

## НАСЛАННЁ

Перад светлым Раством у той хаце —
сытны пір, мітусня і пракляцці.

Гора горкае: кінуў там зелле
сатана і шчыруе ў вяселлі.

І праз шыбы тым людзям не ўбачыць,
што ля вокнаў анёлы іх плачуць.

За людскую бяду ў паднябессе
песні шлюць — упрашальныя песні.

Шумна ў хаце, а д'ябал шалёны
адзначае людзей тых імёны.

І кадзільны прасветлены дым
не ўзыходзіць над комінам тым.

## ЭЦЮД АКВАРЭЛЛЮ

Дагарае неба колерам барвовым,
у смузе ружовай патанае луг,
а за чорным лесам, за хрыбтом яловым —
месяц уздымае вышчарблены круг.

Белыя бярозы з цемры вынікаюць.
гронкамі рабіна свеціцца наўзбоч.
Шапаціць лістота.
Фарбы высыхаюць.
Колеры і гукі паглынае ноч.

## ЗБАВЕННЕ

Паманіў дзяўчо хлапчына,
паланіў і даў ёй шлях
праз калючую шыпшыну
ды каханнем у вачах.

Непагасная лампада —
і няўмольны, жорсткі лёс...
Перад ёй паўстала здрада
чорнай хмарай да нябёс.

Здаўся свет ёй дамавінай,
сэрца сцяў глыбокі сум.
Пажадала быць ля млына
каменем без слёз і дум.

І было, як пажадала:
на кіліме з мяккіх траў
каменем бялюткім стала,
сон яе апанаваў.

* * *

Як хмеліць ліпы пах,
як вабіць клёна цень.
Пярэсціцца ў вачах
спякотны летні дзень.

Дзе захад і дзе ўсход,
дзе поўдзень, поўнач дзе?

Шалёны карагод
спякотны дзень вядзе.

Ці то пчаліны рой,
ці то гудзе ў вушах?
Зрабілася нямой
самлелая душа

ад вышыні нябёс,
ад мурашыных спраў,
ад невымоўных слёз,
ад нерухомых траў.

Доўгачаканы мой
вячэрні час,
прыйдзі!
Суцеш і супакой,
суціш і астудзі.

## Павел
## ГАСПАДЫНІЧ



*Нарадзіўся ў 1980 г. у Кіеве. Нейкі час жыў у Тбілісі. Вучыцца на філфаку БДУ (аддзяленне беларускай мовы й літаратуры). Сябар творчай суполкі «Літаратар», што працуе пры Саюзе пісьменнікаў.*

*Друкаваўся ў часопісах «Першацвет» і «Беларусь».*

### ЦЕНЬ ІЗГОЯ

Таньчыць неба.
Спяваюць паэты:

— Хлеба нам, людзі, хлеба!
Дайце свабоды й хлеба,
а больш — нічога!

Таньчыць неба.
А сэрца застыла.
Кукавала зязюля.
Зямля варажыла:
— Хлеба мне, вады й паветра.
Дайце свабоды й хлеба.
Дайце мне сонца і вецер.
А больш — нічога не трэба!

Таньчыла неба.
Плакалі рукі.
Хмары, як скрухі,
галосяць у цемры.
Званы ў цішы.
Крыж — у душы.
Шэпт далёкі:
— Хлеба крыху, хлеба ды неба!
Зямлі й паэтаў.
Свабоды й кахання.
Злу — брамы туману...

Таньчыла неба.
Паэты спявалі.
Сэрца застыла —
зязюлю хавалі...
Званы ў цішы.
Крыж — у душы.
А вусны шапталі:
—Дарэмна спявалі.
Дарэмна кахалі.
Мы не знаходзім
таго, што шукалі.

Зямлю, хлеб і неба —
добра ў сэрцы схавалі.
А сэрца аднялі,
бо край свой праклялі.
І сніцца, і трызніцца шчасце —
адвечнае шчасце,
спеў наш адвечны
Хлеба, паэтаў і неба!

Таньчыла неба
па планеце пустой.
Адзінокі, апошні ізгой
нёс пергамент
і рукі дрыжалі.
І ногі хісталі.
І кропля крыві
на захадзе дня —
быццам за грэх,
як над сонца промнямі — снег,
таяла, высыхала, знікала.
І сляды ізгоя навечна
хавала вечнасць, рыдаючы.
Пергамент рука не ўтрымала —
і шэпча ён, паміраючы:
— Навошта свой свет мы
праклялі?..

Таньчыць неба.
Спяваюць паэты.
Мы жывем
яшчэ пакуль
у дні іншым зусім.
Але ўжо насустрач
брыдзе цень ізгоя:
— Дай нам, стагоддзе,
хлеба, паэтаў, любові!

## НЕБА І ЗЯМЛЯ

Баюся страшэннай стамлёнасці ежай.
Гэта бачыў анёл — і плакаў.
Але я не баюся пакуты без межаў.
Гэта не адчуў Бог — і стагнаў.
А людзі казалі пра каву,
пра надвор'е, пра сям'ю.
І хіба, каханая, зведала ты,
што яны казалі пра мяне?
Толькі не трэба «не».
«Не» — гэта гармата адмовы.
Толькі ўсміхніся мне,
ды паляцім да зораў.

Баюся сноў, дзе кроў палае.
Гэта бачыў анёл — і плакаў.
Але я не баюся слоў, што страляюць.
Аднак Бог палічыў гэта абразай.
А людзі казалі, што трэба — на працу.
Як ім цяжка, як цяжка ім.
Ды хіба, каханая, ведала,
якім цяжарам вочы засціць
штодзённшчыны дым?

Толькі смялей праспявай «Так».
Гэта будзе таемнай змовы наш знак.
Толькі ў далоні вазьмі мак,
каб удзячны кахання быў шлях.

Баюся халоднай пустэчы ва ўсім.
Ежа — дрэнь. Сны — як сляпень.
Баюся анёла, д'ябла і Бога.
Але наша каханне — дарога
праз гаворкі людскія,
праз слёзы анёла
і Бога папрокі.

Яно адужае
спалох мой і тваю нерашучасць.
І мы будзем самымі моцнымі.
Самымі вялікімі.
Самымі разумнымі й таемнымі.
Бо душа майго выратавання — ты.
Бо сэрца твайго адхлання — я.
Разам злучыліся
неба і зямля!

## ВОЧЫ ТВАЕ

Поўня свяціла, бы шалёная ваўчыца.
Ты ж абпальвала вочы духам сваім.
Аблокі сядалі на бруд гарматай пуху.
Я спадаў промнем ночы ў далоні твае.

А калі прачнулася маланка —
узімку, летам, уранку? —
мне трызнілася постаць і лёгкасць,
што, караючы, адарала;
што, забіраючы, губляла.
І слізкі подых хвалі растання
згуляў на дудцы пастух зор.

А поўня свяціла, бы шалёная ваўчыца.
Значыць — напагатове чорныя пасмы й белыя іклы.
Значыць — хмары разбураць святло.
Толькі мой спакой пахаваны ў табе.

Маленькая кропля-другая, як слёзы...
Слёзы Зеўса і смех Хаоса.
На сцяжынцы невядомага лёсу
журботную песню спявае крумкач.

І поўня свяціла, бы шалёная ваўчыца.
На баль крывавы ішлі ведзьмары.

Калі я дакрануўся да тваёй рукі —
маланка злілася з вадою ў адно.

Цікаўныя вочы цёмнае ночы
цалавалі твае спякотныя крокі.
На іх засынала раса надзеі.
І гінула срэбрам Іуды краса.

Ты запальвала зоры подыхам бэзу.
А мароз чараваў рэчкі мар, сцежкі дум.
Свет ваўкалака — ты трапіла раптам
у яблык першы, — спакусу і смерць.

Наперадзе свяціла шалёная поўня.
Галодныя ваўкі гуляліся ў страх.
Ты, вельмі зіхоткая, сталася зоркай,
пакінуўшы тут зямлю Армагедон.

Ураніцы, калі я абхапіў сусвет неіснуючых рэчаў,
калі неспадзеўкі захлынуўся воўчым зрокам —
феяй, бы з казкі, у люстэрку зламаным
лагодна і цёпла палалі-глядзелі
сусветаа-касмічныя вочы Твае.

## КАХАННЕ

Ён быў. Жыў. І сам быў самім сабой.
Ён жыў. Быў. І плыў сярод такіх, як сам.
Ён любіў. І жыў сам сабой сярод такіх, як сам.
Ён верыў. Бо не ведаў яшчэ, што быў, што жыў і любіў.
Ён марыў.
Ён спадзяваўся.

Ён пасля гэтага не дазнаўся, што ён быў.
Трэба было, каб не быў сам і самім сабой.
Ён любіў, бо не дазнаўся, што
Верыў, Марыў, Спадзяваўся...
Ён проста кахаў.

## ЧАКАННЕ ВЯСНЫ

Я піў лета шалёна.
Я піў восень павольна.
Я чакаў зімы.
Я не бачыў вясны.
А вакол — камары й мухі.
Паўсюль — здурнелыя рухі машын.
Ды яшчэ — пытанні: «Адкуль?»
Але — гожа чаканне паліць.
Дужа душа баліць.
Каменне сталася цестам.
Не знаходзіў тут месца
дыярыуш новага веку.
— Стой!
— Ты хто?
— Чаму ты забіў святло?
— Якое?..
Мой голас цверазеў не ў час.
Мая дзяўчына з’явілася якраз.
Мой сябра сказаў:
— Даволі!
Я прагнуў волі,
чакаў зоры.
А наогул — не бачыў вясны.
Цверазеў голас,
Расквітнеў колас.
Спявалі птушкі.
Бялелі падушкі.
А далягляд — крывёю гуляўся.
А вадаспад — агнямі кідаўся.
Штурхалася сэрца дзіка.
Мароз паміраць прымушаў.
Я чакаў, чакаў — доўга чакаў...
І нехта пасля —
не такі, як я, —
лёгкі і ўтрапёны,
з нейкай новай мовай,

з нейкім новым словам,
з нейкім часам сваім
яшчэ бачыў дым,
што ахінаў цэлы старыя,
думкі новыя, думкі былыя.
І нехта гэты незнаёмы,
у капялюшы чырвоным,
з кропляй крыві замест
чыстай слязы
падносіў куфар нябесны —
нектар боскі...
Я піў лета шалёна.
Піў восень павольна.
Чакаў зімы.
А я — так і не бачыў вясны.

## Воля
## ГРАДЗІНАР



*Нарадзілася ў 1979 г. у Мінску. Скончыла гуманітарны ліцэй (пры БГАКЦ). Вучыцца ў Беларускім дзяржаўным універсітэце (факультэт міжнародных адносінаў)*

*Друкавалася ў часопісе «Першацвет».*

* * *

Ружа ў крыштальным бакале...
Холад празрысты крышталю
і цёплыя фарбы пялёсткаў —
дзве процілегласці...

Пяшчотныя ружы абрысы
і тонкія грані бакала —
дзве дасканаласці...
Пах адмысловы бутона
і холад іскрысты, мёртвы —
дзве бясконцасці...
Ружа ў крыштальным бакале...

* * *

У Свіслач глядзіцца Мінск —
старажытны Горад.
Свецяцца агнямі вокны Траецкага прадмесця —
Ягоныя вочы.
Вяршыні дрэў шумяць, як хвалі мора —
Ягонага мора.
І мы ідзём, узяўшыся за рукі, пад покрывам ночы —
Ягонай ночы.
У касцёле малітва — быццам Ягоная мара:
ляціць у неба і губляецца дзесьці ў змроку.
Блішчаць зоркі, свеціць месяц, разбіўшы хмару,
і аддаюцца ў цішыні крокі —
нашыя крокі...

## ТРЫЯЛЕТ

У сутонні надзей і мар
ты адзін для мяне існуеш:
твая постаць, твой голас, твар —
у сутонні надзей і мар...
Ты мне радасць жыцця даеш,
ты — душы маёй уладар.
У сутонні надзей і мар
ты адзін для мяне існуеш.

* * *

Мінула семнаццатае лета,
прыходзіць семнаццатая восень,
у хмарах няма прасвету,
не вернеш нябёсаў просінь...

У белі зімы семнаццатай
сваю змерзлую душу намацаю,
яе адагрэю подыхам...
І надыдзе вясна. Семнаццатая.

* * *

Ты адкінеш цыгарэту
і пяшчотна пацалуеш,
і на небе знойдзеш зорку,
што гарыць для нас з табой.
Ты кранеш гітары струны,
загучыць твой голас мяккі,
будзеш ты спяваць да ранку
толькі для мяне адной.
У твае зірну я вочы —
дзве зялёныя загадкі —
адшукаю ў іх глыбінях
люстраны адбітак мой...

* * *

З усмешкаю самотнай
зямлю абняўшы, ранак
малюе ўсюль палотны
атрамантам туману.
Над Свіслаччу маркотнай,
над дрэвамі, у парку
ўздыхае ціха Восень,
надзеўшы шаты-хмаркі.

І ў гэтых сум-уздыхах,
і ў вільгаці туману
ўсё вее адзінотай,
журбой самападману.

* * *

Пялёсткі ружы...
На стале, ля вазы...
І пах, даступны толькі мне адной...
Старонкі ў клетку...
Карычневаты сшытак...
Радкі... У іх — бы цень мяне самой.
Касеты ўсюды —
на ложку, на падлозе,
нібы кавалкі смутку і тугі.
Чаканне... Доўгае...
Мо ўсё-ткі на парозе
госць з'явіцца?..
Той, самы дарагі.

## Людміла
## ДАНІЛОВІЧ



*Нарадзілася ў 1979 г. у пасёлку Геок-Тэпе Ашхабадскай вобласці ў сям'і ваеннаслужачага. Да 1986 г жыла з бацькамі ў Венгрыі, з 1986 — у Докшыцах з бабуляй і дзядулем. Скончыла СШ № 1 і Докшыцкую школу мастацтваў (па класе фартэпіяна). Вучыцца ў БДУ на філфаку (беларуска-англійскае аддзяленне).*

*Друкавалася ў часопісе «Першацвет».*

## ШЛЯХ У ВЕЧНАСЦІ

Я пайду праз цябе, жыццё,
панясу ўвесь цяжар і боль твой —
і знайду праўды адкрыццё,
абмываючыся любоўю.

І пахрысціць сонца мяне,
позірк зорак стане прычасцем,
пакаяння слёзы мае
будуць сведкамі мудрага шчасця.

І, як крыж, боль Сусвету вазьму,
панясу яго я праз вечнасць,
новым сэрцам я веру прыму
ў справядлівасць і чалавечнасць.

Яркай стане свечка жыцця,
а ў той час, калі яна згасне,
прыйдзе ў свет гэты (веру!) дзіця,
каб прыняць і мой крыж, і прычасце.

## ТЭРЦЫНЫ

Дрэва пазнання дабра і зла:
пробліск жыцця.
Промні святла.

Рух адкрыцця.
Вечнасці зык.
Шлях забыцця.

Крыж для дваіх,
Праўды напой.
Мудрасці ўздых.

Толькі з табой.
Жаданне цяпла.
Клятва душой.

Гэта дрэва пазнання дабра і зла.

## АКРАВЕРШ

**К**ажу слова гэтае — і баюся:
**а** раптам, аддаўшы душу і цела, —
**х**аосу змрок спазнаць прымусіць
**а**шуканы лёс — і да долу зляцелым
**ю**родзівым лісцем я апынуся.

* * *

Абдымі мяне хутчэй, прытулі,
свечкі веры й надзей запалі,
мяккім шэптам праспявай казку-быль,
мае раны атуляй, каб забыць...

Марай сэрца мне сагрэй, супакой,
летуценняў дай хутчэй мне напой,
а душу акрый-схавай дываном.
Размаўляю зноўку я так са сном...

* * *

Я стаю пад начным небам
і размаўляю з Мілавіцай...

Яна — сведка майго згубленага шчасця.
Яна — чуе мае мары й памкненні.
Яна — дорыць душы шчырасць і пяшчоту.
Яна — грэе думкі ад позірку смерці.
Яна — шле мне веру ў жыццёвую сілу.

Я стаю пад начным небам
і размаўляю з Мілавіцай...
І яна здаецца мне бурштынавай слязой
майго раскрыжаванага кахання.

* * *

Балюча і горка.
Мяне ломіць жорсткі лёс.
Я — быццам светлая зорка,
што пакацілася-ўпала з нябёс.

Дрэнна і крыўдна.
Душа патанае ў слязах.
Я — снегавая глыба,
што заблукала ў халодных ільдах.

Сумна і цяжка.
Мае думкі лечаць крывёй...
Як жа мне страшна,
што шукае душа мая вечны спакой.

## НАЧНАЯ ЭЛЕГІЯ

Спіць спакойна зямля,
дрэвы сцішылі шэпт,
толькі месяц глядзіць
са здзіўленнем-журбою.

Я сяджу ля акна...
І лячу я ў Сусвет,
каб сустрэцца, хай нават і ў марах,
з табою.

Дзіўна ззяе Венера,
як погалас шчасця,

што, на жаль, мы зусім не змаглі зберагчы.
Толькі ёй я даверу
свой боль і няшчасце...
Зноў з бядою сам-насам сяджу я ўначы.

Яркі Сірыус цвёрда,
халодна-спакойна
працінае мяне зноў паглядам сваім.
Я гляджу ў яго вочы,
што свёцяцца горда
над маркотнай планетай, Сусветам усім.

Можа, зараз і трэба
пайсці на спатканне,
што падорыць мне сціплы й сумны Алькор...
Мо з Зямлёю расстацца
не толькі да рання,
ёй пакінуўшы ў спадчыну думку-дакор...

Напішу ўсім на памяць:
«Беражыце каханне!
Без яго немагчыма пражыць на зямлі!..»
І няхай мяне спаляць
агеньчыкі рання,
што над грэшнай планетай нячугна ўзышлі.

## МАЛІТВА

Стану на калені перад абразамі,
пацалую вуснамі Боскі крыж святы,
запалю я свечку дрогкімі рукамі...
Застануцца ў думках толькі Бог і ты.

Паліецца з сэрца шчырая малітва,
ручайкамі слёзы пацякуць з вачэй...
Прыгадаю шчасце, што даўно забыта,
і цябе, што стаў за ўсіх мне даражэй.

І даверу Богу я сваю надзею
разам з неадольнай горыччу-бядой...
Хай ён мае мары цеплынёй сагрэе,
хай адтае сэрца, збітае журбой.

Стану на калені, свечку патрымаю...
Аб адным я толькі Бога папрашу:
хай табе дасць шчасце і дапамагае,
і тваю ратуе грэшную душу.

## ЗНІЧКІ

Знічкі, далёкія, светлыя, чыстыя,
зззяеце вечнаю вы дабрынёй,
што далятае хваляй іскрыстаю,
радасць прыносіць нам, веру, спакой.

Вы ачышчаеце кожнае сэрца,
вы асвятляеце думкі надзеяй.
Позірк халодным ваш толькі здаецца —
ён нас нябачна ахоўвае-грэе.

## Ірына ДАРАФЕЙЧУК



*Нарадзілася ў 1969 г. у в. Чудзін (Ганцавіцкі р-н, Брэсцкая вобл.).*

*Скончыла Віцебскі ДПІ імя С.М. Кірава. Працуе настаўнікам матэматыкі й інфарматыкі ў Полацкай нацыянальнай гімназіі.*

*Выдала зборнік вершаў «Сцяблінка на лязе» (1997).*

* * *

Я разумею,
што бязмежны свет.

Што не ўтрымаю —
час табе ісці...
Але рука ўздымаецца
ўслед,
як у бабуль маіх, —
перахрысціць.

* * *

Бог мяне ад цябе бярог —
адварочваў з усіх дарог,
на якіх мог з’явіцца ты.
І разводзіў усе масты,
што мяне да цябе вялі.
І заносіў на край зямлі,
калі ты да мяне ішоў,
і нязменна вяртаў дамоў,
калі там не было цябе.
Час ляцеў, праплываў ці бег.
Не хапала ні слёз, ні слоў,
бо паўсюль цябе — не было...
Бог мяне ад цябе бярог —
як хацеў,
як умеў,
як мог.

## АХВЯРАПРЫНАШЭННЕ

### 1

Веі халодныя ноч апускае —
штосьці знікае.
Я не сапраўдная.
Я — не такая!
Штосьці знікае...
Штосьці знікае.

Самотнымі зоркамі
закалыхае
сны цішыня.
І пад промнямі горкімі
штосьці знікае.
Боль невыносны душу рассякае —
штосьці знікае!
Горыч ад вуснаў адводжу рукамі...
Штосьці знікае.

**2**

Я табою быць не хачу...
Знічкай да зямлі далячу.
Знічкай...
Каб самоту адчуць,

дастаткова птушкаю быць:
у вачах — жаданне забыць.
І на крылах — след барацьбы.

Знічкай — на халодны пясок:
уроссып вадаспад валасоў,
у вачах — сумнення лязо.

Птушкай — у халодны блакіт.
У вачах...
Не трэба рукі
падаваць. Бо ты — не такі.

Не такі, як знічка ўначы
ці крыло ў мяне на плячы.
Не такі... Таму памаўчы.
Ты — пясок. Блакіт. Ці свяча.
Мой спакой. Мой сон. Мой адчай
у вачах... А што ў вачах?

### 3

Я — не ты. Богі тут ні пры чым.
Памаўчым.
Я над кожнаю малой травінкай
плачу — расплятае жнівень косы.
Я табе заўсёды штосьці вінна:
сон, дарогу, верш, траву, нябёсы.
Я табе нясу заўсёды штосьці:
цішыню, аблокі, поўнач, веру.
Ты прыйшоў незапрашаным госцем
у маю халодную кватэру...

Ты — не я. Пра што тут гаварыць?
Трэба жыць.
Пражываць хвіліны, тыдні, годы...
Ты мне штосьці абяцаў заўсёды.
Пражываць — чакаць лістоў ці słоваў,
здзекаў вытанчона-адмысловых.
Весела юродствую ды светла
ці малюся злосна ды бязбожна...
Трэба жыць.
І трэба вечна ведаць:
ты — не я. Ніхто не дапаможа.

### 4

Добра сонным. Амаль што сляпым.
Я і Горад —
мы не спім, мы чамусьці не спім.
Мы — гаворым.

Пазірае мне Горад у твар
ліхтарамі.
Як апошні халодны ліхтар,
ноч згарае.

Як і я, гэты Горад збярог
летуценні.

Пазбаўляемся даўніх трывог,
нішчым цені.

Пазбаўляемся важных калісь
абяцанак.
Добра сонным — душа не баліць...
Хутка ранак.

### 5

І раптам
знічка
упадзе.
І неба апусцее.
Не пакідай мяне ў бядзе.
Не забірай надзею.

Бо я ж і ў сны твае прыйду
хаця б халоднай зданню.
Ты гэту знічку не шкадуй,
яна — тваё жаданне.
Яна зрываецца з нябёс
адно тваёй уладай...
Ах, мне б яе зайздросны лёс:
я — знічка, ты загадвай!..

### 6

Вось такімі й былі багі:
кожны — і галоўны, і адзіны.
Рэчкамі кіруюць берагі,
завірухамі кіруюць зімы.

Рэчкамі кіруюць берагі?
А вада заўжды змывае бераг.
Вось такімі й былі багі:
без цяпла, без жаласці, без веры.

Без агню, без страху, без душы,
без надзеі, без трывог, без лёсу...
Слухай, а табе не дрэнна жыць
богам, мною скінутым з нябёсаў?

**7**

Мая асірацелая душа —
як капішча, пакінутае Богам.
Яно яшчэ трымаецца спярша,
насуперак нягодам і трывогам.

Яшчэ святар устрымлівае ў ім
дыханне вогнішча ці бег крыніцы.
Але дыханне — гэта проста дым.
Але вадою нельга ўжо напіцца.

А потым — запусценне. І спакой —
як плата за сапраўднае служэнне.
Святар непаслухмянаю рукой
апошняе ахвярапрынашэнне
закончыць.
І не мае сэнсу больш
ні плакаць, ні служыць, ні проста верыць...
Душа мая, на сёння мы з табой —
пакінутае капішча Даверу.

**8**

Не смейся.
Ахвяру прынясу сама.
Сумею.

Складана?
Галоўнае — заўжды — маё
жаданне.

Так лёгка —
сама сябе. Самой сабе.
Твой клопат...

Загіну?
Але ж ахвяра — мне самой.
Багіня!..

**9**

Гэта ўсё няпраўда.
Не прыйду
да цябе ні ў радасці, ні ў смутку —
гордая.
Магчыма, на бяду.
Сны свае сама расхлёбваць мушу.

Гэта ўсё няпраўда, што цяпла
не хапае, каб запальваць зоры.
Я была! Ты чуеш?.. Я была?
Што ж маўчыш?
Чаму не загаворыш?

Бачыш, загарэлася ў акне
зорка. Дакранаешся рукамі...
Гэта ўсё няпраўда, што мяне
знішчылі,
бо знічкі не знікаюць.

Я прыйду, бо ў жылах хоць не кроў,
ды лягчэй ад гэтага не стане.
Проста так, па памяці старой
выканаю я тваё жаданне.

**10**

Ах, у цябе і жаданняў няма?
Штосьці змяняецца, думала, з часам.
Божа, якая дурная зіма,
што завіруху трымала абцасам.

Бачыш: рванулася, снегам у твар
кінула і паляцела на волю —

кветкі цвітуць, зелянее абшар...
Ці ж кіравала зіма?
Ну, даволі.

Я ўжо не ўспомню, з чаго пачала.
Хто я — багіня? жабрачка? царэўна?
Што — не была я?
Няхай — не была.
Проста — табой не была,
вось што дрэнна.

Як ні загадвай, як ні варажы,
толькі адно мне дакладна вядома:
можа, ты жыў, толькі — мною не быў.
Значыць — не бог, а сусед ці знаёмы.

## Наталля
## ДЗІВІНА



*Нарадзілася ў 1978 г. у Мінску. Пасля заканчэння СШ № 72, паступіла на факультэт журналістыкі БДУ. Вучыцца і працуе.*

* * *

Калі ў цесны ад болю пакой
уваходзіць нахабная цемень,
б'ецца пульс над прыціхлай душой,
і мяне застаецца ўсё меней.

Зазірне выпадкова святло,
усміхнуцца атрутна фіранкі,
і заб'ецца халоднае шкло
пад пякучыя свежыя ранкі.
Пагрубее ад старасці столь,
анямеюць драўляныя рукі.
І такімі ж, як гэты боль,
будуць раніцы першыя гукі.

* * *

Я трэснутыя нервы пакладу на шкло,
пасыплю зверху болем пасівелым.
А потым закрычу параненым святлом,
душу на момант раз'яднаўшы з целам.
А калі трэсне шкло і вернецца душа,
злаўлю настрой глінянымі рукамі.
І застануся той, кім я сюды прыйшла, —
у свет, дзе сэрцы гінуць пад нагамі.

* * *

Як мала засталося на зямлі вернасці!
Яе, быццам нябесную жывёліну,
трымаюць у клетцы й паказваюць за грошы.
Аднойчы мне прыснілася, што на яе месцы —
я. І надта позна зразумела: гэта быў не сон.

* * *

Прашу кахання...
Мяне зразумее толькі той, каго яно
аднойчы прапаліла наскрозь, забараніла
ўсміхацца жывому, надзейна схавала ад
гарачых сэрцаў і позіркаў.
Кахання прашу...
А мне ўпарта называюць цану.

Цану быццам бы прыгожай маёй абалонкі.
А душа, ужо зусім танная ад шматлікіх гасцей,
просіць не вечнага ўратавання,
а — хоць крышачку! — зямнога кахання.

* * *

Не хапае цябе... І за гэта
я сябе ненавіджу ізноў.
Новым днём, як бліскучым паркетам,
не сагрэць нерухомую кроў.
Мне б закінуць свой гонар далёка,
падысці, проста так падысці.
Ну, а потым падатлівым сокам
праз жыццё тваё прагна прайсці.
Дараваць, як дарує жанчына,
і забыцца падманлівым сном.
Усміхацца без пэўнай прычыны
і тварыць пад агульным святлом.
Толькі гэтай ілюзіяй простай
я жыву і спяваю яшчэ.
І сваёй адзінотаю вострай
прытупляю вар'яцтвы начэй.

* * *

Ноч згубіла апошні сорам
і пусціла цябе на парог.
Адарвалася неба ад зорак
і даслала свой немы папрок.
Я была і распуснай, і простай,
і ляцела паціху на дно.
Для любові кароткай і жорсткай,
як дзіця, адчыніла акно.
Толькі позна. Вар'яцкі вецер
разбурыў нечаканы парыў.
Мне ўсё роўна, што ў гэтым свеце,
бо ў маім — на жыцці разрыў.

* * *

Прывыкаю штодзень да скаваных пачуццяў,
быццам хворы, прыбіты да ложку надзей.
Мне лягчэй да сябе, да сапраўднай, вярнуцца,
чым дарэмна шукаць звышсапраўдных людзей.
Не чакае душа над жыццём перамогі,
бо аднойчы яе надламала жыццё.
Не чакаю і я нічыёй дапамогі,
толькі сценам даверу скупое ныццё.
І яшчэ адзін дзень, быццам шэрая пляма,
адбаліць, адляціць і загіне ў агні.
Толькі цень мой заплача над смешнаю драмай
і пацягне далей забыцця камяні.

* * *

Расціснуты яблык — расціснуты дзень
пад нагамі. Застылыя пырскі яго
шэрага соку ланцужком сышліся
на шыі. Тралейбуснае воблака падушкай
лягло на асфальтавы ложак. Халодны
прыпынак сочыць за мной напружана,
балюча і... натхняе мяне на адзіноту.

* * *

Я шукала цябе на разбураных вуліцах памяці,
як апошні прамень, за які мне трымацца ў жыцці.
У каменным дажджы маё сэрца цяпер растварaецца,
пад аховай яно — і па ім немагчыма прайсці.
Я шукала цябе, а знаходзіла цені забітыя.
І сябе пазнавала ў іх душах крывых і вачах.
Я звалілася ўніз, і вышыні, хлуснёю размытыя,
спачуваннем залізваюць раны — разгорнуты жах.
Я шукала... А хто адшукае мяне і адкрые мне
свет, дзе крылы — пачуцці любімых вачэй.
Гэту мару схаваю пад свежым трывалым інеем,
каб ніхто не заўважыў, што я не кахала яшчэ.

* * *

Я пакіну ў тваім маленькім палацы
сумна-звялую кветку — алоэ.
Каб яе калюча-зялёныя пальцы
цалавалі жаданне тваё любое...
Я пакіну на гэтай параненай кветцы
пацалунак усмешлівых вуснаў.
А на вуснах запаліцца мокрае сэрца —
дождж пачуццяў маіх распусных.
Я пакіну ў тваім маленькім палацы
ціхай ночы вар'яцкія крыкі.
І спытаю, калі давядзецца спаткацца:
«Пабудуем палац вялікі?»

## НЕЗНАЁМЦУ

На твары тваім танцавалі трамвайныя ноты.
Пярэстыя вочы людзей пілавалі паветра.
А постаці нашы імкнуліся да адзіноты.
А вокны зачынена плакалі стомленым ветрам.
Адзін аднаго не пазналі — і толькі прыпынак
адчуў, як агеньчык бяссілля зваліўся на крылы.
І капала ў душы пахучая мёрзлая гліна,
і рукі калючую хустку сціскалі ды нылі.

## Іна
## ДЗІЧКОЎСКАЯ



*Нарадзілася ў 1979 г. у в. Кажушкі на Случчыне. Скончыла Мінскі дзяржаўны лінгвістычны універсітэт (спецыяльнасць: беларуская і нямецкая мовы й літаратуры)*

*Друкавалася ў часопісах «Першацвет», «Гаспадыня» і газеце «Слуцкі край».*

* * *

Сум. На здымкі гляджу я —
пазіраеш з іх ты.
Ні аб чым не шкадую,
не палю і масты.

Не малю аб вяртанні,
п’ю самоту набгом...
Нібы ў вочы каханню.
зазіраю ў альбом.

* * *

Чалавек жыў на свеце.
І ён жыў для людзей.
Пра сябе ён не думаў.
дбаў пра іншых часцей.

І ён стукаўся ў душы,
хацеў сеяць святло,
дарыць шчасце і радасць,
праўду, ласку, цяпло.

Але сэрцы людскія
раставаць не спяшалі,
былі нават такія,
што яго праганялі.

«Усё роўна — люблю вас!» —
яго вочы крычалі.
Ну, а людзі — глядзелі.
Ну, а людзі — маўчалі...

А калі чалавека
на свеце на стала —
тады ўсе зразумелі,
чаго ім не хапала.

* * *

Ты шукаў мяне доўга-доўга.
Ты па сэрцах блукаў чужых.
Ад далёкіх часоў Міндоўга
многа жыццяў паспеў пражыць,
каб са мною цяпер сустрэцца,
паляцець у далёкі Сусвет,
каб паслухаць біццё майго сэрца,
скласці першы няўмелы санет.
Ты прайшоў праз вякі й стагоддзі —
пакланіўся палям і лясам.
Будзем жыць у каханні й згодзе...
І ты ў гэтым упэўнішся сам.

* * *

Чаго толькі не дасягнуў ён —
цераз ваду прайшоў, агонь!..
І цяжкі медных трубаў звон
пераадролеў яго конь.

Спазнаў напасці, гора, страты,
марнеў у голадзе, бядзе
цяпер да шчасця і да свята
ён так упэўнена ідзе.

І хай з нястачамі жылося —
гатовы быў ён да ўсяго...
Але ж — каб цяжка не прыйшлося,
то ці дамогся б ён свайго?

* * *

Я хацела б уславіць Радзіму,
але што я скажу пра яе?..
Ад паўсюднага слоўнага здзіву
ёй не будзе лягчэй, як і мне.

Напісаць, як яе руйнавалі,
як святое затоптвалі ў бруд?
Як шматалі, крышылі, ірвалі
і цягнулі ў замежны свой кут?

Як людзей папіхалі горш быдла?
Як сціскалі на шыі каўнер?..
Божа! Як гэта ўсё ўжо абрыдла:
беларус — быццам спуджаны звер!

Дык чаму ж так Айчыну не любім?
Чаму моваю грэбуем так?
Ой, загубім, усё мы загубім,
што пакінуў народ наш — мастак.

Калі ж гэтага сэрцам не ўчуць нам,
не прыняць набалелай душой,
то і словы свае, і пачуцці
будзем зноў афарбоўваць маной.

* * *

*С. В.*

Я так баюся Вас згубіць!
Мне страшна Вас пусціць на волю!
О, Божа мой, што мне рабіць?
Я так пакутую ад болю.
Мне вельмі крыўдна, што другой
сваю падорыце Вы ўсмешку,
я так баюся, што смугой
да Вас зацягне раптам сцежку.
Мне б Вас украсці, не пусціць —
і не было б мне лепшай долі...
Я так баюся Вас згубіць,
бо Вы заўжды былі на волі.

* * *

Скурыў адну цыгарэту,
за ёй — другую пачаў...
І ён не рады быў свету,
і ён курыў і маўчаў,

бо ўсё адышло ў пустое.
Нічога ён не зрабіў.
Кагосьці не супакоіў,
кагосьці не далюбіў.

Жыццё пісаў чарнавое:
нашто спяшацца дарма?..
Цяпер глядзеў у былое —
для заўтра ж часу няма!

## Вольга
## ДРАЗДОВА



*Нарадзілася ў 1979 г. у Мінску. Скончыла Беларускі гуманітарны ліцэй (1996) і журфак Белдзяржуніверсітэта. Працуе ў «Народнай газеце».*

*Друкавалася ў «Першацвеце» і «Маладосці», у «Чырвонай змене» і «Народнай газеце».*

### ЛІСТАПАД

Кажуць, сумны месяц — лістапад.
Толькі я чамусьці не сумую
і дарую ўсё табе, дарую,
бо ўжо ён не вернецца назад,

гэты сумны месяц лістапад.
Толькі я чамусьці не шкадую,
што ўжо ён не вернецца назад.

* * *

Першы лёд — магчымасць усміхнуцца,
але ж усміхацца я не стала.
Даў мне лёд магчымасць паслізнуцца —
і я ўсё выдатна скарыстала.

* * *

А на вуліцы — зноў туманы.
У начы глухой наш горад заціх.
Як пазбавіцца ад гэтай маны —
туманоў пяшчотных словаў тваіх:

Неба шэрае не спіць над зямлёй,
сакавік перасварыўся з зімой,
а па вуліцы плывуць туманы...
Як пазбавіцца ад гэтай маны?

## НЕБА

Вераснёвае неба здалося далёкім і блізкім,
бо, раскінуўшы сінія крылы, ляцела над Мінскам.
І апошняе лісце на дрэвах яшчэ шапацела,
а яно не зважала і ціха кудысьці ляцела.

* * *

Ноч кароткай была, быццам казачны сон.
Цалавалася мора з пяском бурштыновым.
Ты шаптала замовы адвечнае словы.
Быў ля вогнішча недзе з сяброўкаю ён.

Ты хацела русалкай прыгожаю стаць,
каб не зносіць кахання сляпыя пакуты.
І збірала ты зёлкі яму на атруту
па адвечным рэцэпце вядзьмаркі Біруты,
каб яго прыгажосцю сваёй счараваць.

* * *

Дзе растуць журавіны, у дзікім лясным гушчары,
дзе вавёркі-гарэзы штодзённа збіраюць арэшкі
і вясёлыя песні спявае крумкач на зары, —
старажытнага замка пабачыць вы можаце рэшткі.

Захаваўся ён цудам з далёкіх часоў старадаўніх,
нават людзі старыя аб ім ужо ўсё забываюць.
Там жывуць толькі птушкі лясныя і страшныя здані,
толькі прывіды ўночы па замкавых рэштках гуляюць.

«Так мінаецца слава». Калісьці багаты і слаўны,
ён вядомасць вялікую меў і пагрозу сабой уяўляў.
Не адзін тады лад памяняўся ў краіне дзяржаўны,
але замак трывала, спакойна і грозна стаяў.

І цяпер ён стаіць, нібы волат, пакінуты ўсімі,
і, абняўшыся з лесам, ён спіць зачарованым сном.
Пасярэдзіне возера вокам паблісквае сінім,
дзе прытулак няшчасным давала гасціннае дно.

Час даўно той мінуўся, ад нас адышоў ён далёка,
сцёрся ў памяці, быццам яго не было.
А паданні аб замку ўзляцелі кудысьці высока,
дзе ніводнае птушкі яшчэ не ўзмахнула крыло.

**Ганна**
# ДУБОВІК



*Нарадзілася ў 1980 г. у в. Верамейкі, што ў Чэрыкаўскім раёне на Магілёўшчыне. Жыве ў Глуску, скончыла сярэднюю школу №1.*

*Друкавалася ў калектыўных зборніках «З надзеяй, верай, любоўю» і «Паэтычная Глушчына» (1996), у часопісе «Першацвет».*

## НАВАЛЬНІЦА

Апошні пробліск. Неба гасне,
вось ужо зорачка ўзнялася,

туман паўзе ад рэчкі шпарка,
трава расою ўжо ўзялася.

А ноч пакрыла чорнай хусткай
палі, азёры ды рачулкі,
і з хмары, што ўзляцела хутка,
грымоты сыплюць пошчак гулкі.

Маланка бліскае ў аконца
і асвятляе наваколле —
здаецца, гэта промень сонца...
Дрыжыць разбуджанае голле.

Ну, а пасля спакойным ранкам
шуміць пад ліпамі крыніца.
Дзе ж, як не ў краіне партызанскай,
такая будзе навальніца?

## ЛЕТНІ ДОЖДЖ

Летні дождж — за акном, на дворы...
Нараджаюцца кроплі ўгары,
на далоні ляцяць, пырскі сыплюць,
сонца промні пасля кроплі вып'юць.
І вясёлка ў нябёсах заззяе,
салавей зазвініць-заспявае,
заспявае і сціхне. Уранні
пасля сну сонца велічна ўстане,
афарбуюцца чырванню хмары,
панясуць за сабой мае мары...
Гэта — потым. А зараз квяціста —
бы ўпусціў сам пан Бог маністы.
Мара ў небе іскрыцца, іграе —
бы купальская зёлка начная.

## АСЕННІ ВЕЧАР

На лістоце — кроплі,
на траве — расінкі,
падаюць з нябёсаў
дробныя дажджынкі.

То ж асенні вечар —
надыходзіць рана,
месячык схаваўся,
у нябёсах хмарна.

Паглядзі ў акенца,
месяц сінявокі!
Прагані з нябёсаў
шэрыя аблокі!

Мільгацяць хай зоры
ды на цёмным небе
будуць хай узоры:
у вырай птушкам трэба.

Выйду паглядзець я
белы шлях птушыны,
зорак мільгаценне,
месячык мой сіні...

## ПАМЯЦЬ

Беларусь! Ты — крыніца памяці!
Кожны куток — бы легенда жывая...
Белая Вежа ў цемры хаваецца,
стаіць Каложа, як свет, старая.

Кожны будынак, кожная вуліца
нам праз вякі сваю памяць нясуць.

Замак на беразе Нёмана туліцца,
і туманы над палацам плывуць.

Шэптам вады свае казкі расказвае
Нарач — душа Беларусі маёй.
Мір і Нясвіж дакараюць-даказваюць:
памяццю нашай на свеце жывём.

* * *

Колькі разоў з берагоў Дзвіны
людзі свет пазнаваць хадзілі?
Звалася Беларусь тады —
край Літва, а народ — ліцвіны.

Колькі подзвігаў здзейсніў народ
з Прыпяці, Пцічы, Беразіны?
Колькі разоў гаварылі ўсім:
«Мы ліцвіны — людзі з Літвы!»

Колькі разоў нашу зямлю
боты чужынцаў ліхіх тапталі?
«Гэй, браткі, абаронім Літву!» —
клічам гэткім народ збіралі.

Гэй, і цяпер даўні кліч пачуйма!
Не да канца ж наш народ забілі!
З калень устаньма! Свой дух гартуйма!
Мы ж беларусы — мы ж ліцвіны!

* * *

Шкада, што людзі не птушкі,
што ў неба яны не ўзляцяць,

што толькі з свайго акенца
на хмары, аблокі глядзяць.

Што не кранаюць аблокаў
імклівыя, лёгкія крылы,
што зверху не можам пабачыць
зялёныя летнія нівы.

Што ў лесе на дрэва сесці,
аб будучым паспяваць
не можам...
Аб тым мы вечна
асуджаны шкадаваць.

## Андрусь
## ДЫЛЮК



*Нарадзіўся ў 1971 г. у Мінску. Скончыў эканамічны універсітэт.*

*Друкаваўся ў «Першацвеце», «Чырвонай змене». Выдаў кнігу вершаў.*

### МАЛАДЫМ ПАЭТАМ

Шукайце чысціні.
Яе нясіце люду.
Бо на зямлі без вас
паўсюль хапае бруду.

Нясіце дабрыню,
спагаду і павагу.
Не трэба нам хлусня,
пагарда, зайздрасць, звягі.

* * *

Храм зруйнавалі, а веру — не знішчаць.
Кветкай яна прарасце праз бетон.
Вера ўзрасце на пустым папялішчы.
Вера ніколі не здасца ў палон.

* * *

Сэрца не трымціць.
Не маўчыць надзея.
З Богам не ў бядзе я —
з Богам хачу жыць.

Без Хрыста ніяк
жыць я не жадаю.
Шчасце ў свеце маю:
я Хрысту — сваяк.

Па Яго Крыві
праз стагоддзяў далеч
сваякамі сталі.
З вераю жыві!

## ДАДОМУ

Зорачка ясна,
ты свяці нязгасна.
У небе знічка,
знічка-невялічка.
Мне, маладому,
трэ хутчэй дадому.

У небе знічка,
знічка-невялічка.
Са святой крыніцы
вып'ю шчэ вадзіцы.
У небе знічка,
знічка-невялічка.
Хай выводзіць сцежка
гаю ўскрай абмежкам.
У небе знічка,
знічка-невялічка.
Знічка-маладзічка,
што ты мне міргаеш?
Не міргай, бялютка,
дома буду хутка.

* * *

Вясна нам заспаныя вочы расплюшчыць,
але амарокаю зноўку засцеле.
Ды ветрыкам думкі крыху расцярушыць,
якія зімою марознай здранцвелі.

Вірутнаю праўдаю сопат разгоніць
той дзень, што вясновым жыццём каласуе.
Ды немачы й раны нам хутка загоіць
і промні надзеі й святла падаруе.

## НАЦДЭМЫ

Мы не з тых, хто шукае цяпла і спакою,
калі край наш рабуюць, калі — слёзы й кроў...
З тых, каго сустракаюць свінцовай чаргою,
хто жыццё без разваг аддае за сяброў.

Дрот калючы адзін нам вянком на магілах
здраднік-лёс рыхтаваў, але лёсу на злосць,

калі толькі пульсуе яшчэ кроў у жылах,
спеў імкнецца ўгару, хай з прабітым скрыдлом.

Беларусь! Ты — наш лёс. Ты — жыццё і спакуса,
грэшны рай, дзіўны сон. Ты — каханне і боль.
Хай дрыжыць і гарыць зноў душа беларуса,
хай загоіць нам раны гарачая соль.

## ПЕСНЯ

Не загубляй, прабач мае правіны!
Я веру ў літасць і Тваю любоў,
бо выцягнуў з грахоўнае багніны
і ў гэтым свеце Ты мяне знайшоў.

Твая любоў, як сонца, ярка свеціць.
Душы збаўленне — гэта вечны дар.
Як цяжка без Хрыста на гэтым свеце.
Ісус, Ты — мой навекі Валадар.

І хто ў Хрыста Ісуса верыць шчыра —
той праз Яго ў нябесны прыйдзе край.
Хто сэрца мусіць для любві пашырыць —
таго пакінуць скруха ды адчай.

**Віктар**
**ЖЫБУЛЬ**



*Нарадзіўся ў 1978 г. у Мінску. Скончыў філфак Белдзяржуніверсітэта.*

*Літсупрацоўнік часопіса «Першацвет». Аспірант БДУ.*

*Выдаў кнігу «Рогі гор».*

## ЗОРКА № 40

Абапіраючыся на вясёлкавыя парэнчы,
трымаю падхватнік для лоўлі зорак.

— Скіньце мне, калі ласка, ярчэйшую —
тую, што пад нумарам сорак!

Я ўбачыў свой паласаты адбітак
на канцы кожнага яе праменьчыка.
Зямля — пакінуты стары абутак
для кожнага вывіхнутага экскаватарам карэньчыка.

Маё цела нагадвала раскапаную траншэю,
з якой зручна абстрэльваць гусенічныя танкі.
А душа высоўвалася, прыкладна, па шыю
і хавалася назад, просячы паратунку.

Я лупцаваў пугаўём вош,
якая поўзала па маёй шчацэ.
І вада мітуслівa сцякала па руцэ:
ішоў дождж.

* * *

А вы бачылі калі-небудзь вочы
чалавека, якога ўдарыла токам?
Яны блішчаць, нібыта дзве поўні ўночы,
небатвар заліваючы гарачым сокам.
А вы бачылі калі-небудзь вусны
чалавека, якому перакрылі дыханне?
Яны варушацца, быццам чырвоныя вусені
на зялёным лісце.
Яны просяць кахання.
А вы бачылі калі-небудзь пяткі
чалавека, які хацеў заскочыць на неба,
але яго змылі ўніз моцныя ападкі?
Не бачылі?
І не трэба.
Не трэба.

* * *

Таму, хто народжаны лётаць,
поўзаць не заўсёды дадзена.
Няхай жыве і квітнее балота
ды поўзаюць там розныя гадзіны!

А паэтаў вабіць прастора.
Паэты бягуць за пегасамі.
Яны мараць, каб нехта іхнія творы
прачытаў і сказаў: «Не фігá сабе!»

Але часта замест летуценняў
у мазгах ціха боўтаецца рэчыва шэрае.
І здаецца тады, што натхненне —
гэта толькі расколіна ў чэрапе.

## КУВАЛДАМЕТРЫЧНАЯ ФУНДАМЕНТАЛЬ

Паглядзіце за далягляда лінію:
там стаю ў даліне я, алюмініевы
касцяк —
крыху наўскасяк,
але электрагірляндамі аплецены.
Можаце пачапіць на мяне сцяг,
патапіць мяне ў барабаннай квецені.
Хай дзьме віхор
па-над вежамі драпежных гор!
Я ілбом лавіў з неба гантэль,
я бадаў калоны белай капітэль,
імхом зялёным я засеяў сталь —
вось вам мая
кувалдаметрычная фундаменталь,
мая квадрасферычная лабірынталь!

Іскра скразняковая знікае над горадам,
падвешаным дагары

за шнуры бікфордавы,
быццам меч дамоклаў
над пятой ахілесавай.
Жыхарам прамоклым
усё ад страху здаецца бэзавым
у гэтым летаргічным трансе
транспарантнай літургіі,
у гэтым хірургічным пасьянсе
транспартнай металургіі,
дзе дакладна падагнаная
да кожнай дэталі дэталь —
вось вам мая
кувалдаметрычная фундаменталь,
мая экзаскапічнаяанументаль!

## ПРА КАРЛСАНАЎ...

Зубамі, раз’етымі карыесам,
кусаючы срэбныя хмары,
ляцелі па небе Карлсаны.
А можа, ляцелі Ікары.

Ці крылы ў іх, ці прапелеры,
ці адно і другое разам...
Ляцелі яны ды рыпелі ры-
сорамі непадмазанымі.

З упартасцю камсамольскаю
яны адляталі ў вырай.
Было ў іх штосьці анёльскае,
поўнае велічы й міру.

Аўтобусамі «Ікарусамі»
запоўненыя магістралі...
А ў небе — Ікары й Карлсаны
лятуць у бязмежныя далі.

* * *

Узняўшыся духам над пухам і прахам,
з размаху адкінуўшы дзверы барака,
глыбей удыхнуўшы вясновыя пахі,
пачуеш, што кажа нябесны аракул.

А недзе ў зямлю забіваюцца палі,
шторaз замяняючы грукат курантаў.
Цкуюцца ланцужныя мопсы-трамваі.
З-за фабрыкі выпаўз жалезны тарантул.

Твой цень, захістаўшыся, грукнецца долу,
прабіўшы асфальт шасцітонным цяжарам.
А ты падфутболіш вядро талуолу,
разліўшы бензін пад неонавай хмарай.

* * *

Я лётаю неўтаймаваным вясёлым полтэргейстам,
гуляючы ў хованкі з подыхамі шумлівых вятроў;
я гарэзліва цягаю паветраных змейчыкаў за хвасты
і лагодна гладжу супраць поўсці калматыя аблачынкі;
зрэдзьчас я спускаюся ніжэй — да горада —
і бессаромна заглядаю ўва ўсе адтуліны,
імкнуся навылёт праз утульныя жылыя карпусы
камфартабельных раёнаў шматпластовага мегаполіса.
Я выдзіраю з забур'янелых пакінутых доўгабудоў
іржавыя сталёвыя штыры;
калі злачынцу ўдарыць імі пяцьдзесят разоў па пятках,
яго можна лічыць пакараным.
Але я не хачу нікога чапаць,
бо ніхто не здольны зачапіць мяне.
Я палячу да бліжэйшага высакавольтнага слупа
і павісну на правадах уніз безгалоўем,
удыхаючы іскрысты водар дэзадаранту «Вясна».

## YHUMUS

Каб лётаць у тоўшчы зямлі,
патрэбны жалезныя крылы,
у якіх замест пер'я — пілы,
што рэжуць тоўшчу зямлі.

Каб лунаць у тоўшчы зямлі,
неабавязкова быць лёгкім ды бязважкім
і ведаць на памяць фігуры вышэйшага пілатажу.
Неабавязкова браць з сабой парашут
з разлікам на тое, што галава будзе дакранацца
да зямной паверхні раней за ногі.
Лепей ужо захапіць запаснае тулава!
Вось расплюшчыш вочы — і адчуваеш,
што заблытаўся ў павуцінне,
толькі замест нітак — спляценні дробных карэньчыкаў
з ружовымі землянымі чарвякамі.
Увогуле, верхні пласт глебы
вельмі густа населены рознымі мікраарганізмамі.
Іх нават можна пабачыць,
калі яны пачнуць запаўзаць за памідоры вачэй
ды скакаць па зрокавых нервах.
І тады ты адчуеш сябе лішнім
сярод гэтай высокамалекулярнай масы
прадуктаў распаду арганічных рэшткаў...

Каб лётаць у тоўшчы зямлі,
патрэбны жалезныя крылы,
патрэбна магутнае рыла —
даўжэзны лыч адмысловы,
лыч не свіны, а свінцовы,
акраплёны вадою свянчонай,
разведзенай з ацэтонам, —
каб лётаць у тоўшчы зямлі...

## ВЯСНОВЫ ВЕЦЕР

Вясновы вецер у маёй галаве
ўвайшоў у стадыю нічоганеўсведамлення.
Каханне праляцела птушкай вакол мяне
і села на пахілым дрэве.
Вецер перабіраў карчалапісты клавесін
чорных галінаў.
У суседнім двары
развалілася старая галубятня.
Дах неба апускаецца ўсё ніжэй
і хутка можна будзе весела забрахаць
і адкусіць ад яго кавалачак
памерам з паліраваны карунд.
Надыходзіць час, калі развязваюцца марскія вузлы
на звілінах нашых мазгоў.
Я падуладны пачуццям,
якія мараць быць падуладнымі мне.
Я сніў расколаты мікрасусвет
і з цікаўнасцю заглядаў у ягоную расколіну
трохкутным вокам, што выплыла з-за дзвярэй
і выдыхала з сябе празрыстыя песні.
Ідучы па гетынаксавым мосце,
адчуваю,
як ногі мае робяцца
паралонавымі.

## УСЁПРАНІЗЛІВАЯ ІЛЮМІНАЦЫЯ

Стрэлы промняў ліліся з разеткі
цераз грані аргонавай прызмы.
Зіхацелі нервовыя клеткі
фасфарычнага арганізму.
Феерычнага феерверку
фіялетавыя фантаны.
Лямпы, лазеры, лінзы, люстэркі
адбівалі агонь апантана.

Шпаркі ток прапаўзаў па антэнах,
што тырчалі ў ста экземплярах.
П'яны ток разліваўся па венах,
па артэрыях і капілярах —
чорна-белых і каляровых,
проста круглых і васьмігранных.
У прабірцы двухсотлітровай
ясна панна прымала ванну.
Ясна панна прымала ванну
ў віравальні бетонамяшалкі
ў неабсяжным замілаванні —
пазайздросцілі б ёй русалкі,
пазайздросцілі б аквалангісты,
што ныраюць у рэчку ля шлюзаў
у ваду, амаль што празрыстую.
Пазайздросцілі б нават музы,
што заўсёды ў паветры ляталі
ды няспынна шукалі паэтаў.
Пазайздросцілі б воблакі й далі,
пазайздросцілі б людзі й сусветы.

## Арцём
## КАВАЛЕЎСКІ



*Нарадзіўся ў 1979 г. у Мінску. У 1996-м скончыў гуманітарнае аддзяленне Ліцэя пры БДУ. Цяпер — студэнт журфака БДУ. Друкаваў у часопісе «Першацвет» вершы й апавяданні.*

### ЗІМОВЫ ВІЗІТ

Дом мой
пахне старым цынамонам,
скарынкай цытрыны зялёнай
і скавышом з падваконня

зімовым.
Сёння,
прынамсі так — сёння.

Я не сагрэтай далонню
кранаю прасторы —
твае валасы, быццам
хвалі ў заснежаным
полі.

Адвольна
не адчуваю
прысутнасць
нашых з табою
адсутных размоў
у сціплым пакоі.

Свавольнымі
нашы паводзіны
стануць, відаць,
праз стагоддзі.

Ідзі.
Керамічныя поўныя
кубкі
ўжо схаладнелі,
састылі.

Сталі такімі
празрыстымі
словы жагнанняў —
жаданняў
шкельцы апошнія
ў жменю
збіралі.

* * *

Барані
мае
карані.
Барані,
як каралі
свае.
І рабінавы
сок
дапі.
Барані,
небараку,
мяне.
Захавай
свой засцюжаны
крык.
У кішэню
руку
пакладзі
і знайдзі там
заржаўлены
цвік.
І маё нешта
там знайдзі.
У нябёсах
ізноў
маладзік
лустай
жоўтаю
песціць
падман.
Сваю поўсць
ноч
разгортвае
нам,
нібы верным
сябрам —
кажанам.

## ВЕРАСЕНЬ

Не зразумееш
холад пальцаў.
І ў маім пакоі —
холад,
вачэй замёрзлы пагляд,
танцы,
якімі вар'яцее
горад.
І я
не зразумею
пальцаў
паўзледзянелых,
паўжывых.
І не пачую
рытмаў танца,
якімі вар'яцее
слых.

## БЭЗАВАЕ

Бэзам...
Бэзам замучаны,
а мо засмучаны?..

Цёплымі кветкамі
крыжападобнымі,
штучнымі.

Цёплымі сведкамі
светлага стану
прыручаны.

Ведае хто.
можа, з імі
заручаны?

Ценем ахутаны
ціхага вечара
вечнасці.

Цернямі млечнасці
раптам размазаны
ў шэрасці.

Бэзавы…
Бэзавы прысмак
у прыкрасці.

Сціпласці сымбаль
ужо непрыкметнае
літасці.

## Вольга
## КАЛЕНІК



*Нарадзілася ў 1983 г. у Полацку. Скончыла СШ № 14 і ў 1999 годзе паступіла на філалагічны факультэт БДУ.*

*Друкавацца пачала з 1995 года. Яе вершы ўвайшлі ў зборнік рэгіянальнага літаратурнага аб'яднання «Наддзвінне».*

* * *

Спакусліва-яблычны жнівень
заззяе і ўдарыцца ў сонца
чароўнаю спелаю песняй.

Шчодры бурштын у далоні
выльецца дымным світаннем
з дазволу маўклівага Спаса.

Хмарная квецень нябёсаў
зблытае срэбным дажджом
сны пераспелага жыта.

Святам загоіцца сэрца
і птушкай заб'ецца ў акно,
у якім адбіваецца неба.

## КАЛЯДЫ

Месяц ахвярны з хмар —
востры казіны рог,
стрэлаў мядзвяны жар
на залатых мастох.

Колам разбітым час
валіцца пад гару,
дрэвы ў чаканні нас
неба галлём аруць.

Покуль снягі шчэ спяць,
нам на крыжы дарог
скажа сваё імя
строгі двухтвары бог.

* * *

Заплюшчы
вочы.
І падмані гэту ноч.
Дазволь паміж пальцаў цячы
струменям
дажджу яе валасоў,
абдымі
яе адзіноту
праз атласную вільгаць змроку,
не замінай
цалаваць цябе
тысячам зорных паглядаў...

Заплюшчы вочы.
І падмані
закаханую ноч.
І яна,
прыкутая тонкім пяром,
памрэ на паперы
вытанчанай духмянасцю
пульсуючага верша,
прысвечанага
іншай.

* * *

Раскоша няведання.
Містыка сноў.
Рызыка веры.

Пачакай мяне,
не слухай адзін
мой аповед.
У ім на даляглядзе —
крывавая скіба сонца,
адкроеная лязом вады.

Пачакай —
мы разам пачнем
пра бяздомную казку,
што туліцца да замшэлых
каменняў...

Возьмем у рукі —
яна знерухомее.
Выпусці!..
Чуеш,
у здзічэлым спакоі
карэнне спявае...

Не чапай попелу —
нам з яго паўставаць...

* * *

Добры вечар ды шчодры вечар.
Перапоўніў тугой кватэру.
Вар'яцелі мільёны свечак
у разбітым маім лястэрку.

Хай трывога ля сэрца стане.
Быццам постаць у строі чорным —
калі ведаеш, што каханы,
дык няважна, хто наканаваны.

Хай не будзе твой вечар горкім.
Хай ён будзе святым ды шчодрым.
Я чакаю цябе заўсёды
ля наступнай каляднай зоркі.

## Аксана
## КАМІНСКАЯ



*Нарадзілася ў 1982 г. у Маладзечна. Вучыцца на філфаку БДПУ імя Максіма Танка.*

* * *

Восень пейзажы малюе
пэндзлем зжаўцелай лістоты.
Гэта заўсёды хвалюе —
дорыць і сум, і пяшчоту.
Ціха. Маўчыць нават вецер.
быццам пра чэрвень успомніў.
І, як прыгадка аб леце, —
сонца апошнія промні.

* * *

Сёння — свята ў душы... Раптам
з крыжа ўздымаецца мара.
У свядомасці зноўку мроі...
Розум? Ён амаль не са мною —
трапяткім уцякае ценем...
Я святкую Уваскрашэнне.

* * *

Гэтыя драпежныя пальцы раніцы...
Яны зноў гвалтоўна
разарвалі цябе,
і ты плачаш...
Не плач. Забудзься пра боль
і прыйдзі да мяне.
Памятаеш,
як нам добра было ўдваіх?..
Я чакаю цябе, мой сон!

* * *

Сумна ўсведамляць,
што кожны наступны дзень —
гэта ўсяго толькі
чарговая прыступка
на доўгай лесвіцы нябыту.

* * *

Няяснае мроіва мар
захінае рэальнасць.
І думка за думкай
губляецца ў цёплай смузе.
Мой розум крычыць ашалела:
«Не, я — не рамантык!»

А ціхае сэрца
нямую нязгоду нясе.

* * *

*Жизнь наказала, видно, не зря*
*Долгой памятью всех.*
*І. Талькоў*

Гульня ізноў у хованкі з мінулым.
І перамогі марнае жаданне.
А памяць мае думкі пацягнула
туды, адкуль няма, на жаль, вяртання.

Нясуся над каханнем, шчасцем, болем
празрыстым, лёгкім прывідам няспынна.
І, у чарговы раз адчуўшы волю,
мой розум разбіваюць успаміны.

## Мікола
## КАНАНОВІЧ



*Нарадзіўся ў 1965 г. у в. Вострава на Слонімшчыне. Скончыў філфак БДУ. Жыве ў Слоніме і працуе настаўнікам у СШ № 8.*

*Друкаваўся ў «Першацвеце» і «Маладосці».*

* * *

Ад мяне патыхае безданню
нязведанага сусвету.
Я ўяўляю скінутую
з неба быццям камету.

Лячу. Гару. Не згараю.
Канаю — і не сканаю!
Небу нябачна краю,
як дарогі да пекла і раю.
А галактык галодных зграя
мяне есць — але не з'ядае.

Не прымае Зямля святая
чорны выбух і крык адчаю.

## НАДЗЕЯ

Разарву я лісты недапісаных вершаў.
І знявечу душу, што не хоча маўчаць.
Буду ў гэтым, вядома, банальным, не першым,
хто сябе асудзіў назаўсёды канаць...
З нежадання ўставаць пачынаецца дзень мой
(трэба мне адстаяць за кавалкам чаргу).
Так штодзённа сабе прышчамляю я нервы
і кажу, што жыву, і кажу, што магу.
Кожны дзень назіраю стамлёныя твары.
А яны, як люстэрка, з адбіткам маім.
У вялікім натоўпе імчаць янычары
на сустрэчу з аблiччам і імем сваім.
Так здаецца мне, мроіцца гэтак вось часам.
Тыя мроі даюць яшчэ сілы трываць,
а інакш я не мог бы з адчаем паяца
мітусні звар'яцелай жыццё аддаваць.

## СОН

Мне здалося, што груша няўзнак расцвіла,
сакавік за акном белым сном апрануўся.
Мне праз шыбу акна гэта казка відна,
ды не ведаю я, ці прачнуўся.

Помню, вецер так выў у застрэшшы, бы воўк,
і апоўначы сон не прыходзіў.
На канапе я марна шукаў пяты бок —
думак сумных мной рой верхаводзіў.

І паверыў на міг: будзе вечнай зіма,
гэты вецер і ноч без надзеі,
а камп'ютэр сусвету — мая галава —
захлынецца ў бялюткай пасцелі.

# Station

# Станіслаў
# КАРПАЎ



*Нарадзіўся ў 1983 г. у Мінску. Вучыцца на філфаку ў Белдзяржуніверсітэце.*

* * *

Спрабуючы не лезці ў канфлікты,
я набываю якасць няўдзелу.
І ад самоты цешуся вердыктам:
«Ашчадны банк смяротных нерваў цела».
Гартаючы цікавыя старонкі,
скруціўшыся ў кутку свайго фатэлю,

я адчуваю, што ўтвараю звонку
не лепшыя эстэтыкі мадэлі.
І пэцкаю паперы ў акварэлі,
і веру ў геніяльнасць гэтых плямаў —
усюды мусіць быць свой Цэрытэлі,
а з ім — набор сваіх нядобрых планаў.
І бачу праз акно старыя гмахі.
І адмаўляю часу здольнасць зменаў.
Памру — і зноў убачу тыя ж жахі.
Каб параўнаць, я намалюю сцены.
І гэты аркуш я ўсталюю ў раму,
пасля ўладкую на сцяне кватэры...
Акенца з фарбаў з выхадам на краму
перакрывае жоўтыя шпалеры.

* * *

Мяне даганяе і цягне з сабою
каменнае лісце.
Ратунак шукае свайму неспакою
надзейнае выйсце.
Ляжаць пад нагамі, ляжаць без патрэбы
часовыя скарбы.
І хтосьці марнуе пад купалам неба
апошнія фарбы.
І час надыходзіць — сушэшвае хата
кусты арабіны.
І зноўку жыву я ад свята да свята
сваім успамінам.
І зноў мае мары ў далёкай краіне,
дзе добра жывецца.
Паветра астыла... Навокала — іней.
Пайду дзе пагрэцца.

## Андрэй
## КУЗНЕЧЫК



*Нарадзіўся ў 1978 г. у Віцебску. Скончыў беларускае аддзяленне філфака БДУ.*

*Друкаваўся ў часопісе «Першацвет», газетах «Раніца» і «Наша слова». Жыве і працуе ў Мінску.*

### ДОЖДЖ І МАРЫ

Прабіваюць дажджынкі травень,
хмары з сумам павіслі ў небе,
сціхлы вецер у лесе драмае —

толькі дождж дорыць шчасце глебе:
напявае ціхусенька песню,
сцеле водар духмяна-гаркавы...
Для таго, каб пісаліся вершы,
што патрэбна мне?..
Дождж і мары.

## ТАК ХОЧА СЭРЦА...

Горад родны шумлівым натоўпам гудзіць,
і сярод гэтых гукаў стракатых
беларуская мова, на жаль, не гучыць —
яшчэ, пэўна, не выйшла з-за кратаў.

«Няма часу і так... Яшчэ мову вучыць?!.»
І крычыць ужо хтось за двухмоўе...
Але дрэву калі карані адсячы —
ссохне, згіне і стане зямлёю.

Не! У словах маіх хай надзея гучыць,
бо надзею губляеш апошняй.
Мы не здолеем роднае слова забыць,
веру я, быць такога не можа!

І яшчэ загучыць з прыгажосцю сваёй,
веснавым ручайком паліецца
наша родная мова над нашай зямлёй!..
Веру ў гэта, бо хоча так сэрца.

## ДОБРАЙ РАНІЦЫ!

Я выходжу на двор
у той час, калі хтосьці
яшчэ, пэўна, у ложку
сны даглядае.

Дзесь вуркоча матор,
недзе стукае штосьці,
а навокал — усіх
сонца ўсмешкай вітае:
і салоўку ў кустах,
і мяне на двары,
і таго рыбака,
што стаіўся ў чароце.
— Добрай раніцы ўсім вам, —
гаворыць, — сябры!
— Добрай раніцы,
мілае сонца!

## Вікторыя
## КУФЦІНА



*Нарадзілася ў 1984 г. у Мінску. Вучыцца ў 11 класе СШ № 38.*

*Друкавалася ў «Першацвеце». Удзельнічала ў творчым семінары маладых літаратараў «Іслач-2000».*

### КАЛІ Я ПРАЧНУСЯ...

Калі я прачнуся, напэўна, убачу
сцены з бетону. Тады я заплачу,

бо ў гэтых сценах няма больш нічога
таго, што мне міла ды мне дарагога.
Мабыць, усе зоры над галавою
раптам убачу перад сабою.
Ім, як у казцы, я пасміхнуся,
калі пад небам вольным прачнуся.
Мабыць, прачнуся побач з каханым
сонечным, казачна-ветлівым раннем.
(Наўрад ці, канешне, збудзецца гэта...
«Марыць не шкодна», — кажуць паэты.)
Толькі вось думаць ніяк не збяруся —
аб тым, што чакае, калі я прачнуся...

* * *

Сорак градусаў болю
ў шалёныя вены.
Зачырванелыя вочы
больш ужо не заплачуць.
Пераплаўлены слёзы
ў пустыя бутэлькі.

Ачмурэлыя сцены
не ўпадуць на галовы,
закаханыя вусны —
у празрыстую вадкасць.
Гэта — лекавы сродак
ад бяссэнсавай працы,
ад няшчасных каханняў
і ад думак пакутных
пра былую Радзіму.

* * *

Чыркаюць запалкі.
У кухонным раі
цёпла.

Струменіцца па сценах
сытая лянота.
Спіць каццяня на каленях.
Гэта — рай,
ды не думай пра пекла,
што чакае цябе на вуліцы.
Халоднае пекла.

* * *

— Як цябе клічуць?
— Ды не клічуць — сама прыходжу,
разам з сонцам таропка стукаю
ў ваконні ды брамы.
Але не заўсёды
мне адчыняюць.

* * *

Вечар пайшоў ад мяне. Ноч засталася.
Раніца больш ніколі не прынясе мне
кавы ў ложак.
А бліскучую бразготку-дзень
мне падаравалі на свята
чарговай незалежнасці
ад чарговых знешніх ворагаў.
Я прыстасавала яе
да сваёй жырандолькі — замест лямпачкі.
Хай палохае нахабных рабаўнікоў
ды выпадковых вандроўнікаў.
Бо апрача іх, больш ніхто не ведае
шляхоў да майго дому.
Шкада толькі, што я даведалася аб гэтым
толькі сёння.
Вельмі шкада.

## ВІКТАРУ

Мы шпацыруем па горадзе Мінску,
прыглядаемся да вокнаў тых дамоў,
дзе некалі жылі самі,
ды марым аб тым,
што запаленае ў іх святло
калі-небудзь запаліцца дзеля нас.
Да нас падыходзяць каты ды коткі,
іншыя з іх добра прыкідваюцца людзьмі,
шмат ідуць далей сваім шляхам,
але побач застаюцца заўсёды
толькі самыя чорныя.
Мы нічога не пакідаем за сабой,
акрамя пустых бутэлек,
але ніхто не здагадаецца,
што было калісь наліта ў іх:
пладова-ягадны напой,
воцат,
атрута
ці наша ўласнае сумленне.

## Святлана
## КУХАРЭВІЧ



*Нарадзілася ў 1979 г. у г. Ліда. Вучыцца ў Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце.*

*Друкавалася ў «Першацвеце» і «Маладосці».*

### ПЕРШЫ СНЕГ

Выпадковая сустрэча
адбіваецца на твары
нечым мокрым і халодным,
і хаваецца ў вачах.

Ціха ападае неба,
моўчкі плача пад нагамі,
і знікае ў жоўтым свеце,
у бледных ліхтаровых снах.

Чуеш, нешта шэпча восень
кветкам, што памерлі рана?
Бачыш, крылы белай птушкі
грэюць мёртвыя лісты?

Неба падае павольна,
у руках гарачых тае.
Расцякаюцца па пальцах
незлічоныя масты.

Працягні руку сваю мне,
каб злучыліся дарогі!
Чорны цень у шэрым небе,
твая постаць — быццам меч.

А кавалачкі аблокаў
вусцішна лятуць у вочы...
Маё сэрца разарвана
выпадковасцю сустрэч.

* * *

тытунёвыя пальцы
мёртвага матыля
пакідаюць адбіткі
на белым вэлюме сноў
ізноў
не хочацца прачынацца
ізноў
тытунёвыя пальцы

* * *

самотныя пагляды
птушыных вочак
на маім дрэве
на маім зледзянелым дрэве
у акне трамвая
на маім крыштальным дрэве
пад адвечным небам
на маім апошнім дрэве
самотныя пагляды

* * *

дрэвы нараджаюцца ў поўню
дрэвы сябруюць з ветрам
дрэвы плачуць лістотай
дрэвы гавораць шэптам
дрэвы моляцца небу
дрэвы спяваюць песні
дрэвы хаваюць вочы
дрэвы смяюцца ўвесну
у дрэваў тонкія пальцы
у дрэваў нязграбныя вусны
дрэвы
    кахаюць
        аднойчы

* * *

Восень піша карціны
лісцем на зямлі.
Восень дажджамі шэрымі
песні пяе.
Восень вершы складае
кроплямі па акенцы.
Восень — яна мастачка
ў дзіравай сукенцы.

* * *

Словы ляцелі павольна
з тваіх — у мае вусны.
І як вынік — нічога не сказала,
але так прыемна маўчаць.

* * *

Я слухала мелодыю.
Яна лілася з неба
хвалямі летняга дажджу.
Яна плыла па вуліцах
і асядала ў лужынах...
Незабыўны рытм яе
шукайце ў гэтым вершы.

## ДОЖДЖЫК

Людзі! Навошта вам зброя?
Ён жа такі бяскрыўдны!
Давайце страляць не будзем
парасонамі ў паветра.
Ён жа — зусім маленькі,
хоча гуляць з намі.
Дотык яго — знаёмства
і запрашэнне ў госці.

## ЗДРАДА

Учора мяне цалавалі
твае словы,
твой позірк,
рукі твае.
Учора я патанала
ў адбымках тваіх вачэй,
слухала размову
тваіх пальцаў.

Сёння мяне цалуе дождж,
абдымае за плечы
бясконцымі халоднымі рукамі...
Ці даруеш мне здраду?

## ТЫ

Ты — цень.
Ты — толькі нечы цень.
Ты — подых ветру ў горадзе вячэрнім.
Праходзіць позірк мокры праз цябе
і бачыць дрэвы, дождж і адгалоскі неба.

Я ведаю на памяць нечы цень:
вачэй малюнак
і адбіткі думак,
і згадкі ўсмешак,
і аповесць пальцаў,
і вусны вершаў
ведаю напамяць...

Я ведаю:
ты — проста нечы цень.
Ты —
адзінокі цень сябе самога.

## СУМ

Голас ляціць у пустэчу —
б'ецца аб сценку.
Я намалюю вечнасць
гэтага енку.

Падаюць хворыя кроплі.
Чорныя птахі
маюць адвечную мару:
сонныя дахі.

Падаюць мокрыя гукі
мне на далоні.
Я адчуваю іх рухі —
жоўтыя стогны.

(Недзе далёка твой голас,
вусны й рукі...)
Падаюць хворыя кроплі.
Шэрыя гукі.

* * *

Падаю,
    падаю,
            падаю
ў абдымкі шэрае бездані.
Ты — побач.
Ты нешта гаворыш.
Не мне.
Стаіш на зямлі.
А я — падаю.
    Падаю.
            Падаю.
Паміж тонкіх пальцаў,
паміж рухаў, рук, вуснаў...
Ты — стаіш побач.
Паліш.
Смяешся.
Стаіш на зямлі.
А я — падаю,
    падаю,
            падаю...
Між падраных галін,
хворага лісця,
дзіравых хмараў...
Падзенне — таксама палёт.
А што, калі неба — бясконцае?
Дзе твае рукі, каханы?

## Марыля
# ЛАГОДЗІЧ



*Нарадзілася ў 1979 г. на Брэстчыне. Скончыла Брэсцкі музычны каледж імя Рыгора Шырмы. Вучыцца ў Беларускім універсітэце культуры.*

*У 1998 выйшла кніга вершаў «Па-над срэбнай слотай...» («Першацвет», № 9).*

* * *

Сёння скажы: «Кахаю...» —
і зайграй на трубе
мелодыю гэтага імгнення.

Я запла́чу ад шчасця
і ад трубы, якая
не ўмее іграць фальшыва.

Сёння скажу: «Кахаю...» —
і захіну парасонам
гэтае слова ад дажджу.

Ты захварэеш,
бо ходзіш без парасона...
Мы кахаем.
Мы хварэем.
Мы плачам.

* * *

Стрэлкі бягуць наперад —
заўтра будзе бясконцым.
На блакітнай паперы
я намалюю сонца.

Жоўтае з промнямі сонца
грэе халодныя сцены.
Заўтра будзе бясконцым.
Заўтра пакінутых ценяў.

Стрэлкі стаміліся бегчы,
ім надакучыла спёка.
Спёка хварэючых сэрцаў,
слёзы празрыстага вока.

Я закахаюся ў хмару —
дождж цябе не спужае.
Пойдзеш па тратуары
ў бясконцае заўтра.

* * *

У вашым горадзе, дзе сум і снег,
і дзе асфальт парэзаны трамваем,
я пакідаю парасон і смех,
каб зноў вярнуцца к вам дажджом і маем.

У вашым голасе — пяшчоты першацвет
і задуменне непагаслых вокнаў.
Вы гэтаксама, як і я, — паэт,
мой несустрэты, мой далёкі.

Пакуль зіма — я крэмзаю лісты
наўздзіў непаслухмянымі радкамі.
Хавае снег ад вечнасці масты
і размалёўвае спакой наш снамі.

Але аднойчы будзе дождж і май,
вы парасон мой знойдзеце раптоўна,
сустрэнеце, стаміўшыся, трамвай
на вуліцы вясновай, безназоўнай.

* * *

Белы пакой,
толькі павуцінне лётае
туды-сюды...
Белы пакой...
Такая ж белая душа мая,
у ёй нічога няма,
толькі павуцінне лётае ў ёй...

## Янка
## ЛАЙКОЎ



*Нарадзіўся ў 1979 г. у пасёлку Новая Мётча, што на Барысаўшчыне. Вучыўся ў Мётчынскай СШ, на факультэце філалогіі БДУ.*

*Аўтар зборнікаў «Акраец паветра» («Першацвет», 1998) і «Логіка пасткі» (Бібліятэчка часопіса «Маладосць»)*

*Жыве і працуе ў роднай вёсцы.*

* * *

Нехта кратае сумную ліру рукой,
разліваюцца гукі нябачнаю плынню.

Ты глядзіш на мяне. Твой спакойны дакор
хутка музыку спыніць.

Будзе спаць у тваіх валасах цішыня,
будзе плакаць пустэчай пакрыўджаны лірнік.
А ў люстэрку хіснецца каменны прасцяг —
дый застыне.

І ў журботных, бліскучых ад слёзаў вачах
схамянецца мой сцішаны прывід.
Я вярнууся з бязмежжа. Я прагну пачаць
жыць без крыўды.

* * *

Калыханка пачынаецца з надыходам ночы,
кожнае слова пачынаецца з даўно забытай
гісторыі сівой даўніны.
Я зайздрошчу сёння таму,
хто стаіць на мяжы.
хто трымае нямое трымценне паходні
ў далоні
і сам кажа шлях свайму сэрцу.
Такое — Дар Божы.

## СТАРЫ МЛЫН

Каля рачулкі безназоўнай
у светлай вотчыне маёй
ёсць млын стары, ад вока схоўна
спавіты даўніной нямой.

Ён тут спрадвеку. Невядома,
хто збудаваў яго і як.
Не раз, паўдзённай гнаны стомай.
спачыць сюды прыходзіў я.

Рабілася світальна, добра
і цёпла неяк на душы
у гэтых сценах прахалодных,
у гэтай нерушнай цішы.

Калісь было: прыспаў змярканне
і падхапіўся сярод зор,
як быццам хтось у сне параніў,
па сэрцы паласнуў лязом.

Прыўзняўся, хутка звык да змроку,
паслухаў ценькі цёк вады,
і праз рыпеннне крохкіх кроквў
чыісцьці крокі ўчуў тады.

І нехта цьмяны, велізарны
мне проста ў вочы зазірнуў,
сваім паглядам змрочным, хмарным
ён мне душу перавярнуў.

## ВОЛЬНЫ ПТАХ

І зноў рукі — крылы.
На мяжы Быцця і Небыцця
світае трывога святая. Болей
не будзе абрыдлага болю.
Я — Вольны Птах!

А ўнізе — зямля белая
ляжыць. Аблокі сплываюць за
прастор пад зорамі. Бліскавіцы
мігцяць і падаюць ніцма.

Вочы загінуць там,
дзе не будзе мяне заўтра.
Крылы згараць там,
дзе не будзе мяне заўтра.

Я застануся там,
дзе не будзе мяне заўтра.
Я — Вольны Птах!

* * *

Прысненне дзіўнае і лёгкае:
у ціхлай завадзі рачной
шчупак самотны гучна плёхкае,
і цені зыбяцца чаўноў.

А дальш, у чаратох прыстоеных,
дзе звыкла жамяра гудзе,
а гукі дыхаюць сутоннямі —
ступае нехта па вадзе.

Аброслы раскаю і згорблены,
пасрэбраны увесь луской.
спавіты воднай прахалодаю,
павольна ён ідзе ракой.

Яго вітаюць вербы ніцыя,
і цішу поўніць дзіўны звон.
І падаецца мне, што быццам бы
так з рыбамі гаворыць ён.

І вочы цёплыя паблісква юць
сярод зялёных валасоў,
іскрынкі ясныя распырскваюць
на мой далёкі, светлы сон.

* * *

Твайму целу карцела
адчуць радасць судакранання.
За вокнамі сцюжа люцела.
Ранне.

Галінкі бэзу аголеныя
па шкле шкрэбалі: «Годзе...»
Стыгла прамоўленае...
Поўдзень.

На шалі трывання твайго
ўзлягалі імгненне і вечнасць.
Чакаў нечага на двары ізгой —
вечар.

На сумёты без мэты глядзела,
цьмянелі ільдзінкі воч.
Адзіная ў гэтым свеце надзея
на ноч.

* * *

Зніякавелы, стаю
пад купаламі Храма Паэзіі.
Пазіраюць на мяне з абразоў
прасветленыя і мудрыя твары.
Кленчу перад імі —
перад адным больш,
перад другім — менш,
шукаю адказ на вечнае пытанне.
Маўчаць абразы. Самотна робіцца мне.
Раптам ззаду нехта пытае ціха:
— Што з табою, чалавеча?
Азіраюся — нікога.
— Не там шукаеш, — зноў голас гучыць.
Падымаюся, абтрасаю пыл з адзення,
іду да выхаду. Брама зачынена.
Выйсця няма. Але за плячыма — крылы.
Узлятаю, прабіваю купал...
Навокал — працяг і блакіт,
зелняніна ўзгоркаў і далін.

І голас:
— Што табе яшчэ трэба?
Перад табою — існы Храм,
створаны Мною, сапраўдным Творцам!

Узлятаю усё вышай і вышай,
набліжаюся да твару Аўтара.

* * *

Крывёю срэбнай маладзік брыняе,
расце і спеліцца, каб ветахам сканаць.
Хто ён такі, навошта ён — не знае,
не дадзена яму таго спазнаць.

І, непрытомны, сярод цьмы блукае —
шукае, каб дзе назаўжды спачыць...
Старачае зоры зрэдзь, і іх куляе
адчайна ў чэрава сляпой начы.

## НЯЗВОДНАЕ

На паверхні пашарпаных сцен
і на твары айцоў-езуітаў
клаўся змрочны сутонлівы цень,
неспатоленым болем спавіты.

Я, знямоглы сляпы ерэтык,
сярод цемры бясконца-адчайнай
то нясцерпна зрываўся на крык,
то вымройваў зацята маўчанне.

А пасля, у трывожным паўсне,
я раптоўна ўздрыгваў, нібыта
праз парожнюю стынь на мяне
натыкаліся рукі Нябыту.

* * *

Імглісты прысак ледзь ліпеў.
На ўзмежку пасвіліся коні.
Мой бацька спаў. А я сядзеў,
забыўшыся зусім на стому.

На грудцы сена соп Байкал,
раз-пораз натапырваў вушы,
калі ледзь чутны шолах траў
яго сабачы слых парушваў.

І цені коней над ракой
мой зірк цягнулі, чаравалі.
Святая ноч, святы спакой
памалу ў вечнасць адплывалі

## МАЦІ

Змярканне лепіць цень да столі.
Малы, цягнуся, каб схапіць
ружовы бохан спелай поўні,
на срэбры пальцы сашчапіць.

Матулін твар усмешкай зззяе.
І шчасця шчырая сляза
як долу падае — ўзрастае
дзівоснай кветкай хараства.

І песцяць стомленыя вочы
спакой маленькага сынка...
Ужо змяніў світанак ночку,
а матчына не спіць рука.

* * *

Нас вельмі мала
існавала,

мы ўсе імкнуліся
забыцца,
што некалі маглі дзівіцца
маленькай, трапяткой крыніцы.

Пакуль звінела роспач,
побач
мы свет спаткалі —
у маленні,
і безліч сненняў без наймення
дая нашых душаў — як збавенне.

## ТАЙНА

Двое стаялі ля Вышняй Брамы.
Насустрач Анёл ім выйшаў:
— Вы хто?
— Мы шукаем праўды,
але не зямной, а вышняй.

Тады Анёл аднаго паклікаў:
— Ідзі, для цябе адчыняю Браму!
І той увайшоў у праём. І знік ён.
І ўслед яму гучала: — Абраны!..

— Чаму? — Запытаўся пасля нябога. —
За брамай — якаясь тайна?
Анёл прашаптаў:
—Там няма нічога... —
І зарыдаў адчайна.

## МАНАЛОГ ЖАЎНЕРА

Ты мяне пачакай,
не сыходзь

у бязмежжа спякотнай пустэльні —
скуты я ланцугамі грахоў,
куляй скрухі
наскрозь прастрэлены.

Не сыходзь,
пачакай мяне.
Абдымі й скажы, што верная.
Я — жаўнер на праклятай вайне.
Ты — жаданая,
белая смерць мая.

## Андрэй
## ЛЮБЫ



*Нарадзіўся ў 1980 г. у Мінску. Вучыцца ў БДУ на гістфаку.*

*Друкаваўся ў часопісах «Першацвет» і «Маладосць».*

* * *

Дзе падарожжа страчвае шляхі,
на зеляніне крэмзаюцца хмары.
І крыж наўскрай, пакінуты вякамі,
маўляе між ціхуткасцю ракі.

Цвіценне красак, белыя абпалы
старых адтулін, чэрствых берагоў,

на веліч патураючы, вакол
сыходзяць беспрытульнасцю канала.

Асфальт і пераблытаная ўзбоч
істота
з надпісанымі радкамі
пра дзею, што сыходзіць чыгірамі
ад раніцы ў пакінутую ноч.

## СТУЖКА ДЫМУ

На зыходзе пахіснай волі
лашчыць полымя стужку дыму.
А яна рукавамі крыжуе
ў паветрана-мройным каміне.

Да вяртання з-пад столі ціісне,
ахінае галовы, тоіцца
ў незлічоных раскіданых словах
і пытае часцінку вольніцы.

І кавалкамі спрэчыцца з думкаю,
над няяркім полымем веецца,
агукаючы слоту вуліцы
ў адтуллі няскораным сэрца.

## ТРЫЯЛЕТ

Дзе шукаем мы мару, вандруючы ў свеце,
расчыняючы дзверы ў бацькоўскія храмы,
валасамі кранаючы столь Слуцкай брамы?
Дзе шукаем мы мару? Вандруючы ў свеце,
боль зямелькі счарнейлай з пакутаў кранаем...
Гэтым дотыкам смела загойваем раны.
Дзе шукаем мы мару, вандруючы ў свеце,
расчыняючы дзверы ў бацькоўскія храмы?

## ВОЗЕРУ БУЖА

Стамлёны ад крыкаў, мелодый і сечаў,
у коўдру захуты ля вогнішча стану,
я думай нязбыўнай падобны абману.

Прыснулым прывідам падыдзеш са свечкай,
у шэрань спаволена цягнеш за рукі —
і прагнеш спатоліць сасновым самценнем...
У словах — сакральныя зведныя рухі
ды сон, што ў вяках адраджае збавенне.

## АБЕРАЦЫЯ

Вам рэха прашаптала, што кахаюць
зачараваныя на досвітку валошкі
расы вільготу на дрыготкім ложку
зялёных дывановых павяданняў.

Вам рэха прашаптала, што не месяц
кіруе праменадам зорных хваляў,
а вецер, валасы што завівае
і прагне адмаўленне здзейсніць.

Вам рэха прашаптала, што прытулак
знайсці не цяжка, ды цяжэй забыцца
на сон, а раніцай збудзіцца,
калі вам рэха толькі прамаўчала.

## Вераніка
## МАРОЗ



*Нарадзілася ў 1983 г. у Мінску. Скончыла СШ № 159. Вучыцца на факультэце журналістыкі ў БДУ па спецыяльнасці літаратурная работа.*

*Упершыню выступіла з вершамі ў часопісе «Першацвет».*

* * *

Калі прыйдзеш зноў,
я пачастую цябе сваім
каханнем.

Але ведай, што гэта
не назаўсёды.

* * *

Я маю права на дождж
і маланку.
Яны заб'юць цябе —
і буду я рада.
Збяру ўсе рэчы,
адпраўлю поштай.
Чакай,
бо я прыйду апошняй.
Табе не сумна?
Не хвалюйся.
Я за цябе штодзень малюся.
Мне тут так добра: хлеб, гарбата.
Я знішчыла цябе — і рада!

* * *

Падпішыцеся зверху
ў левым куточку.
Пакіньце свой адрас,
імя, тэлефон.
Паспрабуйце закрыць свае
вочы шматочкам...
Што вы бачыце злева
ў верхнім куточку?

* * *

Паўзу туды,
куды заўсёды.
Як адлячу,
дык заплачу́.

Мая лянота —
твая стома.
Ведаеш,
я заўтра — дома.
Прыходзь,
прынось...
Чакаю доўга.
Падлога.
столь
ды наша коўдра.

* * *

Зачынілі тое,
што нельга было
адчыніць.
Хацелі выкапаць глыбока —
не далі.
Памножылі чаканне на
вечнасць.
Адмовілі ўсяму свету
ў спадзяванні.
І зрабілі так, як ім таго
хацелася.
Цяпер мы — ніхто.

* * *

Я імя тваё не любіла.
Не лічыла гадзіны ў краме.
Калі скончыцца восень —
у траўні
намалюю табе я спатканне.
А цяпер табе добра ў шафе.
Пасядзі, пакуль скончыцца
свята.

Я цябе не любіла ніколі...
Я перад табой вінавата.

* * *

На шкле — скалечаны позірк...
Гуляем у немаўляткаў.
Табе захацелася ўпотай
зрабіць мяне сваёй лялькай.

Але мы не будзем на сценах
крэмзаць пісанне святое.
Куплю я па старых цэнах
бабуляў народныя строі.

А ты ніколі й не ведаў,
што я магу быць не сумнай?
Ды нашы з табою беды —
згукі на вуліцы тлумнай.

## Марыя
## МОЖАР



*Нарадзілася ў 1978 г. Закончыла Навасёлкаўскую СШ. Вучыцца ў Беларускім універсітэце культуры. Піша на рускай і беларускай мовах. Сябра творчай суполкі «Літаратар».*

*Выдала паэтычны зборнік «Я № Я» («Беларускі кнігазбор», 2000).*

* * *

Настальгія
па неперажытаму.
Як тонкі пах
дарагой парфумы,
што шлейфава цягнецца
за прыгажуняй.
Я растлумачваю сабе
сваю самоту,
палічыўшы як на калькулятары,
як не выкарыстаную магчымасць.
якая...
якую выкарыстае іншая.

* * *

У лесе ціха.
Зязюля,
зняважаная няўдзячнасцю людзей,
больш не раздорвае
шматкі жыцця.
Яна дала зарок
вечнага маўчання.
У лесе ўжо ціха.

* * *

Свядомая абыякавасць
да жыцця.
Непарушная сувязь
часу і вымярэння,
што вызначаюць, дзе і якімі
мы будзем, і ці будзем
у адной з плоскасцяў невядомага.

* * *

Уздоўж субэкватарыяльнага поясу
расхрыстаны вецер лётае
на доўгім ланцугу падсвядомага,
канец якога
прыкаваны да майго абцаса.

* * *

Я маленькі творца
сваёй эпохі.
Але ведаю,
што тыя,
хто будуць гуляць
з гэтай цацкай потым,
наўрад ці ўспомняць
стараннасць сляпога майстра.

* * *

На партрэце Джаконды
з'явілася яшчэ адна трэшчынка.
Нават у несмяротных
бывае старасць.

* * *

Я пасадзіла
цагельнае дрэва.
Засталося
каго-небудзь нарадзіць.
Але...
Я шматдзетная маці
недапісаных вершаў.

* * *

Абцякаю незлічонаю
колькасцю дзён, што не хочуць
мяне адпусціць.
Было...
Гэта было...
Гэта было калісьці...
Дзіркі памяці латаю
каванымі вершамі.
Форткавы вецер
гартае, не пачытаўшы,
маю тагачаснасць.

* * *

Верш за вершам
кладзеш, як цагліны,
будуючы
з нерастрачаных пачуццяў
сваю каханую.
Твая невычэрпная тэма
пазаўчора
курыла са мною ў тамбуры.

* * *

Званы клічуць:
значыць, трэба ісці,
бо хто ведае —
ці пакліча нас
хто-небудзь заўтра?

* * *

На хвалях калываецца чайка,
нібы маятнік ходзікаў,

што спыніцца
якой-небудзь апоўначчу.
Я столькі бачыла фільмаў,
але самы фантастычны —
больш рэальны за жыццё,
якое стварылі мне
ў пацуковым раі.

* * *

У фармаліне,
у трохлітровым слоіку —
акуркі й шкляныя вочы
з яшчэ неапетым позіркам.
Празрыстыя фіранкі
ствараюць паэтычны настрой.
Слава вялікай натхнёнасці
й прасторам некранутых тэм!

* * *

Кожнае каханне
навобмацак выпрабаваннем пазнаецца.
Мы праходзім праз шчыліку дзён,
губляючы пацалункі
й даруючы прасцінам
незапатрбаваную
зоркавасць слёз.

## Алег
## НІКУЛІН



*Нарадзіўся ў 1972 г. у вёсцы Арда, што ў Клецкім раёне. Скончыў Мірскае мастацкае вучылішча. Жыве і працуе ў в. Гурнаўшчына.*

*Друкаваўся ў часопісах «Першацвет», «Маладосць», «Полымя», «Крыніца» і газетах.*

* * *

Мне цяжка сумаваць
і бачыць, як сумуюць.

Мой сум — як боль зямны.
Мой боль — як сум нябёс.
Гляджу я на людзей
і бачу, як ваююць
яны адзін з адным,
прадаўшы д'яблу лёс.

З адчаем я жыву
і не баюся смерці,
бо я прывык да зла,
ужо даўно прывык...
І мушу ад нуды
пяром паперу дзерці
ды гвалціць свой нямы
і змучаны язык.

* * *

Наляцелі чорныя буслы
на балота і на сенажаць.
Надышлі гнятлівыя часы —
і не жаць, і рана паміраць.

Недзе ў лесе сноўдаюць ваўкі,
выюць так, нібыта чуюць смерць.
Ім бы бегчы ў розныя бакі —
але ж цяжка шлях свой разглядзець.

На палях, на нівах — цішыня.
Могілкі пакрыліся імхом.
Недзе ў небе дрэмле Дабрыня.
І грыміць здаля аднекуль гром...

## ДУША

Душа баліць, душа чакае...
Баліць, бо трапіла ў палон.

І недзе зоркаю згарае,
у мёртвых адабраўшы сон.

Чаго ёй трэба? Свет шырокі —
хапае месца на зямлі...
Яе ж прыцягваюць аблокі,
бо надакучылі палі.

Душа мяне не разумее —
ёй птушкай хочацца кружыць.
Яна ніколі не старэе...
Ці не таму так цяжка жыць?

## ЗАКЛІК

Той, хто сілы аддаў за любоў і святло,
каму сэрца пачуццямі цела пякло,
чыя мара была сярод зорак красой,
каго смерць забівала крывавай касой, —
хай народзіцца зноў, як анёлаў дзіця,
сярод праху і цемры нямога быцця!

## ЧАЛАВЕК

1

Усім цікава глядзець,
як нараджаецца маленькі чалавечак.
Усім цікава глядзець,
як ён, стаўшы старым і нямоглым, канае.
Але нікога не цікавіць яго жыццё.
Нікога не цікавяць яго пакуты...
Бо ўсе — гэта Грамадства.
А ён — чалавек.
Яго цікавіць усход сонца.
Яго цікавіць заход сонца.

Але ён не любіць,
калі яно свеціць высока ў небе,
асляпляючы яму бессаромныя вочы...
Бо ён — Чалавек.

2

Дасягнуўшы Бога,
чалавек губляе Яго.
Бо сам становіцца богам,
а Бог падымаецца вышэй
і ператвараецца ў больш
магутную
і больш светлую
істоту.

3

Чалавек,
ты — не кавалак мяса,
які смажыцца на агні,
круціцца,
як можа,
і стараецца на смак
спадабацца грамадству,
якое так і чакае,
каб хутчэй праглынуць.
У цябе — ёсць душа!
У цябе — ёсць розум!
Толькі сумлення табе
не заўсёды хапае...

## ПЕСНЯ МІГРАНТАЎ

Як
нам
жыць?
У нас няма радзімы.

Дзе
нам
быць?
Мы — свету пілігрымы.
Хто
нас
тут
напоіць і накорміць?
Род-
ны
кут
ужо не абароніць
ад
бя-
ды,
якая даканае,
і
ну-
ды,
якая нас вяртае...

## Алесь
## НІНЬКО



*Нарадзіўся ў 1980 г. у в. Старая Мётча на Барысаўшчыне. Вучыцца на беларускім аддзяленні філфака ў БДУ. Удзельнік семінара маладых літаратараў «Іслач-2000».*

*Друкаваўся ў часопісах «Першацвет» і «Маладосць».*

* * *

Здзічэлаю думкай у пошуках роздуму,
у празе спрадвечнай набрыць на спакой...

Імкліва лячу. Ашалеламу розуму
ўсміхаецца ўслед палахлівы дакор.

Глыбока ляжыць запавет непахісны,
спякотна яму пад навалай снягоў.
Ніводнай сцяжынкі, і толькі суцішша
хавае ў сабе штрыхпункціры слядоў.

* * *

А думкі зіма
закавала няспешна.
Пачуццяў няма —
няма тады й вершаў.
Ані натхнення,
ні смагі адвечнай —
адно спрэс збуцвенне,
сымболь невылечны.
...Панурая вечнасць
паштурхвае ў плечы.

* * *

Жыццё — ураўненне
з мноствам рашэнняў.
каранямі якога
з'яўляемся мы.

* * *

Мой узрост — вечнасць.
Спусцелыя вочы
шукаюць
згубленую свядомасць
па блытаных каардынатах
лабірынтаў
вектара жыцця.

* * *

Запалены позірк — як магчымасць працягу.
Пачаць аніколі не позна спачатку.
Хвалююцца зоры ў касмічным прасцягу,
дрыжаць і хістаюцца вагі
дабра і зла —
раўнавагі
няма.

* * *

Я разарваны на кавалкі...
Пабляклы позірк, нібы госць,
блукае па квадратах кратаў
і верыць — выйсце недзе ёсць.

* * *

Мае вершы —
прыступкі ў нікуды
ці ў нешта,
і толькі.
Па іх
мне хочацца сысці
ў бязмежнасць
кропкі.

* * *

Нябачныя цені паўзуць па сцяне,
за вокнамі — лютая сцюжа
гуляе клубкамі імклівых завей
на лёдзе задушаных лужын.

Мой позірк няцямна шукае працягу,
абмацвае ноч невідушча,

ды ён не спатоліць адвечную прагу
ў цямрэчай аглушаных душах.

* * *

Агонь, што не грэе...
Святло, што не свеціць...
Грувасціцца цемра
пачварным суквеццем.
Над кволенькім светам
пануе мана.
Фальшывыя думкі
ў прымроеных снах...

У бруд утаптаны
былы ідэал,
а побач з Месіяй
з крыжом на плячах
пакутуюць тыя,
што зведалі смак
пракляцця натоўпу...
І роспачны жах
трымае істоту
ў сваіх кіпцюрах...

І — выйсця няма?

* * *

На мяжы
між явай і сном,
між смерцю й жыццём,
між чорным і белым
ёсць цэлага рэшта,
суцэльнасць,
ёсць Нешта —
апошняя рэшта.

* * *

Жывем па звычцы
і не можам адступіцца
ад стандартаў.
Вось і цяпер
я нечага чакаю
і з часам разам паміраю
сам.
А калі-небудзь
нестандартнасць
зробіцца стандартам.

## ПЕРААДОЛЕННЕ

1

Немагчымасць спакою
і пошукаў выйсця;
самім сабою
ўжо ніколі не быць.
Аналагічнасць фантазій;
збавенне ад мрояў
немагчымае ў часе;
і іх не адолець.

2

Панурая маўклівасць,
маўклівая панурасць,
трызненні й сумнівы...
Дзе дарога?
Ля парога
з усмешкаю стаіць
вясёлы д'ябал
з тварам Бога.

### 3

Галактыка крылы раскінула —
зорнае неба —
і нешта хавае за імі.
Прайсці праз бясконцасць
магчыма,
але ці патрэбна?

* * *

Пачатак канца, канец пачатку
зацягваюцца ў пятлю —
і вельмі цяжка разарваць вяроўку.

## Васіліса
## ПАЗНУХОВА



*Нарадзілася ў 1979 г. у пасёлку Пагранічнае. Вучыцца на філфаку ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце. Удзельнічала на семінары маладых пісьменнікаў «Іслач-2000».*

*Друкавалася ў часопісе «Першацвет».*

* * *

Я клічу цябе: «Азавіся
скрозь зоры й агонь бліскавіцаў!..»

Асенняе жоўтае лісце
фарсіць у дажджу завушніцах.

І раніцы хмурнай пяшчота
смугою цячэ ў краявіды.
Паціху брыдзе адзінота
сярод бразгатні ды агіды...

І дзень не вітаецца з ноччу,
і я не знаходжу спакою...
У суму — блакітныя вочы,
калі разліецца ракою.

* * *

Пераможаны дзень
углядаецца ў люстра вады —
дзесьці тояцца там
запаветныя ветру сляды.
А каханне, бы поўня,
узыходзіць над праймай лясоў,
каб пачуццяў сусвет
яскравеў ад людскіх галасоў.

## СВЯТЫНЯ

Святыня мая — гэта лес і лугі,
і зоры над вербай пахілай,
і ў сонечных промнях жывыя снягі,
і — сцежка да родных магілаў.

Святыня мая — гэта, чым даражу
і што мне паветрам здаецца,
і тое, што змалку ўскрыліла душу,
і ў сэрцы што горача б'ецца.

## ВЕЧНАЕ...

Падумаўшы пра вечнае, згаджуся,
што ўсё на свеце — шыр і цішыня
у параўнанні з сэрца землятрусам,
вясельныя званы ў якім звіняць.
Падумаўшы пра вечнае, адзначу,
што ў які б не зазірнулі кут,
аднолькава на свеце людзі плачуць:
ад радасці, ад болю і пакут.
Падумаўшы пра вечнае, успомню,
што не знайсці цяжэй і даражэй
за цёплую матулі роднай стому,
калі яна да сну кладзе дзяцей.
Падумаўшы пра вечнае, падкрэслю,
што нельга нам ніколі забываць
аб прыгажосці спеўнай, шчаснай песні,
аб тым, што трэба верыць і кахаць!

**Алена**
# ПАЛЯКОВА



*Нарадзілася ў 1969 г. у Барысаве. Выкладае беларускую мову і літаратуру ў Барысаўскім педагагічным каледжы. Працуе пазаштатным карэспандэнтам у мясцовай газеце «Адзінства», піша крытычныя артыкулы, паведамленні на культурныя тэмы.*

*Неаднаразова выступала з вершамі ў часопісе «Першацвет».*

* * *

Часта іду па асколках,
асколках свайго лёсу.
Нязбыўныя мары-зоркі
ў думкавы склеп заношу.

Жыве адчуванне дзівацтва:
узлёту і страху разбіцца.
Біць шкло — яшчэ не мастацтва,
склейваць бы навучыцца.

* * *

А смутак, як і туман,
прыйшоў. І не даў спакою.
Над сіняй рачной вадою
аблокаў плыве акіян.

За лесам сонца садзіцца,
павольна спускаецца ўніз...
А я хачу бліскавіц,
каб вецер выў з навальніцай.

Каб жудасна стала да слёз
на цёмным беразе рэчкі.
Каб ты раптам сціснуў за плечы,
на рукі схапіў і панёс.

* * *

Ты — нейкая недарэчнасць
на маім шляху,
у жыцці маім.

Ты — ручай хуткачечны:
раптам сціх крыху,
раптам знік зусім.

Я — твой падарунак лёсу
за грахі твае,
за душэўны змрок...
Стану пясчаным плёсам —
твой ручай імкне
да мяне знарок.

## ЖНІВЕНЬСКАЯ МАРА

Упасці ў кветкавае поле,
забыцца аб усім на свеце,
адчуць салодкі колер волі,
які шапоча: дзеці, дзеці...
Маленства ўбачыць краем вока,
гарэзаю пабыць хоць трошкі...
Але пранізвае, бы токам,
усмешка сына-басаножкі.

## КАЛІСЬЦІ

Мяне пакінула раптоўна
маё юнацтва — вольны вецер,
бы ў сне блакітна-непаўторным,
схапіўшы бэзавую квецень.

Я засталася перад нечым
такім нязведана-багатым.
І толькі з бэзавай далечы
цягнууся пах бацькоўскай хаты.

* * *

Мне б кінуцца ў глыбокае прадонне,
каб не дарма прапасці. Хай бы так.
І што мне зараз карты, што мне коні?!.
Як ні раздай — пад масць не йдзе ніяк.
Вось — шэры Туз у яблыках-імгліцах,
а вунь — пярэсты пікавы Валет...
У вашым сне дазвольце мне з'явіцца,
а я — дазволю вам згубіць мой след.

## Сяргей
## ПАТАРАНСКІ



*Нарадзіўся ў 1976 г. ў Мінску. Пасля Беларускага гуманітарнага ліцэя скончыў Беларускую Акадэмію мастацтваў.*

*Друкаваўся ў «Першацвеце» і «Маладосці». Аўтар паэтычнага зборніка «Залаты вецер» (Бібліятэка часопіса «Маладосць»).*

## БАЛАДА

Каралі дзівосныя створаных словаў,
санетная музыка спрагненых мрой —
усё ў тваім сненні! Ніякіх аковаў
стрымання не мае яно, бо я — твой!

У гэту хвіліну, у гэта імгненне,
у гэтае повязі млоснасвятой,
у гэтым віры залатога ўтрапення,
у свеце халодным, як лёд, бо я — твой!

Няма мне законаў! Я — сам пан уладны
над гэтаю ноччу, што дорыць напой
паўночнай шалёнасці, прагі панаднай
і веры навекі ў табе, бо я — твой!

* * *

Ляцела Любоў па свеце —
шукала сабе суразмоўцу.
І ў адзінокай пустыні
Хрыста яна напаткала.
— Ці хочаш мяне, Ісусе, —
Яго яна запытала, —
такой, якой ёсць на справе:
без зайздрасці ды заганаў?
Мільгнула ў вачах усмешка
Ягоных. Ён думаў з хвіліну —
адно і сказаў ёй толькі:
— Без суму любві не бывае.

## АДАЖЫО ДЛЯ МАМЫ

Пабудзі мяне рана, мама...
Сёння сын твой спасцігнуў нірвану,
страшнай мрояю быў узарваны.
Але толькі й яе замала,

чым твой белы сон,
чым асьлепленай мроі палон.

Дзе шукаць мне сьляды ачышчэньня
ад дурноты й грэхападзеньняў?

Іх няма, як цябе ўва мне, мама.
Яшчэ зорка мая не пагасла,
бо душа мая доўга спала
ў маім сьне,
што не даў мне шчасьця і грама.
Яшчэ шчасьце маё не настала,
яшчэ доля мая заспаная.
Разбудзі мяне рана, мама,
каб пасьпеў на хвіліну болей,
чым астатнія ў сьвеце пражыць...
І як сном тваім мне даражыць —
цішынёю, што сьвету болей, —
каб мой сон не вярнуўся ніколі,
каб прачнуўся нарэшце вольным.

* * *

Геній недаступны для натоўпу,
але блізкі крайнасьцям жыцьцёвым.
І паэту толькі муза славы
можа ўзнагародай быць сапраўднай.

Не хлусіць сюды прыйшлі паэты,
але песьняў слічных не чакайце:
у пух і прах зьнішчаючы бязьвер'е,
яны з нябыту веру ўваскрашаюць.

Хай кіпіць навостраная ліра!
Хай буяе сьпеў — прамы і жорсткі!..
Раздавай, паэт, рукою шчырай
тое, што зямля нам спарадзіла!

Не ліслівнічай! Пакінь такое ўбогім,
шэрым і бязвольным, моўнаслабым...
Толькі праўда — ісціна паэту
ды цана пакутаў і нястачы.

* * *

Радзіма — там, дзе ёсць сябры,
у горадзе з чужым найменнем,
дзе брук знаёмы і стары,
і час прагулкі — бы ўзрушэнне.
  Радзіма там, дзе цёплы дом,
  дзе добры сон, як кот муркотны,
  дзе сцены свецяцца святлом
  утульнай цішы першароднай.
І простых рэчаў грубы спрат
стварае аўру супакою,
жыццё настроена на лад,
які з дзяцінства быў з табою.
  І сонм шалёных халадоў
  няведамы душы балеснай...
  Радзіма там, дзе ёсць любоў
  у звыклым, чалавечым сэнсе.

**Алена**
# ПШЫГОЦКАЯ



*Нарадзілася ў 1984 г. у Мінску. Вучыцца ў Гатаўскай сярэдняй школе.*

*Друкавалася ў часопісе «Першацвет» (1996).*

## ЛЕГЕНДА ПРА МАЦІ Й СЫНА

Калі свісталі над табою кулі
і побач разрываўся ўжо снарад,
святыя словы «родная матуля»
ты ўспомніў у апошні міг, салдат...

Твая старая зморaная маці
за кроснамі сядзіць у цёмнай хаце.
І нітку яна ўсё прадзе, прадзе,
нібы размову тайную вядзе.
Пра роднага сыночка ўспамінае:
«Няхай жа яму Божа памагае!..»
І раптам нітка тая разрываецца,
і сэрца маці ў роспачы сціскаецца.
Яна хапае нітку тую, звязвае,
а прадчуванне нешта ёй падказвае.
І бачыць, як ляжыць сынок яе, скрываўлены,
адзін у полі, помачы пазбаўлены...
І маці ўжо да сына парываецца,
у птушку гамаюн ператвараецца,
каля сынка на полі апускаецца,
вачэй змярцвелых дзюбаю кранаецца...
І сын адкрыў скрываўленыя вочы,
вярнуўшыся ў жыццё з адвечнай ночы,
рукамі, нібы крыллем, узмахнуў —
і разам з маці ў неба сігануў.

Гісторыя на гэтым не канчаецца,
бо птушкі часта ўночы тут з’яўляюцца:
крычаць, нібы галосяць аб загінуўшых,
на полі бою гэты свет пакінуўшых.

## ЗІМА

Ноччу чула: завіруха
намятала гурбы снегу.
А як раніцай я ўстала,
дык ледзь-ледзь наш двор пазнала.

І старэнькая рабіна,
яшчэ ўчора сіраціна,
сёння — быццам бы князёўна.
Гэткі ўбор на ёй шыкоўны!

* * *

Настала ціхае лагоднае заціішша.
Заснуў і вецер, лісце не калыша.
І толькі азярко праплюскатала
вярбе прызнанне, што на беразе стаяла...
Ды ноч прайшла, і новае світанне
«Бывай!» паслала ёй на развітанне.
Прырода зноўку сустракае ранне.
Ва ўсім чутны суладдзе і каханне.

## Віталь
## ПЯТРОЎСКІ



*Нарадзіўся ў 1976 г. у в. Вярэбушкі на Смаргоншчыне. Вучыўся на філфаку ў БДУ і працаваў загадчыкам аддзела паэзіі ў «Першацвеце». Цяпер жыве ў роднай вёсцы.*

*Друкаваўся ў часопісах «Першацвет»,«Родная прырода», «Маладосць», «Крыніца», штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва».*

## ТРЫЯЛЕТ

Гронкі нашага лёсу з табой
нечакана і сумна завялі...
Помніш, летам шчасліва буялі
гронкі нашага лёсу з табой.
Салаўі светлых дзён адспявалі.
Ные сэрца, бо з горкай журбой
гронкі нашага лёсу з табой
нечакана і сумна завялі.

## ХАНДРОЗНАЕ

Гэты свет пакутуе задышкай.
Ён трымае пульс свой на руцэ,
быццам бы засуджаны да вышкі
са слязой скупою на шчацэ.

Як цябе шкада мне, чалавеча,
што калееш між эпох, нібы
бедны родзіч пры парозе нейчым,
ледзь прыкрыўшы сорам чым-абы.

Ты стаміўся ў чэргах па адхланне,
у набітых спрэс вагонах, што
едуць на чаканае спатканне
ў перацёртых модных паліто,

каб на звалках часу і імперый
адшукаць апошнюю душу,
што змагла б у лепшае паверыць,
каб затым спраўляць па ёй імшу.

Хай мяне караюць на памосце,
хай лінчуюць вашы ваяры.
Праз свае скрываўленыя косці
прарасту...
Нагамі дагары.

## ПАЭТ

На сонцапёку пакаленняў
здымаеш кепку ты,
паэт,
і, як стары дзядуля Ленін,
ствараеш помны
запавет.

Хай толькі ўзыдзе
сонца ранкам
і ўспыхне радасцю
ўзыход —
спяваеш хвацка
калыханку
вар'яцтва ў стылі
«Дон Кіхот».

І рэверансы ў бок —
багемы,
і ў бок натоўпу —
дзікі свіст.
Ты — доказ
лішняй тэарэмы.
Ты — без сцэнарыю
артыст.

* * *

*...Я — святло свету.*
*Ісус Хрыстос*

Ты — вечны Светач,
што палае
ў цямрэчы свету.
Ты адзін
прынёс Агонь свой
на планету,

каб запаліць
сярод ільдзін.
Вазьмі ты ў рукі
маё сэрца
і запалі яго
агнём,
і ўспыхне
слова на паперцы,
і стане светла,
нібы днём.

# Наталля
# РАМАНЕНКА



*Нарадзілася ў 1979 г. у Мінску. Скончыла ліцэй пры БДУ (1977). Вучыцца на журфаку ў БДУ.*

*Друкавалася ў часопісах «Бярозка» і «Першацвет», газетах «Раніца» і «Чырвоная змена», зборніку «Казкі дзяцей Беларусі».*

* * *

Цёмнае неба, суквеццямі зоры,
кроплі-агеньчыкі ў цёмнай прасторы...

Свеціце вы то так ярка, то бледна,
то пазалотай, то срэбрам, то медна.
Я вось пад вамі стаю, назіраю,
з неба бяздоннага знічку чакаю.
Зоркі падміргваюць мне, як жывыя.
Думаю: зоркі — як лёсы людскія.
З іх некаторыя ўжо больш не свецяць:
гаснуць, знікаюць, як людзі на свеце.
Ёсць жа і яркія зоркі.
Хай, людзі,
кожны з вас яркаю зоркаю будзе!

* * *

Імклівыя хвалі
пра сонца спявалі,
у рэчцы смяяўся блакіт.
А тая вілася,
п'яная ад шчасця,
за небакрай у нябыт.

Самотныя далі
вясну сустракалі
і птушкаю першай яны
ў дрыготкім паветры
вялі з цёплым ветрам
размову-санату вясны.

## НАЧНЫ ДОЖДЖ

Спявае сонна цішыня.
У так нябёсы плачуць.
І ветрык хоча дождж суняць.
І што ўсё гэта значыць?

Нібы спявае для мяне
і падпявае думкам —

той дождж гучыць, нібыта ў сне,
здаецца паратункам.

Іду я ў дождж. Іду ў прастор.
І чую пацалунак...
І хочацца ляцець да зор:
мой дождж — мой паратунак.

**Вольга**
# САВУЦІНА



*Нарадзілася ў 1981 г. у пасёлку Югалін, што ў Івацэвіцкім раёне. Жыве ў в. Рэчкі. Піша вершы й прозу.*

*Друкавалася ў часопісах «Бярозка» і «Першацвет», у газетах «Івацэвіцкі веснік» і «Пераходны ўзрост».*

## ПРЫЗНАННЕ

Тут сонца яркае і зоры,
наўкол, куды ні глянь, — лясы,
квяцістыя лугоў уборы
і сініх рэчак паясы.

Тут над вадою вербы гнуцца,
пяе салоўка ў цішыні,
і песні жаўрука ліюцца
з-пад ранняй неба вышыні.

І гэта ўсё — мая старонка,
мая радзіма Беларусь.
Бярозка мне кіўне галоўкай,
я з ёй, жывой, загавару.

Я падзялюся шчасцем з ёю
і словы шчырыя скажу,
што ганаруся той зямлёю,
дзе нарадзілася й жыву.

## ЗОРКІ НА КУСЦЕ

Ціха ночка ішла па зямлі,
на руках сваіх несла зоры,
і ляцелі калі-нікалі
яны ў цёмную ночы прастору.

Каля дома майго — язмін,
ён ласкавы, як цёплае лета.
Апускаліся тут яны
мірыядамі зорачак-кветак.

І вось — раніца ўжо на зямлі,
адышлі разам з ночкаю зоры.
Не ляцяць ужо больш яны
ў крышталёвую ранка прастору.

Толькі цуд — на кусце зорак шмат.
Пах духмяны. І пчолкі запелі.
Кветкі нам падарыў зарапад,
каб мы радасць глядзець на іх мелі.

## ЛЕТНЯЯ РАНІЦА

Сонца сарамліва зазірнула
ў вокны хаткі на лясной паляне,
потым асмялела — агарнула
стройную сасонку прамянямі.

І ад сну начнога абудзіла
белага рамонка, незабудку.
Мякка па лясочку пахадзіла,
птушак і звяроў будзіла хутка.

Весела прырода ўжо спявае,
песняй птушкі сонейка вітаюць,
цёплы ветрык між галін гуляе,
і мурашкі працу пачынаюць.

І раса асколкамі люстэрка
па зялёным сцелецца раздоллі...
Значыць — будзе сёння цэлы дзень
сонечнае яснае надвор'е.

* * *

Ад працы тайнымі шляхамі
захоча вецер уцячы,
жоўта-ружовымі сцягамі
сустрэне княжанне начы.

А месяц — верны ёй падданы —
яму так вечна векаваць,
нібыта кімсьці падасланы
зямлі падзеі вартаваць.

І перад ім бягуць стагоддзі.
Звіняць там — шаблі, там — званы.
Мінаюць ночы, дні праходзяць.
Лунаюць аб мінулым сны.

У небыццё бягуць стагоддзі.
Звіняць то — шаблі, то — званы.
Мінаюць ночы, дні праходзяць.
Лятуць у будучыню сны.

## НЕЗАБУДКА

Сяду я ля незабудкі.
Яна ціхенька спытае:
— Гэты мілы нам куточак
будзеш помніць, абяцаеш?

— Не забуду, незабудка,
я зялёны лес за полем,
лёгкі ветрык, што ціхутка
павявае на прыволлі.

Не забуду, незабудка,
я блакіт тваіх пялёсткаў,
нібы вочы Беларусі,
як нябёсы над гаёчкам.

Не забуду, незабудка,
патаемны шолах лісця,
азярцо, нібыта люстра
тут пакінутае кімсьці.

І пад вокнамі каліну
я заўсёды помніць буду.
Гэты край я не пакіну,
незабудка,
не забуду!

## Таццяна
## СВЕТАШОВА



*Нарадзілася ў Мінску ў 1984 г. Вучыцца ў 11 класе Першай мінскай гімназіі імя Францыска Скарыны.*

* * *

Прыемна проста ісці па горадзе.
Ісці. І дыхаць чарнільным паветрам.
І быць часцінкай чагосьці светлага...
Прэч ад сябе шэрыя думкі!
Ты зразумела нарэшце:
у гэтым свеце і без цябе
хапае шэрасці.

## ВЫМЯРЭННЕ

Без натхнення блукаю па даху
ў адзіноце. Мяне цікавіць —
ці бывае шчаслівы той, хто
вымярае адлегласць паверхамі?

Ён прыходзіць сюды штодзённа.
Па-за дахам шукае шчасце.
Вымярае час і адлегласць
звычайнымі пралётамі лесвіцы.

Мне не суджана з ім сустрэцца —
ён аж там, куды ліфт не дойдзе,
бо яму і жыцця адмерана
чатырнаццаць пралётаў лесвіцы.

Ён знайшоў свой шлях да ўтопіі —
я стаю на краі разгублена
і баюся, што раптам адчыняцца
дзверы ў новае вымярэнне.

* * *

Да бясконцасці, да празрыстасці
па няўмольнай іду няўхільнасці,
апякаючы ногі босыя
аб чужыя сэрцы гарачыя.

Я пайшла ад цябе, каханага,
за надзеяй сваёй няспраўджанай,
у пошуку мары страчанай,
у сусвеце акрайным згубленай.

Мы ніколі больш не сустрэнемся —
не вяртаюцца з непазбежнасці.

Адлятаю ўспуджанай птушкаю
да бясконцасці, да празрыстасці...

* * *

Я малюю паветра
на акне запацелым.
Я малюю кастрычнік
у вечаровай самоце,
каляровыя плямы
ліхтаровых сузор'яў,
стужкі стомленых вуліц
пад далонямі дахаў.

Я малюю, як горад
апранаецца ў восень,
у кастрычніцкі смутак
і ў пажоўклае лісце...
Засумую таксама,
уздыхнуўшы міжволі,
сапсаваўшы малюнак
на акне запацелым.

* * *

Я магла б навучыць цябе
ніколі не зважаць на гадзіннік,
не страчваць прытомнасць ад стомы,
не заплюшчваць вочы ў час пацалунку.

Я магла б навуцыць цябе
ажыўляць пажоўклае лісце,
глядзець на ружовую зорку,
седзячы на краі небасхіла.

Але ж я не змагу ніколі
цябе навучыць каханню...

* * *

Я знайшла твой светлы вобраз
у малюнку на шпалерах.
Абдыму цябе крыламі —
забяру цябе з сабою.

Паблукаем па Сусвеце,
каб знайсці сваё сузор'е,
каб прыдумаць успаміны,
каб згадаць пра ўсё, што будзе.

Абдыму цябе крыламі,
не аддам цябе нікому...
Я знайшла сваё каханне —
у малюнку на шпалерах.

* * *

Пачакай — я зашыю
разарваныя крылы.
Апрануся ў натхненне,
валасы расфарбую.

Палячу за табою
ў верасовае сонца.
Мае лёгкія крокі
паглыбляюць бяздонне.

Ці заўважыў, як трапіў
у маю схову-пастку?
Пачакай, я — з табою...
Толькі крылы зашыю.

## Алеся
## СЕРАДА



*Нарадзілася ў 1983 г. у Мінску. Вучыцца ў ліцэі пры БДУ.*

*Друкавалася ў часопісах «Першацвет» і «Маладосць».*

### ШЛЯХ У ЛЕСЕ

Цёмны бо.
Абшар спакою.
Тут не любае —
любое,
хоць на кропельку
жывое,

прывітаеш,
як сваё...
Ноч вуркоча за табою, набіраючы ў валлё
зоры-зерне, ветры-восці, косці, лісце і галлё...
Ноч спыняе ўсё жывое —
у бязлітасным спакоі
ноч спыніла, ноч схавала...
Шлях ты скончыў. Што цяпер?
Засталіся
за табою —
бор калючы,
елкі-хвоі...
Аджытое,
нежывое.
Без нікога.
Без цябе.

## АНАРХІЯ НАТУРАЛЬНАЯ

Узыходзіш на човен ты
ці стаіш на мосце ты —
вада цёплая, простая...
А паспрабуй дно знайсці навобмацак.
А паспрабуй рыбу злавіць вёсламі.

Даганяючы сонейка
разам з дрэўцамі гонкімі,
ці не хочаш успомніць ты,
што пад сонцавай абалонкаю?
А паспрабуй кветкі паліць воцатам.
А паспрабуй лісце спаліць восенню.

Ты трымаешся з годнасцю:
што ні ўбачыш — пакратаеш,
што ні схочаш — адолееш,
хоць і сам вінаваты б быў.
Ды згубіўся ў вадзе...
Дзе? Нідзе. Дзе-нідзе

без дазволу твайго —
ключ ад свету ўсяго.

## НЕБА З ВОЛАВА

У чорнай вадзе пад акрайчыкам месяцу сітнім
ніколі нікога ніхто не кахаў — і шчаслівы тым.
«Спі...» — я праспяваю бязгучна, і гэта не проста так;
спакойная, як кукалка шашалю спіць пад бяростаю,
упэўнена, быццам каменне надзейнага берагу,
пакорліва, бы спадзяванні адчайнага верніка.
Бо цалкам магчыма, што ў небе, бы з волава вылітым,
ніколі нікога ніхто не кахаў — і шчаслівы тым.

* * *

Яшчэ крыху, яшчэ тры словы —
і застанемся мы адны...
Згасаюць зубравыя зоры
і адміраюць карані.
Маю зямлю хавае морак.
Маіх сяброў — як не было.
І ты, мой гонар і апора,
вось-вось — ды станеш на крыло...
Ты б адляцеў, крылаты рыцар,
так хутка, як і мае быць,
ды я — харошая дурніца:
ні збыць, ні звабіць, ні забыць.

## СОРАМ

Чаму так цёмна?
Расплюшчы вочы!
Няхай хто хоча —
за намі сочыць!
І хай жа спяшаюцца тыя, каму дрэнна бачыцца.
І хай жа сыходзяцца пысы сабачыя...

Дзе нам баліць —
у іх дрыжыць!
Я абяцаю: у горадзе тым, дзе мы ёсць, ім не жыць!
Пахмельны сіндром іх не паражыве нашай раніцы.
Каб перакуліўся сусвет, трэба нам толькі здарыцца,
каб перагарнулася часу старонка, каб моц твая
дурную ды рупную цішу ўзарвала грымотамі
і не засталося нічога,
што нам назаляла б дакорамі...
Мой любы, а можа, і добра,
што нам так нячаста — не сорамна?

## РУШНІК

У зорным небе над белай вежай
мая адсутнасць не мае межаў.
Няхутка, чуйна, бы гуку рэшта
з майго сусвету знікае нешта —
нібы маё: ці то час па кроплі,
ці белы дым ад святой каноплі,
ці проста зрок... Ранак цені зрушыць,
і прыйдуць колькі людзей відушчых,
на доле чысты рушнік пасцеляць,
перахрысцяцца ды ў неба стрэляць.
І будзе знак ім пра веліч справы —
на рушніку тым мой след крывавы.

## НАТХНЕННЕ

Жыццём агаломшаны,
ідэяй працяты
з надзеяй на горшае
ў родным дваццатым,
у нуль перавернуты
двухтысячнай рыскаю,
пад поясам зернейка
адчуе і выспеліць.

Сабой і не лічачы,
люляючы ў вершах
трывогу — 2000 —
за некага ў першым,
да тысяча лішняга
ледзь-ледзь не дажыўшы...
Няблага і пішучы,
няшмат і напіша.
І пойдзе пад дожджыкам,
схаваецца ў хмары.
Яшчэ не народжаны.
Ужо не цяжарны.
Пакінуўшы першаму,
хто дождж праміне,
кароценькі вершык,
што прысвечаны мне.

## ЗМЯЯ

Пры дарозе — вярба, на дарозе — змяя.
За дарогай у засені — звон ручая.
Уцячэ той ручай, ды не зрушыць змяя.
Змізарнее і згорбіцца постаць мая.
І, збялелая ўпораз ад крыўды сваёй,
упаду я ў зямлю, нараджуся змяёй.
І атруту пралье, не стрымаўшы спакой,
той паўзун, што, як ёсць, паравернецца мной.
І ручай забруіць, зазвініць удвая:
свет вялікі, і кожнаму справа свая.

## Андрэй
## СКУРКО



*Нарадзіўся ў 1978 г. у г.п. Крывічы, што на Мядзельшчыне. Скончыў філфак (славянскае аддзяленне).*

*Друкаваў у «Першацвеце» артыкулы й вершы. Выступае як бард.*

* * *

Вецер кідае лісце ў вокны,
пад дажджом каштаны дрыжаць...
Я стаміўся ад гэтай восені,
я стаміўся цябе кахаць.

Спадзявацца, у нешта верыць,
твой сустрэўшы халодны пагляд.
Бачыць сонца ў паўзмроку шэрым,
шлях шукаць да вяртання назад.

Для цябе я — пустое месца.
Гэта ясна было даўно.
І ад сцюжы астылых сэрцаў
не схавацца мне ўсё адно.

Біўся дождж аб мокрыя вокны,
вецер штосьці па свеце шукаў...
Я стаміўся ад гэтай восені,
хоць яе ўсё жыццё чакаў.

## САНЕТ

У хованкі з фіранкамі гуляе
свавольнік-вецер. Белыя лісты
якойсьці кнігі, што чытала ты,
са смехам шапатлівым ён гартае.

І сыпле на старонкі цёплы снег
таполевых зазімкаў, што бялее
па ўсіх завулках, парках і алеях,
што падае ў далоні ціха мне.

А я ў вачах тваіх ізноў тану,
і ўжо не выплыць мне адтуль ніколі,
і дна ніколі мне не дасягнуць.

Ды ўжо інакшай і не трэбна долі —
адно імгненне ў вечнасць працягнуць
і ўбачыць сонца скрозь буран таполяў.

## СЛОВА ТАДЭВУША РЭЙТАНА

Аблокамі дыму мой Край зацягнула,
старыя званіцы — і тыя маўчаць.
Тут праўда і годнасць давеку заснулі,
адны крумкачы ў паднябессі крычаць.

Дзе Грунвальда слава? Дзе слава Кірхгольма?
Дзе наша магутнасць? Дзе волатаў род?
П'е шляхта гарэлку і б'ецца на соймах,
ваююць магнаты, галее народ.

Радзіма мая! На дарозе, у пыле
ляжыш, паміраеш у немай журбе.
На горла жалезнай пятой наступілі
суседзі, што білі паклоны табе!

Няўжо не паўстанеш, не ўзнімешся болей
у бляску і велічы славы сваёй?..
Спявае Каложа над Нёмнам аб волі,
ды зменена воля чужынскай пятлёй.

* * *

Удзень, калі Нязнанага мяжа
ляжа ўрэшце каля ног маіх,
скіну з плеч крыжа свайго цяжар,
з ботаў пыл страсу дарог зямных.

Вецер вечнасцю павее ў твар...
Не знайшоўшы тое, што шукаў,
я пайду. Бывай навек, абшар,
дзе смяяўся, плакаў, дзе кахаў.

Што пакіну тут пасля сябе?
Вершаў пару, веру да людзей,
пах раллі на веснавой сяўбе,
цэлы жмут няспраўджаных надзей.

Восеньскае полымя калін,
пляшку, што з сябрамі недапіў...
Гэта ўсё — адзіны мой спамін,
што калісьці на зямлі я быў.

* * *

Калі восень зацягне
ўсё празрыстай журбою
на адным з скрыжаванняў
жыццёвых шляхоў,
лёс дазволіць нарэшце
нам спаткацца з табою
пасля ростані нашай —
роўна трыста гадоў.
Паглядзіш ты мне ў вочы
і ўсё мне даруеш,
зразумееш, што жыў я
табою ўвесь час.
І ніхто не заўважыць,
і ніхто не адчуе,
як па-весняму сонца
ўсміхнецца для нас.
І мы пойдзем з табою
па маўклівай алеі,
і галінамі дрэвы
будуць нас благаслаўляць.
А сляды зацярушыць
залатая завея
так, што потым не зможа
ніхто адшукаць.
Сонца ўвечары знікла
дзесьці за небакраем,
гасне ў хмарах апошні
прамень залаты.
Я іду цераз восень,
я шляхоў тых шукаю,
на якіх мне калісьці
сустрэнешся ты.

# Віктар
# СЛІНКО



*Нарадзіўся ў 1972 г у Івацэвічах. Скончыў Мінскі дзяржаўны універсітэт імя Максіма Танка. Жыве ў в. Дружба, што ў Мінскім раёне.*

*Друкаваўся ў часопісах «Першацвет», «Крыніца», «Маладосць», у альманаху «Дзень паэзіі». Аўтар паэтычнага зборніка «Апошні снег» (1995).*

## ВЕРШ НА РАЗВІТАННЕ

— Сустрэнемся на плошчы Перамогі,
сустрэнемся ля Вечнага агню...
Так, мы з табой зусім як піянеры.
Дык чым мне вечар твой заняць,
дзяўчынка?
Я павяду цябе, куды захочаш ты.
У філармонію, а можа, у тэатр?
Калі захочаш, сходзім у кавярню —
лікёру возьмем і лімона з цукрам.
Не хочаш? (Што ж, табе ў душы я ўдзячны.
Паквапіцца пакуль не здольна ты
на бедныя студэнцкія фінансы.)
Пасля цябе праводжу я дахаты.
Так, гэта проста звычка між людзей
ці, кажучы інакш, адвечны рытуал.
Трымаць мяне ты будзеш за руку
і пачытаць свае папросіш вершы.
Хіба табе адмоўлю ў гэтым я?
«Я — твой лісточак глогу ці вербены,
зламаная, раструшчаная кветка,
я — памяць пад абцасамі дзяўчыны...»

Куды з табою мне пасля ісці?
Ты ж ведаеш, што правілы ў такой
гульні — звычайныя. Яны ж усім вядомы.
Я спадзяюся — мабыць, і дарэмна —
на тое спадзяюся, што ў цябе
спакою, такту хопіць, каб маўчаць
аб тым, пра што так часта мы гаворым,
і не пытацца: «Ты мяне кахаеш?»
Ты не пытайся — гэта супраць правіл.

Ты ведаеш, я так люблю гуляць
па горадзе, без мэты і без сэнсу.
У гэтым сэнс — забіць, забіць свой час
(калі назваць такое можна сэнсам).

Сказаў паэт: «Так у жыцці бывае —
калі не ведаеш ты, як забіць свой час,
твой час цябе паціху забівае».
Ты ведаеш, я так люблю гуляць...
Чаму з табою? Я табе скажу.
Ты — першая, якую я сустрэў.
Ты не пакрыўдзілася? Ну і дзякуй Богу.
Калі б мяне і не сустрэла ты,
а я цябе — зусім жа не было б
не тое што няшчасця, а нічога,
аб чым хвіліну варта шкадаваць.

Такіх, як я, хапае ненадоўга,
таму ты не трымайся за мяне.
Пасля мяне сама ты адштурхнеш
і пойдзеш, і цябе я не паклічу.
Я — сакавік, якому ўжо ніколі
не стаць красавіком. Што, красамоўна?
Я прыпыніўся ўжо ў сабе самім.
Вось я іду — а хочаш, усміхнуся?
Вось я іду — а хочаш, пацалую?
Калі смяюся — крывіцца мой рот.
Ты думаеш, я тут? Мяне няма.

Так, да цябе ў мяне была дзяўчына.
Не помню я — а ці кахаў яе?
Ты ведаеш, мне памяць узнаўляе
пах валасоў, усмешку, вочы.
А тое, што стаіць за гэтым словам...
Яго не помню — разам з ім я знік.
Я там застаўся — можа, не вярнуся.
Аб чым трывожуся — баюся, не вярнуся...

Пытаешся: былі сябры ў мяне?
Мае сябры? Яны былі, вядома.
І кожны з іх чамусьці выбраў лёс
быць свечкаю ў журботны гэты век —
век электрычнасці і яркага святла.

Так, так, яны свяціць хацелі ў цемры.
Але вакол было святло — таму
яны пайшлі, пайшлі адсюль у цемру
і там гараць, і свецяць мне адтуль,
і клічуць, клічуць, клічуць, клічуць, клічуць...
Пытаешся: а ці пайду за імі?
Не, не пайду — для гэтага слабы.
Пытаешся, што я яшчэ люблю?

Я на тваім каўнерыку люблю
любую парушынку ці сняжынку.
Жыццё мяне вучыла вельмі доўга
любіць і заўважаць усё малое —
вялікага не дадзена ў жыцці.
Люблю кавярні, дзе гарыць святло.
Там ведаюць мяне, але не любяць.
Чаму? Ну, гэта цяжка растлумачыць
так хутка. Я ж усім — чужы,
мой позірк адштурхоўвае жывое.

Табе пара, напэўна. Поль Верлен,
напэўна, склаў бы верш на развітанне.
Я ж не магу, бо знішчыць не хачу
расстання спеўнасць вершамі слабымі.
Такіх, як я, хапае ненадоўга.
Забудзь усё, што я табе казаў,
ды, мабыць, акрамя апошніх слоў:
«Такіх, як я...»

## КАХАННЕ

Не стаць зямлёй,
з якой ты будзеш піць сок.
Лепей — сонцам, калі табе холадна,
і ветрам, калі — спякотна.

* * *

Мне беспрытульна тут.
Здранцвелы,
я спадзяваўся ўбачыцца з табой.
І шлях зваротны стрэчу падарыў:
ты асцярожна
кволую свячу
нясеш
і затуляеш
ад мяне.

## Вікторыя
## СОТНІКАВА



*Нарадзілася ў 1979 г. у в. Ізабеліна, што ў Кіраўскім раёне на Магілёўшчыне. Скончыла Рагачоўскае педагагічнае вучылішча. Працуе настаўніцай.*

*Друкавалася ў «Гомельскай праўдзе» і часопісе «Першацвет».*

### ЗІМОВАЯ НОЧ

Кудысьці за лес
закацілася сонца,
і дзяцел ледзь чутна
дзяўбюе па сасонцы.

Вакол цішыня,
толькі голле шуміць
ды вецер-гуляка
бубніць і бубніць.

Вось месячык срэбны
на небе ўзышоў.
Зімовая ноч
пачалася ізноў.

## ВОСЕНЬСКІ ПЕЙЗАЖ

Лес застыў у адзіноце —
прадчувае сон.
Нібы вогненны, між елак
прытуліўся клён.

Дзесьці там, за воблакам,
баюць жураўлі
казкі пра далёкія
цёплыя краі.

Ахінуў змрок хусткаю
рэкі і палі.
Сумная і хмарная
восень на зямлі.

## Алесь
# СПІЦЫН



*Нарадзіўся ў 1979 г. у Мінску. Скончыў ліцэй №158. Вучыцца на біялагічным факультэце БДУ.*

*Друкаваўся ў часопісах «Бярозка»,«Першацвет», «Маладосць», у штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва».*

* * *

Я вокам абшар і нябёсы абмераю  
і зорысты пыл снягоў.  
Бог даў беларусам — больш, чым імперыю.  
Ён даў беларусам — любоў.

Хай неба начное пакрыецца млечнасцю
і прыйдзе світанак, як госць.
Бог даў беларусам болей, чым велічнасць.
Ён даў ім сваю прыгажосць.

Хай зло над сусветам часова ўладарыць
і сее бязлітасны гвалт.
Бог даў беларусам больш, чым уладарнасць.
Гасподзь міласэрнасць ім даў.

* * *

Галубы —
скрозь нябёсы.
Іх крылы ляжаць на паветры:
адно — пярыстае,
другое — вогненнае,
світанкам падпаленае,
сонцам аблашчанае.
Грамадзяне вятроў —
іх не стрымаць...
Я гляджу на іх,
чыстых зданяў нябёсных
здрады не зналых.
Божа,
даруй, што не варты іх бачыць.
І вочы
да неба
ўзводзіць...

* * *

Маўчыць зімовая прастора.
Імкнецца з ветрам снегапад.
І снежань смуткам і дакорам
сусвету засыпае сад.

Куды ж імкнецеся, сняжыны?
Куды вы клічаце душу?
Згаліла восень скрозь галіны
і прагу летнюю маю.

Куды імкнешся лёс? Дарэмна...
Куды завеш мяне ізноў?
Цяпер я стаў нібыта дрэва
на межах выпадкаў і сноў.

* * *

Мне на грані між снамі й явай
зноў прымроіўся змрочны пакой.
Ён быў колеру чорнае кавы
з блікам свечкі на каве густой.

Кім, навошта, адкуль мне дасланы
гэты мрой? Я не ведаю сам.
Там паветра густое, як кава, —
змрокам чорным ад краю да дна.

Толькі свечка той змрок парушае —
блікам светлым на каве дрыжыць...
Хтосьці ранку ля свечкі чакае.
Хтосьці змрочнаю ноччу не спіць.

* * *

О, дзіўны сшытак
туманных дрэў!
Гартаю старонкі дзён,
шукаючы рай далёкі
на паперы старонак тваіх
пасівелых...

* * *

Зрываюцца гронкі дамашняй рабіны,
як кроплі крыві на бялюткі паркаль,
і свецяць апошняй лістотай асіны,
і моліцца дуб — адзінокі святар.

Туманныя спевы без слоў і без грання,
хусцё паграбальнае, сонны сусвет,
самотныя думкі ды крык развітальны,
слязою туманнай заплаканы след...

Так восень туманам сівее, малюе
няісныя постаці ў белай імгле
і белай бязглуздзіцай далі рыхтуе
халоднаму подыху — новай зіме.

## Надзея
## СТАРАВОЙТАВА



*Нарадзілася ў 1976 г. у Мінску. Скончыла філфак БДУ. Цяпер — аспірантка Інстытута літаратуры. Працуе ў Нацыянальным інстытуце адукацыі.*

*Друкавала прозу і вершы ў «Першацвеце».*

* * *

Не турбуйся,
не завіхайся,
не зайздросць людзям,
а толькі — птушкам.

Не шкадуй,
што каханы не асыпае
святаяннікам.
Кожнаму —
хоць раз у жыцці
падорань букет.
Букет —
з цотнай колькасцю
кветак.

## ВАР'ЯЦТВА

Калі памірае бацька —
робяцца вочы нямымі.

Калі памірае бацька —
робіцца мова сляпою.

І ад вачэй да пальцаў —
ты, як глухое рэшата.

І ад вачэй да ўздыху —
ты, як рэшата слёз.

Як суцэльны сувой мітрэжацца —
месяц, туман і анёл.

А бацькава душа —
прыгрэлася ў немых вачах дзяцей.

І сніцца агонія, як кпін лёсу —
яна крычыць: «Гэта няпраўда...»

І тая ж усмешка лёсу ціха шэпча:
«Праўда!»

Гэтак бывае,
калі памірае бацька.

## СТОМА

О амбра глебы, дай запал!
Начны экстаз складзе санату.
Заззяюць зоры, як апал,
як бляск ад велічных дукатаў.

О Млечны Шлях! Паміж прысад
ён лёг руном залатабелым.
А моцы глянуць на парад
не даў. І сэрца так збалела.

Імкнецца ўвыш начны эфір
сваёй празрыстаю адхланнай.
І золку небнага сапфір
прымроіцца праз знічкі-манну.

І ціха трызніцца сюань*,
лунае змучана Псіхея.
Гармонія дашле талань —
я перад веліччу здранцвею.

* * *

Кудзер валасоў ільняных
шлю табе, каханы мой.

Буду хай я так з табой
назаўсёды паяднанай.

Хай у цішыні начной
разліецца пах духмяны...
Кудзер валасоў ільняных
шлю табе, каханы мой.

---

* Сюань — чорна-чырвоны колер перадсвітальнага неба.

* * *

Упала знічка на калені —
мой не сціхае калаўрот:
праду ці ніткі, ці маленні,
ці йду на змрочны эшафот.

У кроў я вусны згаварыла,
і цела здратаваў мне дрот.
Не трэба мне птушыных крылаў —
не абляцець мне эшафот.

Хай кпіць з мяне лайдак і вісус —
мой не сціхае калаўрот...
Я з дзіркамі ў руках, Ісус мой,
іду на змрочны эшафот.

## Ілона
## СЦЯЦКО



*Нарадзілася ў 1976 годзе ў Тбілісі. Скончыла Мінскі фінансава-эканамічны каледж. Завочна вучыцца на эканамічным факультэце ў БДУ. Жыве ў Баранавічах.*

*Яе першы паэтычны зборнік «Галінка язміну» быў змешчаны на старонках часопіса «Першацвет» у 1997 годзе (№ 9). Падрыхтавала новы зборнік вершаў.*

* * *

Агонь — дзеля агню!
Агонь — дзеля жыцця!
Агонь — дзеля таго,
каб распачаўся свет...
Напружаным крылом
працяўшы вышыню,
злучаецца з вясной
над сеткаю планет.
Ён — моц, стыхія, гнеў!
Ён — вой, віхор... Ён — спеў!
Гарыць, стварае, мрэ...
Ён — святасць, ён — і грэх.
Ён — хуткасць далячынь.
Ён — полымя, ён — плынь...
Агонь — дзеля агню!

* * *

Кот мой расцягнуўся на стале пісьмовым,
кніжку гараскопаў ён паклаў пад галаў...
Паўраскрытым вокам сочыць кот за снамі,
а зіма па вокнах сочыць за катамі.

* * *

Тушыць агні веснавая дарога!
Веліч і свята бадзёрага ранку.
Дрэвы, свабодныя ў замшавых тогах,
выйшлі насустрач світанку.

Вые паветра сцюдзёнай парой.
Просяцца рукі схавацца ў кішэні.
Холад бярэ і ўзнімае настрой
разам на ўсе запрашэнні.

Зімна, бы ў лютым. Зялёная здань —
гэта вясновая панна-кабета.

Гэй, красавік, ты з кішэні дастань
хоць бы кавалачак лета!

* * *

Маланка і жорсткая праўда —
родныя мне:
успыхнуць пажарам —
і быць вайне.
Заходзяцца фарбы —
нябёсны жах...
Нясецца нястрымны
чырвоны птах!
Стыхія, стыхія!
Vivat жа ёй!
Агонь і бляск —
заўсёды са мной!
І поўня свеціць.
І месяц — у ёй.
І сонца квецень
ліхтарных мрой!

* * *

Круціцца ў дрэвах патлатых поўня,
цемра лунае над горадам сонным,
дзікія зоры — начныя штрыхі —
рвуць цішыню, як штандары — штыхі.

Лье навальніца крывавыя слёзы —
вобраз агню з навальнічнага мозгу
рве на кавалкі маланкамі свет...
І скаланаецца пояс планет.

Гора ці шчасця блакітнага грому,
Бога ці чорта, а мне — не вядома.

Месца змянілі кароль і ладдзя.
Я ж — сумны воін, не цар, не суддзя.

* * *

На світанні далёкім цудадзейнае слова
заплялося з раслінай душы каранямі,
дзе жывая замова злучае выток
рэчаіснасці ведаў з агнямі.

* * *

Гэй, мая адважная сяброўка!
На кані ляціш наперагонкі...
Стрэлам пераносіць чыстакроўка
праз ручво царыцу-амазонку.

Капытамі хвошча кабыліца,
пыл ляціць з-пад залатой падковы.
Узнімае лёгкі лук царыца —
накрывае стрэламі галовы.

Спапяляе вогненныя гронкі
кроў з мячэй, шаломавыя спевы...
Перамогу славяць амазонкі —
хуткія, праслаўленыя дзевы.

* * *

Ёсць стыхія вакол мяне,
унутры ёсць маёй істоты...
Палыхае-гарыць, заве —
згінуць каб і ўваскрэснуць потым.

Спасцігае, губляе зноў —
попел кідае дрэвам пад ногі.
Закіпае душа і кроў...
Мы цяпер — агнявыя богі!

## КАХАННЕ САЛАМАНДРЫ

За што люблю істоту
стыхіі не сваёй?..
Аб гэтым мару ўпотай
ля схову пад зямлёй.

Садзіцца сонца ў небе,
і я гару пад ім
агеньчыкам на глебе
іскрыста-залатым.

Ён — уладар паветра,
а я — служу агню
і ў патаемных нетрах
хаваю цеплыню.

У лесе на паляне
чакаю цэлы дзень,
калі ж сюды загляне
лятучы карабель.

Ну — вось і ён! Мы разам
шчаслівыя, бы ў сне...
Стыхійныя наказы
каханне абміне.

Ды што стыхій нам воля,
паветра і агню —
па сонечным раздоллі
ляцім у вышыню!

* * *

У вандроўку збіраюся сёння,
каб на схіле мінулага дня
ўплесці месяца бледныя промні
ў сваё сэрца... А ў ночы ўжо я,

не зрабіўшы ніводнага кроку,
апынуся ў далечы такой,
што мяне ані людзям, ні Богу
нельга будзе пабачыць у ёй...
Адпачыўшы ў глыбінях дзівосных,
я вярнуся шчаслiва назад
у прыволле сцяжынаў росных,
да штодзённых пакутаў і страт.

## ДЗІЦЯ РАЎНАВАГІ

### 1

Адкрыць ці пахаваць
мой гук, імя, натхненне,
пакінуць слаўны крыж,
што ведаю — забыць.

Ці, можа, запыніць
празрыстае імгненне
і легкадумным сном
мой свет перарабіць.

Чаму марнею я
падчас вясны свавольнай?
Чаму спакон вякоў
трапляю зноў сюды?

Гаротная зямля
надзеі паднявольнай,
паходы чужакоў
і чорныя сляды...

Чаму, чаму, чаму?..
Зачынены старонкі.
Кавалкі ўсіх прычын
ад выбуху ляцяць,

а вінаваты ў тым —
запалкі са скарбонкі:
іх запаліла зноў
пакутнае дзіця.

### 2

Бывай, пакутнае дзіця!
Тваю душу заклала я
паміж старонак светлай кнігі.
Перапляценне двух агнёў —
у свет халодных камянёў
нясі чакальны міг адлігі.

* * *

І смерць, бывае, побач ходзіць,
каля агню сядзіць з касой.
Глядзіць скрозь полымя... Ды годзе
мне болей гаварыць аб ёй.

Яна прыйшла. Стаіць ля свечкі,
каб чыйсьці ўсмерціць шлях зямны
слязой журботнаю знявечыць...
І вось — мы з ёй зусім адны.

Я — ад людзей. Яна — ад Бога.
Я — на зямлі, яна — наўкол.
Маўчу... Яна ў адказ — нічога..
Гарачы воск цячэ на стол.

Халодным позіркам на свечкі
глядзіць учорнена, як здань.
І зрэнкі — спелыя парэчкі —
свідруюць роспачы адхлань.

Агонь і смерць, вада і сутнасць,
зямля, жыццё, паветра, шлях...

Я адчуваю крок пакутны —
хто там ідзе: Яна ці Я?

* * *

Гонар не страчу, кароны не дам,
вораг.
Я кіну з ёй на каменны дыван
гора.
Памятай, згінуў апошні кароль.
Я нескароны!
Хай разбіваецца разам са мной
жэмчуг з кароны.
Згоды не будзе, сумленню майму —
смерць дапаможа!
Літасць, мой вораг, пакінь таму,
хто пераможа.

* * *

Я з мовы здымаю праклёны
і слаўлю адданых дзяцей,
радзімай сваёй акрылёных
на аброну яе.

Няхай і ў часы ліхалецця
плынню святарнай ракі
родная мова ліецца —
змые людскія грахі.

Слаўлю — і чую, і бачу,
што праз часіны імглы
скончацца боль і нястачы,
вернецца гонар былы!

* * *

Калі адбіраюць надзею маю,
не плачу я болей,
бо ведаю:
з крыніцы, не збуджанай
сённяшнім болем,
святую ваду першароднасці п'ю.

* * *

Чуллівым словам цешыцца паветра.
Было мне добра, а цяпер — не веру
пужліваму, замёрламу балету
невераґодна-казачных містэрый.

Жыццё — даволі простая складанасць.
І хараство, не звязанае з цудам,
яму здаецца рэччу дасканалай,
якую вечнасць памяншае брудам.

А мне ўсё роўна — двухбаковай фарбы
быць не павінна па маіх законах.
А хтосьці — не жадае жыць без праўды,
спрачаецца з няпраўдаю да скону.

* * *

Я не хачу жыцця зямнога
і паўсядзённай мітусні.
Адной хвіліны мне замнога,
каб зажурыцца ад хлусні.

На скрыжаваннях чэрці брэшуць —
усё ж на свеце праўда ёсць!

Яна душу мне грэе вершам,
а я — душу ў кішэнях злосць.

* * *

Ціхая вада па кропельцы сыходзіць.
Кропляў чарада ў старажытным годзе.
Там няма вакол ні душы — заціша.
Не хапае слоў спавядацца цішы.
На руцэ маёй — круціцца стагоддзі.
Кропелькай-слязой немата сыходзіць.
Хутка ўжо скажу чулае прызнанне
дробнаму дажджу аб вялікай тайне.
Зведаўшы паток сонечнай стыхіі,
я знайшла выток праз шляхі крывыя,
і цяпер са мной — вечная дарога
з новай дабрынёй ля агню старога.

* * *

А на небе — сонейка
свеціць-ззяе роўненька,
свеціць слаўна-ветліва,
ветлівай парой!
Пад касымі промнямі
я танцую полечку,
пляскаю ў далоні —
радасны настрой!

* * *

Я зорку вынайду —
і назаву Ілонай.
Не ў гонар — так,
няхай сабе гарыць...
За кіламетраў
дзесь мільён-мільёнаў,
у поўневай — ці нейкай там — зары.

Паслухайце!
Як слаўна і — як дзёрзка,
задраўшы галаў,
уначы ідзеш.
А з вышыні —
падміргвае мне цёзка:
— Уніз глядзі!..
Бо раптам упадзеш.

## ІМГНЕННЕ

Раніцою гляджу ў акно...
Што ж я сёння дзівоснага бачу?
Анічога. Усё — як было.
Толькі ўсё ж такі крышку іначай.

Так, інакш, чым было тут раней —
міг не можа ізноў паўтарыцца.
Я пішу пра імгненне цяпер,
а яно ўжо кудысьці імчыцца.

Так, зусім не прыкметна яно,
але ў памяці я захаваю —
хай цяпер, хай хоць гэта адно:
вось пішу, а пасля прачытаю.

* * *

Ты ведаеш,
мае палаюць грані —
ва ўсе бакі сваё снуюць
праменне!
Праз іх мне будзе
доўгае выгнанне
за свечку згаслую
майго натхнення.

За тое, што вузлом
звязала словы,
у лічбавай труне
іх пахавала,
прыдумала
бязглуздыя высновы —
з'іначыла і сшыла...
Памяняла
свой шлях малы —
на нейкае зацьменне.
Вакол хаджу і думаю:
бывае
праз лёс бацькоў
такое паўтарэнне.
А што, мой сябра-лёс,
цяпер параіш?..
У маці — талент быў,
дык — відавочна:
я запісы яе чытала,
сшыткі,
што на паліцах
паміраюць моўчкі —
мінулай думкі
залатыя зліткі...
Вось чыркаюць гады,
нібы запалкі
на тое на нябёсах
хтось паклаў...
Не скончаны на мне,
як быццам, цалкам
той матчын
слова-вобразны запал!

* * *

У свеце іх няма нідзе.
А па-за светам, па-за светам —

там пустата. Няма людзей.
Няма жывёл, раслінаў, кветак.
Хто там знямеў — у цемнаце?
Якім жыццём працяты нетры?
Не бачу — іх няма нідзе.
І нават тут, за гранню света.
Ні каля кропкі. Ні вакол.
Ні ў ёй самой...
— Дык дзе ж, скажыце?
— Яны ў зямлю загналі кол
на іншай хвалі Перажыцці.
— А што такое Перажыць:
пачвара, дэман ці хімера?
— Яна — наш час, які бяжыць
без нараканняў і намераў.
Усё запісана ў вяках:
калі яе кавалкі скласці,
то можна свет перапісаць
і пераблытаць боль і шчасце.
— Не разумею, раскажы...
Дык я ў якім жыву памеры?
— На варыянтавай мяжы
адной зямлі ставокай сферы.
— Удакладні: калі памру,
мае шляхі дабра і зла
па кругавому палатну
сыдуць іголкай без вузла?
— Праз безлічона многа будзен
твой шлях скіруецца ўгару —
тады ўжо ты сабой не будзеш...
— Дык што — у пекле я згару?..
То за які такі ўжо грэх?
— Няма грахоў у праўды словах:
ты — пойдзеш чысцінёй уверх.
Я ж — у зямлю... Адначасова.

* * *

Мой анёлак агню,
так мяне пакараць!
Крылы думкам
маім спаліць!..

Калі будзеш далёка
адзін паміраць —
сэрца маё забаліць
і застыне сляза
на высокай сасне,
і зацягнецца зорны пасеў;
і калі я па зёлкі
пайду па вясне —
я ў вятрыску пачую твой спеў.

Будзе сум сярод кветак,
як чорны павук,
ткаць жалобную сетку,
уплятаючы гук...
І — з атручанай горам
балотнай травы
разгарыцца,
заўецца
касцёр веснавы.

## Таццяна
## СЯМІРСКАЯ



*Нарадзілася ў 1979 г. у Мінску.*
*Вучыцца на філфаку Белдзяржуніверсітэта.*

* * *

Па-за межамі сусвету,
па-за ценямі сузор'яў,
па-за ценямі імгненняў

па люстэрку небасхіла
я малюю твае вочы
паміж шэранню аблокаў,
я малюю вочы ветру
вечнай фарбай бледна-шэрай.

* * *

Дождж за шыбамі млява крапае,
з кожнай кропляй паўзмрок радзей.
Як у холад празрыстай ампулы,
я заключана ў гэты дзень.
І здаецца, імгненні потайкам
п'юць паветра і вузяць шыр —
гэты дзень нерухомым позіркам
застывае ў маёй душы.
Гэты дзень... Я з яго не вырвуся,
але рухаю глыбы слоў,
і сцяну правяраю з пільнасцю,
як танклявую жылу — кроў.

* * *

Горад быццам слязой абмыты,
у маршчынах асфальту вільгаць
і будынкі ўдыхаюць неба,
захлынаючыся блакітам.
Дзень, раскрышаны на хвіліны,
растае, як у шклянцы цукар,
пакідаючы на нябёсах
ружаватую каляіну.

* * *

Цемра. Над галавой
неба з бялявым швом.

Брудны падталы лёд
чорным здаецца шклом,
вецер узор галля
правіць сляпой рукой, —
бледнае цела дня
быццам бы пад карой.

## МЕЛАНХОЛІЯ

Таполяў імклівым пухам,
аблокаў і сонца пажам
ад нас адляцела любасць —
ты нават і не заўважыў.
Ты нават не азірнуўся
на покліч яе надзорны;
ад нас адляцела любасць
пялёсткам іргі ружовым...
Калі сціхне шум машынны,
яна праслізне падманам
па люстрах нямых вітрынаў,
па мёртвай вадзе фантанаў.

* * *

Разлівае блакіт
па люстэрку маёвае ранне,
і здаецца чужым,
як сябрамі пакінуты дом,
мой пакой, праз які
праляцела раз'юшанай хваляй
злая птушка тугі
й скамечанай пенай паперы
заслала падлогу.
Я парваных лістоў не кранаю,
шкадуючы, і,
як карункі, бялеюць з паўцемры
іх светлыя тогі.

* * *

Ужо не лічыць крокаў
паўночная прагулка.
Мы згубімся ў паўзмроку
зімовага завулка.
Пакуль завея ўвішна
нясецца па сцяжынках, —
у час бяззорнай цішы —
схавай мяне ў абдымках.
Нас прыціскае гмахам
калючай сцюжы ўлонне,
і я, як ліст ачахлы,
тулюся да далоні
тваёй.

* * *

Чаго чакаць? Начным святлом
даўно абрабавана цемра,
і цеснае маё жытло
мяне схавала ў кубе цэглы,
і цягнецца маркота фраз,
і, без надзеі затрымацца,
па кроплі ў ноч сцякае час,
як кроў з параненага пальца.

* * *

Абуджаная
маладымі вуснамі золака,
вуліца выйдзе насустрач мне.
Я разарву
пругкія ніткі кокана
над галавой —
сонечная залева
з валасамі маімі спляцецца,
цені станчэюць, сціскаючыся да абрысаў

неверагодна завостраных,
дзюбамі чорных буслоў
смокчучых вадкасць блакіту
аголеных дрэў.

* * *

Пальцы — як промні,
лёгкая гнуткасць.
Клавіятура
сонца і снега —
водгук і водбліск
кожнага руху.
Тонкіх галінак
перапляценні
зніклі ў лятучым
белым бязмежжы,
снег і далоні —
цнота палітры.

Пругкія хвалі
крокаў аддаляць
профіль і рукі
ў лёгкім палёце.
Мне застанецца —
клавіятура,
белая бессань
сценкі зімовай...

* * *

Лямпа плыве
глыбокаводнай рыбай,
плавяцца плямы рэчаў,
плечы
нікнуць, як ствол расліны,
спіны
сценаў

гібкія, як прагіны
дрэваў,
дзверы вуснамі дзір-праёмаў
хціва ўдыхаюць цемру,
ценяў перапляценні
сцены
поўняць,
целам рэчаў
цесна, як на карціне,
ціснe
сажай павекі поўнач.

## ЗАМОВА

Пакладзіце яго на водшыбе,
засланіце яго ад сноў,
галасамі сямі вятроў
загадайце яму не ўмерці.
Пазалоту адслоіць сонца,
дзень скрывавіць сваё аблічча,
неба, у празе самазабойства,
на аблокі сябе раскрыша —
загадайце яму не ўмерці!
Налятаючы стужкай вузкай,
віхор пошасці, віхор пусткі,
бы плаціны, зрывае словы
і растрэсквае крыкам вусны —
уратуйце яго ад смерці!
Ён так спіць нерухома...ціха...
не кранайце яго далоняў...
пазалоту адслоніць сонца...
пакладзіце...

## У ПЕРАКУЛЕНЫМ СВЕЦЕ

У перакуленым свеце
дзьмуць маразы з-пад дахаў

і неабсяжнасці неба
люта зайздросцяць столі.
У перакуленым свеце
тупа-няўхільныя рукі
рубяць азяблым птушкам
безабаронныя крылы.
У перакуленым свеце
цяжка стаяць на месцы:
шэры павук вакзала
цягне ў паўзмрок вагонаў,
і ліхтароў каметы,
бляклыя, як надзеі,
у перакуленым свеце
хутка мінаюць вокны.

* * *

Хваравіта-бледным ранкам
будзе ціха хлюпаць слота,
я прачнуся ад павеву
падступаючай маркоты.
Сяду — і ўнутры адчую
жудасную нерухомасць:
чорным маркерам адчаю
перакрэсліцца свядомасць,
захлынаючым дзевятым
валам скаланецца цела, —
зорка, што ў маім прадонні
танцавала, —
        скарчанела.

## Трыфан
## СЯРГЕЕЎ



*Нарадзіўся ў 1980 г. у Мінску.*
*Вучыцца на філфаку БДУ.*

### САМАСТОЙНАСЦЬ

Самастойнасць
сама знайшла мяне,
але спачатку
я не разумеў гэтага,
і быў

лялькай-цацкай у руках
Самога Сябе.
А зараз —
я не бачу розніцы
паміж
лялечным і жыццёвым.
гульнёй і працай,
рэчаіснасцю і сном,
бо ўсё змяніла Яна —
Самастойнасць, якая
прыйшла
так позна, позна...
І так рана, рана.

## У ЗАБЫЦЦІ

Асцярожна, дзверы зачыняюцца.
Наступная станцыя — Кастрычніцкая...
Наступная станцыя — Кастрацыя
ўмоўных
духоўных вобразаў.
Пялёсткі ўнутранага подыху,
што ляцяць у небыццё,
зневажаючы ўсе законы
зямнога прыцягнення.
Два люстэркі
насупраць
адзін аднаго і —
выбух.
Гэта ўзарвалася
лямпачка майго мыслення.
Не вытрымала двайнога
працідзеяння
ў гэтым Пустым Космасе,
імя якому — Хаос.

## 31 ЧЭРВЕНЯ

Быў дзень —
і я ў ім таксама быў.
І нават ясна не ўсведамляў,
што зрабілася
з маім небыццём —
яно сталася
такім рэальным і ярка афарбаваным.
Гукі незямнога сусвету
адразу стала чуваць.
Я не ведаў,
што зрабілася са мной.
Бо гэта быў дзень незвычайны —
31 чэрвеня...
А ці скончыўся ўвогуле ён,
той дзень?

## СУМНЕННІ

Гэты шлях —
гмах
нявыпрастанага крыла,
што было
кімсьці падрэзана.
Абодва: я і мой анёл-ахоўнік
засталіся
на паверхні зямлі,
а задума была іншая:
кудысьці ляцець
без пэўнага маршруту —
абы ляцець
і рэзаць
паветра.
Нечая Думка
скамячыла ўсё гэта.
Хтосьці пажадаў,
каб мы засталіся сам-насам

з сумленнем,
побач з якім — сумненні...

## НОЧ

Цемра ночы, здзейсненая
праз немагчымасць утварэння
жывой існасці,
адышла паціху,
пакінуўшы на стале
невялікія кавалачкі
сусветнага смутку,
нечыйга болю,
чыйгосьці адчаю і майго
непаразумення.
Ноч забірае страчаныя назаўсёды
шматкі нашай памяці,
існаванне якой
здаецца нам неверагодным,
бо неверагодна
ўсё на свеце.
Засталіся агузкі
начной прысутнасці,
але і яны
паціху некуды паплылі,
пакінуўшы ўсё на сваіх месцах.
Так нічога ноч з сабой
і не ўзяла,
акрамя майго сну.

## Аляксандр
## ТАРЭЛКІН



*Нарадзіўся ў 1980 г. у в. Мальнаўка на Мсціслаўшчыне. Скончыў у 1997 г. Доўгавіцкую СШ і паступіў на гістарычны факультэт Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А.А. Куляшова.*

*Друкаваўся ў газеце «Універсітэцкі веснік» і калектыўным зборніку «Близко к сердцу». Прымаў удзел у рабоце семінара маладых літаратараў «Іслач-2000».*

* * *

«Тут Бог жыве», —
вы мне казалі.
І я паверыў,
мабыць, нездарма.
Тут Бог жыве.
Тут — наша зямля.

* * *

Сядзець яшчэ не надакучыла —
устану, калі захачу.
Буду глядзець у акно —
і не ўбачу нічога.
Буду слухаць людзей —
не пачую нікога.
Стану ўзірацца ў сябе,
думаць пра штосьці.
Я пачую ўрэшце:
хрумсценне галінак,
шэпт сухога чароту,
падзенне кропель цяжкіх
з зялёнага лісця —
гэта мая душа прайшла.

* * *

— Чаму не размаўляеш па-беларуску
ты, беларус?
— Людзі пачнуць азірацца.

* * *

Спрэчка была такая:
я даводзіў яму, што
мова мая — жывая.

А ён даказваў адваротнае:
«Гэта — клёкат белых буслоў,
што збіраюцца ў вырай апошні;
гэта — зоркі святло,
што ў жніўні наступнага года
ўпадзе ў Дняпро...
Колькі разоў так было.

Я зірнуў у акно —
якая чужая вуліца.

* * *

Калі б усе
мары, думкі, чаканні
юнацкія
пусціць з
дзённікаў, вершаў, лістоў
і проста з галоў —
у прастору, —
светлы, чысты прамень
упаў бы на зямлю
і пайшоў бы першы снег,
і йшоў бы першы снег
усю зіму.

* * *

Галавою на захад,
каб бачыць усход.
Крыж — у нагах,
каб можна было падняцца.
Калі цяжка каму ўставаць,
старыя кажуць,
за апору гэту можна трымацца.
Тут браты ўсе.
І сёстры ўсе тут.

І, калі сонца ўзыходзіць
над лесам далёкім,
над возерам,
над хмызняком,
над шашою —
амаль што ля самых могілак;
калі першыя промні бязбоязна скачуць
між дрэў і крыжоў,
робячы дзіўную светлацень
на помніках, —
колькі душ зліваюцца ў адну.
І жаданне, і думка ў іх адна:
узыход сонца,
кругазварот жыцця,
якое для іх не спыняецца.
І з неба Чыясьці рука
насустрач ім цягнецца.

## Анатоль
## ТРАФІМЧЫК



*Нарадзіўся ў 1976 г. у в. Вялікія Круговічы (Ганцавіцкі раён). Скончыў Брэсцкі дзяржаўны універсітэт. Вучыцца ў аспірантуры Інстытута літаратуры НАН Беларусі.*

*Выдаў кнігу вершаў «Пасведчанне аб нараджэнні».*

* * *

Пачуцці заглушу і боль знясу
маіх з табой адносінаў няўдалых.

Аб гэтым нагадае толькі сум
тваіх вачэй, прыгожых і адданых.

Ды гэта будзе сум самотны мой,
хоць у вачах тваіх ён адаб'ецца,
хоць можа блісънуць ён на іх слязой,
але ў душы тваёй не знойдзе месца.

К табе ён зойдзе — выпадковы госць.
Ды высахне, бы ў весну, тая слота.
І сумную пакіне прыгажосць,
што не назваць прыгожаю самотай.

Не будзеш сумаваць, і не чакай:
табе да восені яшчэ далёка,
яшчэ квітнеючы наступіць май,
шчэ будзе летняя пачуццяў спёка.

Не бойся ты, не праміне цяпло
(хаця яго заўжды здаецца мала),
і ты не ўспомніш, як і не было,
маіх з табой адносінаў няўдалых.

* * *

Я не парушу твой спакой,
бо ты парушыць не дазволіш,
бо ты сваёй не зменіш ролі,
прызначанай табе сям'ёй.

Бо для цябе сям'я — жыццё,
адна яна на першым плане...
Шкада, што на мяне не глянеш
ты з самым цёплым пачуццём.

За кожны позірк гэткі твой
табе дарыў бы я па ружы...

Але я шчасця не парушу.
Я не парушу твой спакой.

## ТРЫЯЛЕТ

Завеі эратычныя зімы
сакавіком пачуцці закружылі.
І — нонсенс — закіпелі ў кожнай жыле
завеі эратычныя зімы.

Мой трыялет, па сутнасці, нямы.
Канстатаваць ён толькі факты ў сіле:
завеі эратычныя зімы
сакавіком пачуцці закружылі.

* * *

*М. Стральцову*

Гальштук у шафу закіну.
Босы — бягом на грудок,
дзе і цяпер канюшыну
косіць знаёмы дзядок.

Зноўку на міг уваскрэсне
ў горле маім камяком
экспапулярная песня
з некалі юным дзядком.

Пішацца далей паэма —
росчырк сялянскай рукі.
Пішацца вечная тэма
цераз пракосы-радкі.

Хай непрывычна мне босым —
пожня пракосаў, бы мазь;
спіртам — гаючыя росы...
Дзякуй за песеньку, Ясь.

* * *

Ну вось — і дрэвы пасівелі
сваёй звычайнай пазалотай.
Канец жыццёвае кудзелі —
спыненне руху калаўрота.

І тчэ забыўшая дзясніца
ўсё тыя ж кветкі — васілёчкі...
Ды ёй жа гэта толькі сніцца —
душа даўно ўжо збегла ў прочкі.

## Ірына
## ТОЎСЦІК



*Нарадзілася ў 1982 г. у Мінску. Скончыла ліцэй імя Якуба Коласа. Вучыцца ў БДПУ імя Максіма Танка — аддзяленне беларускай мовы й дзіцячай журналістыкі.*

*Друкавалася ў часопісе «Першацвет».*

### УСМІХНЁМСЯ?

Усміхнёмся —
нават калі тое здасца нам

непрымальным.
Нават калі гэта будзе
выпрабаваннем
вытрымкі нашай.
Усміхацца, калі забіваюць.
Усміхацца, калі пагражаюць
мёртваму смерцю.
Усміхацца, калі турбуюць
твой труп.
Усміхнёмся, калі абражаюць
нас.
Усміхнёмся, калі пахаваюць
цябе і твой род.
Не! Не трэба ўсміхацца.
Паплачма,
калі нашчадкі, спраектуючы рай,
абыдуць яго, не надкусіўшы
нават мякіны.
Мы ж не здолеем зазірнуць
у будчыню,
калі ўціснемся ў танклявы
райскі праход.

## НА ХМАРЫ ШЭРАЙ...

На хмары шэрай
над мястэчкам Нябыт
у царства маланак плыву я.
Узяць бы адну —
запусціць бы ў люд,
што глытае нябытавы пыл.
Ды ў мякаці хмарнай
утапіўся азадак, а
ногі звісаюць уніз.
Хацелася ўлукаткі
гнаць гэту хмару
далей ад мястэчка Нябат.

Лейцы б — у рукі.
Імчаць бы да скрухі,
каб грымнуцца ў нецвярозасць.
Хаваеш рэчаіснасць
у пойму хмары?
Яна, на жаль, цверазее, застывае там.
Куды ж тады ляцець — у прорву ці ўніз?
Туды, дзе хмара выпускае
па пары кропляў
твайго кахання, тваіх Садома і Гамору.

## АДПУСЦІ МЯНЕ Ў ВЫРАЙ

Маю свядомасць,
яшчэ наіўна-сціплую свядомасць
ты валачэш паўз прамянёва-жыццёвую прорву.
Сваю?
Ступень маёй патрэбнасці табе
ўжо вызначана цацкаю дзяцінства.
Нашто ж так моцна трымаць?
Не трэба. Прадіскаючыся ўглыб
майго страчанага «я»,
прымушаеш глытаць тваю
атручаную прагнасцю іншых жанчын сілу.
Не варта. Адпусці мяне лепей.
Бо маё функцыянаванне прыпынілася
незадоўга да падзення зоркі. Геркулеса?
Тая згвалціла твае жаданні
адпусціць мяне разам з лебедзямі?
Не трымай сябе ўва мне
вычварным пылам, што перапыняе дыханне
ў часы пераходу недапрацаванага кахання.
Адпусці мяне...
Адпусці мяне ў вырай.
Пагаджуся на вырай птушыны.
Пагаджуся на вырай загінуўшых душ.

Нават вырай нязбытных вёсен
няўдалых, халодных прыму.
Адпусці.
Адпусці мяне — я...

## КАХАННЕ?

Не смерць збаўляе ад пакуты —
каханне.
Не сон збаўляе ад стомы —
каханне.
Але...
Збавіць не можа яно
ад пачуцця адзіноты.
Уратуе толькі ўзаемнасць?
У каханні мы раствараемся
і не заўважаем, як надыходзіць
прасмердлы пах смерці.
Мы ўдыхаем яго, калі кахаемся.
Мы перастаем удыхаць яго,
толькі калі паміраем?
Мы проста адчуваем
тонкія вібрысы плюгавай і
кульгавай смерці
ў нашых празрыста-ружовых сэрцах.
Але...
Каляны позірк нябожчыка ў столь
стварае ўражанне пустаты.
Ад чаго хочацца...
Спаць.

* * *

Спаць не хачу.
Не маё прызванне.
Дый раны не загаіліся
ад згубы чарговага

дзіцяці, якому не падабаецца
маё чэрава-маці.
Чуеш, цела?
Ты больш ніколі не будзеш маці.
Тваё прызванне — спаць.
Ідзі, ты ў выгнанні...

## НАША ГІСТОРЫЯ

У гісторыі нашай
не будзе нас, бо
мы будзем проста будучым,
якое ніколі не настане,
якое прапяе ўсяго адзін гімн,
апошнія ноты якога
прыглыне *здзек*,
маленькі — з вялікім мінулым.
Калі пра яго распавядуць у прэсе,
людзей ужо не знойдзеш,
бо здзек праглыне
нашу будучыню,
у якой збіраліся плаваць
нашыя дзеці.

* * *

Шукаючы знясіленую моц,
знайду вясенняй кветкі
першай кволасць.
Агорнутая вэлюмам Псіхеі,
засну ў чаканні лепшых дзён.

* * *

Мароз маляваў на шкельцы
вобраз страчанага часу.

Вобраз маіх спадзяванняў
і крушню пачуццяў,
прыкрытых ільдом.
Мароз маляваў на шкельцы
маё знаёмства з сабою,
дзе тры іпастасі зліліся ў адной.

* * *

Ці справядліва ад Бога
я атрымала скрыль шчасця?
Каб згубіць яго
і потым гібець адзінотна
пад пранізлівы спеў скавыша.
Я себарыт?
Ці ў маіх сілах
пасціцца ў пустыні дзён сорак?
Для чаго, для каго?
Можа, лепей у крывавай магме купацца,
а шчасця не ведаць ніколі?

* * *

Як Нерон для забавы —
падпалю тваё сэрца і вусны,
каб усё палала ў агні.
І прайдуся напрасткі басанож,
пакідаючы мноства апёкаў
на слядах у жыцці.
Як на вуліцы снег растае́ —
маё сэрца становіцца вадкім.
Я спяшаю адпомсціць табе,
пакуль ёсць яшчэ ў сэрцы лёд.
Я прыйду — не, прыеду
на двух колах: кахання і зла.
І згвалтую цябе пацалункам,
а пасля — каханнем спалю...

Мне дабранач жадае ложак.
Сон ляціць скрозь гады.
Я хачу, каб ты ўмёр прыгожа —
не старым, а цяпер — маладым!

* * *

Здранцвелыя думкі
ў абдымках разважлівай ночы:
Пікасо, квадраты, востры прадмет —
каханнем, бы корцікам
думак, шкілет працінаеш
паэт малады.
Любімы... паэт.

# Алег УСАЎ



*Нарадзіўся ў 1982 г. у Мінску. Скончыў сярэдне-адукацыйную школу № 215 і паступіў на філалагічны факультэт БДУ. Удзельнік фальклорна-танцавальнага калектыву «Крыжачок».*

## ФЫ ФУФА...

Напішы чагось на чымсьці.
Абы-што пра абы-штосьці.
Чым дурней, то будзе — лепей.
І галоўнае — без рыфмы.
Зразумела, і без сэнсу:

фы фуфа фафы фуфыфмы...
Многа-мала, болей-меней.
«Перш-А-цвет» мяне друкуе —
я ж паэта самы лепшы!
Хай чытаюць, не зважаюць
на адсутнасць думкі-сэнсу.
Viva, вольнае мастацтва!
Viva, новы чалавек!
У мяне да наваколля
асабісты зрок — праз прызму.
Я — брыда. І я — ахвяра.
І — асілак мадэрнізму!

## ЗАЎЧАСНАЯ СМЕРЦЬ

Неверагодныя творы нябеснай рукою
тварыў паэт, аддаўшыся Музе.
Чытачоў ён ахутаў чароўнай смугою —
і плакалі ўсе, падуладныя скрусе.

Тварыўшы штодня, асунуўся з твару.
І раптоўна памёр, бо жыў з ганарару.

## ПОШУК

Задзяўбло каханне звычайнае!
І памкненні мае ўсе адчайныя.
Надакучылі тоны эратычнага пылу —
лепей я пакахаю лясную Гарылу...
Валасатая морда — хіба не лірычна?
Трошкі жахліва, але — экзатычна!

* * *

Усё жыццё прасіў Бога,
каб сталі казкі праўдай.
Учора спакусіла жанчына:

толькі прыпаў да вуснаў —
ператварылася ў жабу.

* * *

Ты ненавідзіш мяне?
Ты не можаш нават знаходзіцца
са мной у адным памяшканні?
Цябе проста адварочвае ад мяне?
Ну добра, добра… Я пагалю твар.

* * *

Я падараваў табе пацалунак,
але ты не звярнула ўвагі —
паклала яго аўтаматычна ў кішэню.

## Святлана
## ХАМУТОЎСКАЯ



*Нарадзілася ў 1982 г. у Мінску. Вучыцца на сацыяльна-эканамічным факультэце Інстытута парламентарызма і прадпрымальніцтва.*

*Сябра творчай суполкі «Літаратар».*

* * *

Трава падобна на траву.
Карова — на карову.

Дрыгва падобна на дрыгву.
Падкова — на падкову.
А я падобна на душу,
на песню, на прадмову.
Прадмову да твайго жыцця,
якое цяжкім будзе,
бо ты душу не саграваў
і песняў не спяваў ты,
а пра каханне забываў —
хаваў яго за краты...
І ходзіць боль наш па зямлі,
не даючы спакою,
бо мы да шчасця не дайшлі,
бо мы недакахалі,
не захавалі веру мы
і мараю не сталі.

* * *

Ты — мой мастак, маляваў вобраз мой.
Асцярожнай рукой клаў мазок за мазком,
адыходзіў назад і пільней прыглядаўся,
жмурыў вочы, цёр лоб, зноў за пэндзаль хапаўся.
Маляваў ты такую мяне, як жадаў:
у сукенцы бялюткай, на срэбным кані
я лячу, нібы німфа, у казачным сне.
Але што гэта страшнае, цёмнае, злое
так раптоўна з'явілася на палатне?
І паўзе, і паўзе, як змяя, да мяне,
лезе ў рукі, у грудзі, у вочы —
гэта ж сорам, сорам дзявочы
чорнай плямай паўзе ўверх і ўніз,
паўзе ўправа і ўлева, і ўбок.
Яго рух не спыніць, не стрымаць...
Не, каханне не ўмееш ты маляваць —
не ўмееш мяне маляваць.

* * *

Здарэнне,
здзіўленне,
імгненне,
карэнне —
і я.
А прычым тут я?
А прытым, што
здарэнне са мною,
што здзіўленне маё,
што імгненне кару́жыць,
што карэнне задушыць,
не абміне
мяне.

## ЧУЖОЕ НЕБА

Тапелец, утаптаны ў хату,
не ведаў нашто нарадзіўся,
глядзеў скрозь трыкутнік у страту
і чуў, як хтось ціха маліўся.

Душа адляцела на неба,
шукала анёлаў, багоў,
але, не знайшоўшы нічога,
к тапельцу вярнулася зноў.

Яму стала лепей намнога,
калі пальцам шчытападобным
к сабе паманіла дарога
і поп стаў маленечкім, дробным.

Ішоў ён,
а песню спявалі.

Скончылі пець —
пахавалі.

Узраставў бугор за гасцінцам,
зямля быццам сына прымала,
толькі неба глядзела чужынцам,
як цяжка душа памірала.

* * *

Прабач, што пакідаю.
Прабач, што застаешся —
ніякіх сіл не маю.
Нашто за мной імкнешся
і дбаеш пра сустрэчу?
Я ж тут, з табою побач,
і толькі маё цела знікае
ў пустэчу.

* * *

Да цябе прыйду ўночы,
толькі ты не адчыняй:
паглядзі праз дзверы ў вочы —
і страляй, хутчэй страляй
сабе ў патыліцу.

## ТЭЛЕФОН

Тэлефон — гэта цела мужчыны...
Дакранешся — пасыплюцца словы.
Тэлефон — гэта цела мужчыны...
Загаворыш — на выбух гатовы.
Тэлефон — гэта цела мужчыны...
Здымаю трубку.

* * *

Мае рукі — не твае сыны.
Мае пальцы — не твае анёлы.
Мае мары — не твае сны.
Мае думкі — не твае колы.
Мае грудзі — не твае вочы.
Маё сэрца — не твой цуд.
Маё сонца — не ў тваёй ночы.
Мая шчырасць — не твой бруд...
У сабе — не сканаю.
У табе — таксама.

* * *

Да лямпы прыштампую шкло,
на ім — барвовай плямай зоры.
Не ўключай пякучае святло,
глядзі на скрыжаванні і ўзоры,
якіх усе вакол шукаюць,
але не ўдзень, а толькі па начах.
На тыя рысы глянь, што
ўхованкі гуляюць
з маёй цікаўнасцю ў тваіх вачах.
Што гэта? Сум ці роздум?
Можа, смех?..
Ты не здагадлівы:
зіма ў акне — таму і снег.

## АБОРТ

Ты *робіш выгляд*, што кахаеш.
Я *раблю выгляд*, што веру табе.
Мы *разам* да той пары,
пакуль б'ецца сэрца дзіцяці.
Калі яно змоўкне —
*зробім выгляд*, што невінаватыя.

## ТВОЙ

Пацалунак твой так люблю,
што не дам дакранучча нікому.
Сейф вялікі й чорны куплю,
прывязу на «хуткай» дадому.

Ланцугамі яго злаўлю,
пасаджу ў цёмны куток...
Пацалунак твой так люблю,
што не дам на чужы раток.

* * *

Апошняе дрэва было на зямлі —
апошняе дрэва не зберaглі:
падарвалі чорнаю мінай,
задушылі гумавай шынай,
павесілі на правадочках,
расшкумацілі па шматочках.
І тады —
пачало каменне дыхаць не даваць,
пачалі асфальты вочы засцілаць,
дроцікі не далі жыцця нараджаць,
смерць прымусіла люд знікаць.

## Таццяна
## ЦВІРКА



*Нарадзілася ў 1967 г. у в. Рассветная, што ў Клецкім раёне. Скончыла Нясвіжскае педвучылішча, філфак БДУ (1994). Жыве ў в. Даматканавічы, працуе настаўніцай.*

*Друкавала ў часопісе «Першацвет» вершы, прозу, артыкулы й рэцэнзіі.*

* * *

Дрэва корань пускае
глыбока-глыбока.
Вецер лісце шугае
далёка-далёка.
Снег сабой наталяе
зямлю напрадвесні.
Сэрца песню шукае —
сапраўдную песню!

* * *

У дождж начны, пад мітусню маланак
ты прыадчыніш дзверы ў мой пакой...
Заходзь, праходзь смялей, прысядзь, каханы,
пабудзь са мной.

У дождж начны, пад мітусню маланак
ты раскажы пра ростань і тугу —
адкрыйся мне, даверсе мне, каханы,
я зразумець змагу.

У дождж начны, пад мітусню маланак
(стыхіі перашкодай нам не быць)
умовімся паглядамі, каханы,
аддана век любіць.

* * *

Знаёмствы. Размовы. Сустрэчы.
Той першы, прыцішаны вечар.
Той першы наш мёд-пацалунак...
Душы закранутыя струны.
Абдымкі. Пяшчота. Прызнанні.
Ад вечара і да світання.
І кветкі, што зорнай купальскаю ночкай
спляліся ў адзін незабыўны вяночак.

Імгненні. Хвіліны. Гады.
І першых разладаў ліхія сляды.
Работа. І сум. Успаміны.
Пяшчота і ласка — дачушцы й сыну.
А тыя сустрэчы й мёд-пацалунак
жывуць толькі ў снах ды затоеных думках.

## ТРЫЯЛЕТ

Ты рассмяшыў мяне да слёз
запозненым лістом прызнання
і разважаннем аб каханні.
Ты рассмяшыў мяне да слёз.
Ты — нібы грэшнік у выгнанні:
такі табе ўжо выпаў лёс...
Ты рассмяшыў мяне да слёз
запозненым лістом прызнання.

* * *

Я так баялася гэтай сустрэчы.
Я думала: яна ўспыхне маланкай з яснага неба
ці сцюжна агорне агромністай кропляй.
Я так баялася гэтай сустрэчы.
І вось — ты стаіш.
Такі непадобны, худы, высокі.
Гады асірацілі цябе:
асыпаўся, як лістападаўскі клён, твой чуб;
змяніў ты на бліскучы метал
сваю белазубую ўсмешку;
адкладаліся тонкімі штрыхамі па тваім твары
пражытыя дні...
Я так баялася гэтай сустрэчы.
І вось — ты стаіш.
Знаёмы й чужы,
жаданы й непрыемны,
каханы й забыты...

Але — куды ты?
Няўжо не заўважыў мяне
на гэтым мітуслівым пероне?
Няўжо не рашыўся падысці?..
Скуль мне здагадацца, што бязлітасныя гады
змянілі й мяне да непазнавальнасці.

* * *

Паглядзі на мой заручальны пярсцёнак —
памятаеш:
на ім знава́ мігцелі наразныя палоскі, фігуркі?
Але колькі яму давялося паспытаць —
гатаваў абед і мыў бялізну,
калыхаў дзяцей і шыў фіранкі,
палоў агарод і сушыў сена,
пісаў вершы й галубіў тваю галаву...
Паглядзі на мой заручальны пярсцёнак —
бачыш:
амаль незаўважнымі сталі тыя палоскі, фігуркі.
Але разам з імі сцерліся
і нашы непаразуменні, крыўды й сваркі.
Паглядзі на мой заручальны пярсцёнак —
ён блішчыць
яшчэ больш, чым знава.
Бо ў маё каханне да цябе
ўлілася шчырая любоў дачкі й сына.
Беражы гэты дар!

## ПАРАДОКС

Кажуць, зімою каханне халоднае.
Кажуць, зімою спатканні нямодныя.
Кажуць, зімою пачуцці няшчырыя.
Кажуць, душа недзе лётае ў выраі.

Чуткам такім мы з табой не паверылі.
Мы на сабе іх узімку праверылі.

Божа, якое каханне кіпучае.
Божа, якія спатканні гаючыя.
Божа, пачуцці як песцяцца, ладзяцца...
Ну, а душа — і дапраўды, крылаціцца!

* * *

Яна ведае шмат:
як песні распроствалі крылы на ўвесь пакой,
як слёзы білі па твары гарачым градам,
як рукі шукалі прытулку на мілым целе,
як сшытак глытаў дробныя семкі-літары...
Яна ведае шмат
аб добрым, крыўдным, балючым, пераўжытым...
Хто яшчэ ведае больш,
чым мая аднавокая, пільная
сяброўка-лямпа?

## Алена
## ЦВІРКО



*Нарадзілася ў 1976 г. у Асіповічах. Скончыла Баранавіцкі педагагічны каледж. Жыве і працуе ў Баранавічах.*

*Друкавалася ў часопісах «Бярозка», «Першацвет», у штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва».*

* * *

Прыйшла вясна,
а я чагось шукаю...

Самотным, сумным ценем я блукаю —
шукаю бель, скрып снега пад сабою:
хачу адчуць сябе Зімы дачкою.
Але знаходжу чорны лес і дрэвы,
і талую зямлю з травой ссівелай...

Я недзе белыя згубіла сны...
Зіма памёрла.
Што ж мне да вясны?

* * *

Мне надакучыла чакаць тваіх рук.
Мне надакучыла чакаць тваіх вуснаў.
Я зняверылася ў чаканні...

І пайду — насустрач рукам.
І пайду — насустрач вуснам.
І пайду насустрач...

Іду да цябе — праз неба.
Іду да цябе — праз глебу.
Іду да цябе...

Мае вочы шукаюць цябе.
Маё сэрца шукае цябе...
Я знайшла цябе — у сабе.

## ТАБЕ

Тая вуліца, дзе ты жывеш... Тая хата...
Я хачу прыйсці да цябе.
Сонца ў небе ці хмары — усё роўна.
Людзі ёсць ці няма іх — усё роўна.
Мне не трэба нішто, бо ў мяне ёсць ты.

Гляну за небакрай — бачу цябе.
Вочы заплюшчу — ты побач, са мной.
Не пакідае і ў сне воблік твой...
Мне не трэба нішто, бо ў мяне ёсць ты —
маё шчасце, мой сум, мой лёс.

## Ганна
## ЦІХАНАВА



*Нарадзілася ў 1977 г. у Мінску. Скончыла Рэспубліканскую школу-каледж мастацтваў. Вучыцца ў Беларускай Акадэміі мастацтваў (аддзяленне графікі).*

*Друкавалася ў часопісах «Крыніца», «Маладосць». Аўтар паэтычнага зборніка «Навобмацак» («Першацвет», 1996, № 6).*

* * *

Лес, шлях, лёс...
Сплятаюцца розныя словы.

Да нейкіх высокіх нябёс
імкнецца пакутнік новы.

Хваля, хвіліна, змрок —
усё ў адзіным імгненні,
быццам Ікара папрок,
блішчыць у вадзе зіхаценне.

Пярун, Бог стары, цішыня.
Сплятаюцца розныя словы.
Да сініх нябёс з небыцця
імкнецца пакутнік новы.

* * *

Кожны існы нясе свой крыж:
хто — маленькі, а хто — вялікі.
Кожны цягне сваё паміж
нескачоных натоўпаў бязлікіх.

Цені постацей за абразамі,
зыркіх свечак прыемны пах.
«Будзеш з намі ты, будзеш з намі», —
голас прашчураў у вушах.

У задушлівым калідоры,
што без лямпаў і без акон,
у паўночным нібыта моры
апануе халодны сон:

«Адраклася ты, адарвалася —
ад пяшчотных, прыемных слоў.
У мінулым ты Ганнаю звалася,
а ці возьмеш імя тое зноў.

Не такая, ты ўжо не такая,
што ў вясёлым дзяцінстве была.
Нібы ў сэрцы абраза якая,
нібы кветка твая адцвіла...»

Так няпэўна гляджуся ў люстры,
баючыся прароцтвы спазнаць.
Крыж адзіны для думак і вуснаў,
адна мара ўва ўсіх — лятаць.

* * *

Будзь снаведам —
і буду я сном.
Птушкаловам будзь —
стану я птушкай.
Чарай будзеш,
а я ў ёй — він.ом.
Мне любую
прыдумай мянушку.
Адшукайся адно
між людзей,
каб ужо не губляцца
нам потым...
А пасля —
усміхайся з падзей,
што ўратуюць
ад адзіноты.

* * *

Мы кола часу носім на руцэ,
пясчынкі жоўтыя праз пальцы прапускаем,
не бачым слёзы на чужой шчацэ,
мы маем шмат — нічога мы не маем.

І вечнасці вялікі цыферблат
шукаем мы на дыску пана-сонца.
І мацярок, і іх сыноў-салдат
і родзім, і хаваем мы бясконца.

* * *

Стварь мой твар,
як твор, — старанна.
Зрабі натхнёна, апантана —
не як халтуршчык ці махляр...
Каханнем апалі мой твар.

* * *

Я — веер, што не мае сілы разгарнуцца,
хавае роспіс свой пад складкамі тканіны.
Ад зроку думкі ўсе ўхіляюцца, даніну
нясуць прыгожай лініяй танюткай.
Хочацца раптам сутнасцю памкнуцца
кудысь, дзе дрэвы ўсе з ультрамарыну.
Ці дапаможа гэты колер пасмялець?
Бо я — як веер, што не ўмее разгарнуцца.

* * *

Фарбы ў ложку, на падлозе,
і па столі ходзяць фарбы,
а калі яны ў дарозе —
лес смяецца хлопцам гарным.
Павуцінне з літаграфій
вабіць лініяй натхнення,
пад трыногай рушыць гравій —
гэты гук мне, бы збаўленне
ад цяжкіх жыццёвых рэчаў,
ад гамонкі шэрых люстраў.
З фарбамі гуляць у спрэчкі —
лепшае для майго густу.

* * *

Какетства ў мастацтве —
яшчэ не эстэцтва,

як шчырасць каханнем
не ўсюды завецца.
Рахіт і танклявасць —
не роўныя рэчы.
Агульная млявасць —
настрой не для спрэчак.
Для кожнай асобы
бяздумнасць — не рыса.
Карункаў аздоба —
не толькі капрызы.
Вялізныя горы —
заўсёды з падножжам.
Шлях Млечны
рамантыку — не бездарожжа.
Калі ўжо злучыўся
з натоўпам паэтаў,
павінен змяніцца
твой густ на эстэцкі.
Сабою, канешне ж,
патрэбна застацца.
Яшчэ не эстэцтва —
какецтва ў мастацтве.

## ВОЧЫ

Тыя вочы нябачнага колеру,
бо глядзяць яны адусюль:
са сталі, з агаркаў стомленых,
з усмешак ганебных красунь,

з прысціхлых і злучаных знічак,
куляюцца ў чарках з віном,
прыходзяць з агню запальнічкі.
І ноч сцерагуць пад акном.

Пярсцёнкам з рукі падміргне
нябачны прывід відавочна.

З вачыма знаёма завочна.
Ды ведаюць добра мяне.

* * *

О, калі б думкі адлюстроўваліся ў акулярах,
выходзячы з вачэй і павялічваючыся праз шкельцы,
колькі б чытала я аб самых розных марах!
Вочы ж не ў кожнага паразмаўляць умеюць.

# Ніна
# ЧАРНЕЙКА



*Саулава Ніна Іванаўна (1966-2000) нарадзілася ў в. Перавалока, што ў Рэчыцкім раёне на Гомельшчыне. Скончыла Перавалокскую СШ і Мінскае медыцынскае вучылішча № 2 (1986), працавала медсястрой у 6-й Мінскай клінічнай бальніцы (аддзяленне нованароджаных). Маці дваіх дзяцей.*

*Друкавалася ў «Першацвеце», «Маладосці», у штотыднёвіку ЛіМ. У Бібліятэчцы часопіса «Маладосць» выйшаў зборнік паэзіі «Грамнічная свечка» (1999).*

## МАЁ СЭРЦА

Калі маё сэрца,
даведзенае да адчаю і болю,
гатова расплакацца,
як малое дзіцятка,
я нясу яго
да штучнага возера,
што побач:
няхай яно,
вольнае,
пабегае побач з ветрыкам.
пакорпаецца ў прыбярэжным пясочку,
пералічыць усе лісточкі на асіне,
паспявае разам з птушкамі,
сагрэе кожную сваю крывінку на сонцы.
...І калі,
знясіленае,
упадзе на зялёную травінку,
нібы кропельку расы,
каб не расплёскаць на далоні,
пяшчотна і асцярожна
я аднясу яго дахаты.

* * *

Попел ад кастрышча не запаліш,
боль, што адбалеў, не забаліць.
Дык чаму ж блакіт вачэй так раніць —
сушыць вусны, быццам хоча піць?

Тое, што згарэла, доўга тлее,
боль з вачэй адчаем упадзе.
Пройдзе час, і подых белай веі
ахалодзіць пыл маіх надзей.

# ХВАРОБА АД НЯВЫКАЗАНАГА

У дзяцінстве,
калі я не бачыла перад сабою дарогі,
урачы, хвалюючыся за маё здароўе,
забаранілі мне пісаць.
...Ішлі гады,
і пачало збівацца з рытму сэрца.
Спачатку мне было цяжка бегаць,
яно задыхалася, калі я падымалася на паверх.
І вось, калі я ўжо не магла
падысці да маці,
якая, абапіраючыся на мыліцы,
сумна глядзела на мяне,
у яе вачах быў адказ,
які я шукала ўсё жыццё:
«Твая бяда ад нявыказанага!»

І з таго часу
я кожны дзень размаўляю
з паперай,
выказваю ёй свае думкі і мары,
крыўды і радасці.
І заўважаю:
хваробы паступова знікаюць,
а сэрца ажывае,
нібы спалены лес
ад подыху часу.

* * *

Зімнім вечарам
вокны дамоў,
асветленыя і запацелыя,
ператвараюцца
ў вялізных светлячкоў
і грэюць зрок
жывым святлом
свайго цела.

## ГРАМНІЧНАЯ СВЕЧКА

Нават летам,
калі — сонца і спёка,
мне бывае так холадна,
што, здаецца, кожная клетачка
прымерзла
да чагосьці невыносна-ледзяногa.
Я спрабую сагрэцца
цудоўнай музыкай,
добрым вершам
ці светлым успамінам.
Але не саграваюся.
І тады
я запальваю сваю
грамнічную свечку,
якая сагравае кожную клетачку,
больш жвава гоніць маю кроў,
кожны дзень уліваючы ў мяне
святую любоў
да зямлі.

* * *

*Светлай памяці мужа, які*
*трагічна загінуў 19 верасня 1997 г.*

А жыццё — павуцінка тонкая,
невядома, калі абарвецца.
У гэтым свеце зялёна-рамонкавым
застаецца працяг — нашы дзеці.

Адышоў так раптоўна і рана,
не паспеў развітацца ты...
Крываточаць балючаю ранай
нашых дзетак малыя сляды.

* * *

Зямное жыццё —
выпрабаванне.
Як часта выкрэсліваю
тэлефоны,
што не вытрымалі
цеплыню людскіх пачуццяў
і веры ў любоў.

**Ірына**
# ЧАЧОТКА



*Нарадзілася ў 1980 г. у г.п. Карэлічы на Гродзеншчыне. Скончыла СШ №1 (1998) і паступіла на філфак БДУ (аддзяленне славянскіх моў і літаратур). Сябра творчай суполкі «Літаратар».*

## ЖЫЦЦЁ

Віруй, жыццё! Бурлі, жыццё!
Крыніцай бі, будзь завірухай!
Не дай зламацца мне, жыццё,
у гэтым несупынным руху.

Спявай, жыццё! Вядзі, жыццё,
мяне па сцежках невядомых...
Дзе б ні знайшла я забыццё —
вяртай заўжды дадому.

* * *

Я прыйду да цябе, мой любы,
летнім ранкам ці зімняй ноччу...
Можа, слодыччу, можа, згубай
стануць вусны твае, твае вочы.

Той сустрэчы хвілін не забуду,
што саткана са слоў прызнання.
І заўсёды я трызніць буду
нашым чыстым, святым каханнем.

**Міхась**
# ШАПІЛЕНКА



*Нарадзіўся ў 1968 г. на Каўказе. Скончыў Бабруйскае мастацкае вучылішча і Віцебскі педагагічны інстытут. Жыве і працуе ў мястэчку Мір. Малюе, займаецца лепкай і разьбой па дрэве. Піша вершы.*

* * *

Самотная сцюжа ложка.
Свет месяца золатам бляклым

цячэ па белых фіранках
доўгай зімовай ночы.

Слізгоча па змроку позірк
радкамі шурпатых літар.
Бразгоча стары халадзільнік
доўгай зімовай ночы.

За вокнамі дыхае ціша.
Алоўка надломлены стрыжань
спыніўся на аркушы змятым
доўгай зімовай ночы.

* * *

Ледзьве лісцё пры дарозе трымае
сонцам стамлёнае вецце.
Жнівеньскі вецер у неба ўздымае
шэрыя выраі смецця.

Хутка сівым павуціннем завіснуць
восені бляклай дажджы.
Фарбы ў халодных туманах раскіснуць
на чорна-белай мяжы.

Марны пясок, што з рукі выцякае,
прагна зглыне забыццё.
Я пры дарозе стаю. Назіраю,
як адыходзіць жыццё.

* * *

У слоіку з апенькамі —
водар лясоў.
Час закручаны
спружынай гадзінніка.
У жылах кружэлкі —
апошняя песня.

Памяць —
гэта бляшанка без дна:
без-дань.
Бездань сусвету —
у кожнай пясчынцы.
Сонечны зайчык
смяецца ў слязінцы.
У сэрцы —
бяскрайняе мора любові.
У моры без берагоў —
слёзы мае.

* * *

Дзірка ў небе — свету вока —
за маёй маркотай крочыць,
з-пад пустэчы сумна сочыць
неадчэпна адзінока.
Аднабока абмінае
агароджы, твары, дахі,
дрэваў сплошчаныя гмахі
дзённым рэхам асвятляе.
Зноў і зноў туды вяртае,
дзе кахання вір распусны
пераблытаў рукі, вусны,
дзе расстання вечар тае...
Дзірка ў небе — свету вока —
у галінках марна б'ецца.
Час спыніўся, падаецца.
Дзесьці ўвечары, далёка...

* * *

Час,
што хваляй прабег па ўзбярэжжы,
сцёр апаркі паветраны замак.
І пануе пустэча

ў блакітнага неба бязмежжы
дзеля нас...
Нас,
з прасторай уласнай для мары,
для гульні й для новай будовы,
хвалі часу хаваюць
у бездані чорнае хмары
дзеля дойлідаў новых.

## ВЕРАСЕНЬ

Прахалодай ранку леглі туманы.
Парасон ратуе ад нябёс маны.
Непрыкметна красак аджухае звон.
Адыходзіць лета ў забыццё, як сон.
Прыкрасцю ў паветры — тонкі пах нуды.
Выспы жоўтай лісце ў шэрасці вады.
Заняпалы шолах — у адлёце дзён.
Яблыкам духмяным — вераснёвы плён.

## Кацярына
## ЯРАШЭВІЧ



*Нарадзілася ў 1982 г. у Паставах. Вучыцца ў Мінску ў адным з эканамічных каледжаў.*

*Удзхельнічала ў семінары маладых літаратараў «Іслач-2000».*

* * *

У пошуках
запаветнай белае плямы
разносім бруд атраманту
па аркушах.

У пошуках
новае афарбоўкі
апускаем рыфму
да ўзроўню быту.
Старанна вывучаючы
вокладку чарговага цытатніка
з партрэтам зацёртае да банальнасці
думкі.

* * *

Я — сонца,
прыбітае сваімі ж блікамі
да сцяны.
Я — мінулае сваёй смерці
і будучыня ўласнага нараджэння.
Я збіраю промні снегу.
І сэрца маё —
планета ўжо іншай Галактыкі.

* * *

Адчуваючы моц
ад улады
над лёсамі цывілізацый,
месяц крочыць
упэўнена
хісткаю стужкай арбіты.
Непрытоены страх —
вось пачатак
хрышчэння пагардай
і патрэсканы ідал
з малюнкаў
сучаснага быту.
Жоўтым дыскам,
што сочыць за думкамі
моцнага духам,

абазначана недасягальнасць
і жаданне
прадказваць дарогу.

Востры позірк —
і месячык здзіўлена
мацае дзірку за вухам.
Яго можна павесіць на шыю
замест абярога.

* * *

У кожнай атруце —
свая асалода.
Нябачна-празрыстая,
нібы паветра.
І варта было мне
прыйсці чалавекам,
каб звацца не больш,
чым разумнай істотай.
Калі пахіснуцца
ад болю законы
і думка парвецца
ў бясконцай цытаце,
я ўсё зразумею
і стану чарговым
прыпынкам для кола
хімічных рэакцый.
І буду ў кампаніі
зорнага хламу
піць слёзнай вясны
небяспечную вадкасць,
калі мае сны
ў прадчуванні фіналу
змяшаюцца з таннаю
фарбай рэкламы.

* * *

Аднойчы на золку,
калі апошняя зорка,
упэўненая ў тым,
што яе ніхто не бачыць,
пачне змываць з твару
дзяжурны слой касметыкі,
раптам знікнуць
цыгарэтны дым
і пах пракіслага піва;
таропкімі крокамі
пратупае каля ног
ледзь чутны адгалосак
стогнаў парванае струны
і санлівая ўсмешка
кагосьці з будзённых сяброў
ужо не знойдзе падтрымкі
на твары ліслівага люстэрка.
Дык вось, аднойчы на золку
са мной застануцца толькі сны,
што не маюць нават
дурное звычкі збывацца.
Што мяне ніхто не бачыць,
пачну змываць з твару
дзяжурны слой касметыкі.

*Літаратурна-мастацкае выданне*

# Анталогія маладога верша

Укладальнік *А. Масарэнка*
Прадмова *Н. Гальпяровіч*